# Міра Лукша

# Бабскія гісторыі





Фота: **Ігар Войніч**

Міра
ЛУКША

# Бабскія гісторыі

БЛА Беларускае літаратурнае аб'яднанне

Беласток 2001

**БІБЛІЯТЭЧКА**
Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа"

Серыя заснавана ў 1990

Кніжка трыццаць сёмая

© Copyright by Mira Łuksza, 2001
© Copyright by Białoruskie Stowarzyszenie Literackie „Białowieża", 2001

На вокладцы
**Валянціна Ляховіч** "Кампазіцыя з жаночай постаццю", 1997, (акварэль)

Publikacja ukazuje się dzięki pomocy finansowej Ministerstwa Kultury i Dziedzictwa Narodowego

Рэдактар
**Галіна Тычка**
Карэктар
**Ніна Грыцкевіч**
Тэхнічны рэдактар
**Павел Бельскі**

Skład i druk
Wydawnictwo PRYMAT
Białystok, ul. Św. Rocha 10/ 105

**ISBN 83-85918-30-2**

# 1. АД БОГА

## Добрая Маруся

Аўдавеў Андрэй зусім рана, у свае шэсцьдзесят. Ягоная Надзя добрая кабета, працавітая. Узяў яе быў з небагатай сям'і, з невялікім пасагам і невялікай красою, да таго ж старэйшую за сябе на пару гадоў. Людзі дзівіліся, але коратка; потым толькі зайздросцілі. Надзя была гаспадыняй на ўсю грамаду, нарадзіла Андрэю дзяцей пяцёра адно за адным, хлопцаў павывучыла, дачок добра замуж пааддавала. Шосты, наймалодшы, у позні век народжаны, Ясь, не вельмі ім удаўся, цяжка яму давалася навука, і астаўся на гаспадарцы. Дзякаваць Богу і за такое, а можа перш якраз за ўсё за тое, што астаўся памочнік дома... Але памёр Ясь. Шкада, непітушчы, спагадлівы, рабацяшчы быў хлопец. Ішоў з вясковага клуба цераз лес і штосьці з сэрцам яму зрабілася. Знайшоў яго раніцай сусед, што вёз у злеўню конаўкі з малаком. Яся на тры тыдні перажыла маці. Так вось Андрэй раптам застаўся адзін, якраз у капанне.

Прыехалі былі дапамагчы сыны з Беластока, дочкі з дзецьмі, хутка справіліся з гаспадаркай. Найлепш, казалі, прадаць гаспадарчыя будынкі, зямлю здаць "пад панства" за пенсію і ехаць ці да Геніка, ці да Ёзіка ў Беласток або і да дачок у Гайнаўку. Месца

ўсюды знойдзецца, да кожнае ж хаты бацька далажыў свой грош. Едзь, Андруша, казаў сусед Коля, калі ёсць, дзе жыць. Каб такія дзеці, як твае, нам усім трапіліся! Чаго табе тут аднаму чыпець, чакаць, пакуль хто наведае!

Паехаў Андрэй пабыць у Беластоку, але вясною вярнуўся. Дыхаць там цяжка, уздыхаў, а тут у нас пад пушчай ано жыві!

"Здаў" зямлю Андрэй, хоць у тую вясну ўсё яшчэ засеяў. Восенню знайшлася гаспадыня — Маруся з суседняе гміны, пяцідзесяцігадовая ўдава, рэнтыстка. Паглядзелі суседзі, адобрылі: мілавідная, чыстая, людская, набожная. Здаецца, як свая, вядомая з даўніх гадоў. І карову прывяла сваю. Ажыў Андрэй — і хата блішчэла, і сам аж пасвятлеў. На сціплае вяселле прыехалі дзеці, добра ацанілі мачыху: "Добрэ, тато, што мае хто вамі заняцца. І цётцы Марусі весялей будзе. А калі што, то памятайце, яшчэ і мы ў вас ёсць", — сказалі маладыя і завуркаталі іхнія машыны на ўтравелым абшырным падворку.

Пражылі разам Андрэй і Маруся трынаццаць гадоў. Здаецца, усё у іх было добра. Ды раптам ваколіцу страсянула вестка: пакінула Маруся Андрэя! Прыехала грузавая машына, забрала крыху пажыткаў ("я ж тут за той час сваё нажыла!"), прыхапіла Маруся і ашчадную кніжку ды кудысьці паехала.

Шукаў яе і Андрэй, шукалі і ягоныя дзеці (адзін сын жа ж у паліцыі працуе), ды як камень у ваду канула. А праз тыдзень Андрэй апынуўся ў бальніцы. Нагу яму адняло ад таго перажывання, і ў сэрцы калола. Мусіць, уміраць будзе наш Андруша, меркавалі суседзі. Каб хоць жонка прыехала ў бальніцу. Чаго ж гэта на старасць глупствы рабіць?!

Маруся прыехала, але дахаты. Схапілі яе суседзі: "Ты што нарабіла! То ж Андрэй ужо пры канчыне!" — "А ці то з мае прычыны? Нервы мне адʼеў сваёю гнілою хваробай! Разводзіцца думала. Ну,

калі так, то ўжо пачакаю, Андрэю ж няшмат асталося...”

Пахавала Маруся Андрэя, прадала пляц з хатаю і садам пану з Беластока, што тут дачу сабе ставіць мае. Сплаціла Андрэевым дзецям іхнюю частку спадчыны і паехала. Кажуць, спачатку ў Бельгіі была, награбла грошай, а нядаўна замуж выйшла за кавалера, і то маладзейшага за яе на пятнаццаць гадоў, бяздзетнага, гаспадара на дваццаці гектарах.

Хваляць яе ў тамашняй ваколіцы за гаспадарлівасць і прылюднасць, а ейны Сяргей кажа, што, няйначай, ад Бога яму дасталася такая жонка.

## Не мела баба... дзеда

Пазнаёмілася Нюрка з Філіпам зусім неспадзявана. Каму на старасць шукаць знаёмстваў? Добра, калі ёсць да каго з радні прытуліцца — калі дзеці, унукі ёсць, дарам хлеб не ясі... Яно вядома, за ўсё жыццё ты ўжо досыць нарабіўся, і належыцца табе ўжо пенсія не толькі за верную службу на дзяржаўным ці ў полі, але і ад радзіны. Чалавек усё ж хоча далей быць патрэбным, хоць якую лыжку памыць, які куль звязаць ці ў агародзе летам пагартацца. Бо іначай усё на чалавеку заклякне, калі рук ды ног не ўжываеш, ды і розум не так працуе, калі каменем на канапе сядзіш, не абатрэшся з людзьмі...

Не наракала Нюрка на тое, што свае яе не хочуць, што, можа, непатрэбная, не. Хат сваіх, папраўдзе, мела аж шэсць: пры адным сыне ў вёсцы (вялікая, пакояў шэсць, кухня, і на падстрэшку шыкоўныя два пакоі, усё ў драўніне, акуратна, як у пушачцы, чысценька, лепш, чым у неаднной хаце ў горадзе, а ўсё ейны Валюсь сам парабіў, уласнымі рукамі, такі малайчына майстар Нюры ўдаўся!), пры другім — у

мястэчку, мураванка аднапавярховая, але з летняй кухняй, уся сям'я ў футрах ходзіць, бо Адась андатры гадуе, а яшчэ і кватэры ў дачок ёсць — у Ганны ў Гайнаўцы, у Марусі ў Беластоку, у Надзі ва Уроцлаве; усе хаты рыхтык маюць, усе павывучваліся, добрых чалавекаў маюць. І дзеткі ім усім добрыя паўдаваліся, са школамі, некаторыя пайшлі ўжо на сваё, адзін унучак у Швецыі. Бабе нічога не шкадуюць, усё запрашаюць, лісты шлюць, падарункі, усяго панавозяць, як едуць у госці. Каб так усім бабкам было добра, як Нюрцы! Цяпер-то і мала бывае ў сваёй хатачцы, праўда, старэнькай, але абшытай свежай, жоўтай шалёўкай, на новым падмурку, што пад садком, ужо на сынавай гаспадарцы, стаіць. Бывала, Нюрка возьме пенсію, купіць што трэба да хаты, пасядзіць крыху, і ў дарогу, калі здароўе дазваляе — то да сына, то да дачкі, то да ўнучкі, што якраз ёй праўнучка нарадзіла... У свае семдзесят два гады Нюрка добра яшчэ трымаецца — не затоўстая, але з поўненькім чыстым тварам, добра падстрыжаная (унучкі забаранілі рабіць бабулі завіўку, бо, казалі, састарае), апранутая з густам, хоць скромна, — бабулька, хоць вясковая, магла "сыйсці" за добра захаваную гараджанку, пенсіянерку-настаўніцу ці бібліятэкарку, бо і загаварыць да кожнага ўмее. Так вось пра яе сказаў у санаторыі ў Цехацінку адзін яе аднагодак. Дзядуля запрасіў яе нават пасля ў госці, паказаць дачцэ сваю новую сяброўку. Тады на пытанне тае ж, абсаджанай замызганай грамадкай патомства, калі старэчы возьмуць шлюб і дзе маюць намер жыць, бо ў гэтай хаце ім месца не будзе (кватэра, дарэчы, была ўласнасцю бацькі), тым больш для кацапкі, Нюрка з гонарам паправілася ў крэсле і сказала: "Мілая мая, не на твае маю прыходзіць, і нічога твайго мне не трэба, калі ў цябе ёсць свайго што-кольвек. Замуж у ніякім выпадку не збіраюся, а ў такую сям'ю трапіць — невялікае шчасце, бо, вядома,

з кім павядзешся, ад таго і набярэшся”. І пайшла сабе. Караль пабег за ёю, але нават на ліфце не дагнаў.

Нюрка знаёмілася з многімі. Мела талент натуральнага і простага кантакту з людзьмі. Адкрываліся перад ёю незнаёмыя людзі ў цягніку, на прыпынках, якраз у яе пыталі дарогу, парады. І сама заўважала, да каго трэба падысці з дапамогай, з добрым словам. Так было і цяпер. Прыбегла да яе даччына суседка, пані Кася. “Пані Аня, давайце, падыдзем да майго знаёмага. Мне крыху няёмка, але ж трэба чалавеу дапамагчы, хоць суцешыць добрым словам. Філіп у дэпрэсіі, толькі што вярнуўся з бальніцы, а ў хаце забіцца можна, такі непарадак. Няма дома гаспадыні, жонка доўга хварэла, пахаваў яе будзе год таму. Я сама не пайду, бо зараз плёткі будуць, што да яго ліпну, нам жа, удовым, абоім па шэсцьдзесят. Я з нябожчыцай добра жыла, і не хачу, каб перамывалі мае костачкі...” Сапраўды, хата была ў руіне. Філіп не прыбіраў там, бадай, ці не ад жончынай смерці. Праўду кажуць, што самотная старая жанчына лепш дасць сабе нейк рады. Ні Філіпава прыёмная дачка, ні дваццацігадовы ўнук, прапісаны ў гэтай хаце, як апякун (каб у будучыні атрымаць дзедаву кватэру) не заглянулі нават, каб шклянку вады падаць. Стась, дарэчы, не раз баляваў па-суседску. Дачка раз прыйшла, абяцала прыбраць, але “прыбрала” пляшку гарэлкі, матчын пярсцёнак і пяць мільёнаў, а калі бацька быў у бальніцы, вынесла матчына норкавае футра і мэблевую сценку. Суседзі гэта бачылі, ды ніхто слова не сказаў. І гэта найбольш прыбіла Філіпа. Усе яму спачувалі, бо добры быў чалавек, але ніхто не спяшаўся з дапамогай. Паявіліся толькі Кася з Нюркай, аб’ючаныя парашкамі, анучамі, шчоткамі, новымі шпалерамі, фарбай, пэндзлямі. Чысцілі хату тры тыдні — рамантавалі, клеілі, збівалі, мылі. Нюрка заўважыла: Кася, сапраўды, бадай, ці не збіраецца стаць тут за гаспадыню. Хата вялікая,

трохпакаёвая, цяпер аж блішчыць, ды і маладыя абое, свабодныя... Кася, відна, аж млее. Але на чацвёртым тыдні бухнуў Філіп на калені перад Нюркай з букетам ружаў, у яе папрасіў руку. Кася выйшла, у нервах ляснуўшы дзвярыма. Нюрка адбівалася: нашто ёй такое! Каб зноў яе "кацапкай" называлі!? Ды і нашто ёй такі малады муж? Так, здаецца, — дванаццаць гадоў! Што людзі скажуць? Ажыўлены Філіп, перапоўнены галантнасцю і новай надзеяй абсыпаў каханую кветкамі, выкватараваў унука, кінуў курыць цыгарэты (а смаліў жа трыццаць пяць гадоў!)... Думала, думала Нюрка, аж перакаалася, што можа і варта пачаць новае жыццё. Запісаліся на чаргу ў загс. Тыдзень да вяселля "маладая" перавезла ўсе свае манаткі да нарачонага. А за тры дні да шлюбу, каля поўначы завіталі да іх зяць з унукам. Нацягнуў Філіп халат на піжаму, выйшаў да гасцей, і тут хіснуўся: схапіў яго зяць за каўнер, кінуў на шафу ў пярэдняй:

— Ты што, стары пень, надумаў?! Чаго прывёў сюды гэту старую кацапскую к...? Пажывеш месяцы тры, і яна тваю хату забярэ! Нашу хату! Якім правам ты *вымэльдаваў* Стася?!

А ўнучак бойка шарпануў Нюрку за плячо:

— Што, стрыжаная кацапская б...?! Мяне выгнала з хаты? Стаяць абое над магілай, і амураў ім захацелася! Што, рамонт зрабіла? Заплачу табе за яго, але да суботы тут мае твайго духу не быць! А то касцей не пазбіраеш! Бач яе, *паляцела* на маю хату!

Хацела Нюрка неяк супакоіць раз'юшаных сваякоў, прасіла, маліла, каб пусцілі старога...

— Ага, будзеце вы мець шлюб! — учапіўся ў яе валасы Філіпаў зяць. — Не дажывеш, стары пень, таго дня! Марш у сваю вёху!

Суседзі не прыбеглі. Яны заўсёды добра ведаюць: ніколі не суньце носа ў чужыя сямейныя справы.

— Што, думаеш, хтосьці прыбяжыць? Не крычы, не заві, — рагатаў Стась. — І ніхто ведаць не будзе, як

мы тут з вамі справу аформім!

— Не, сведак ёсць, — паказала Нюрка на магнітафон, сёння прынесены з рамонту, што поруч стаяў на паліцы. — Тут усё запісана!

Няпрошаныя госці зніклі хутчэй, чым прыйшлі.

На сціплым вясельным прыёме, які ўдалося падрыхтаваць Філіпу і Нюрцы, не было нікога з радні маладога. Так і жывуць паціху цяпер абое ўжо пару месяцаў. А вось тыдзень таму хтосьці іх кватэру на першым паверсе абкідаў каменнем і грудамі гліны. Невядома, хто гэта быў, бо зламысніка не злавілі.

## Вазьмі знайдзі ты тое шчасце

Колькі мне будзе год? Васьмідзесяты ўжо пайшоў! Я і не думала, што столькі нажывуся! А тут яшчэ жыць далей трэба. Дзяцей уласных у мяне было толькі трое, двое ў жывых засталося, бо дзяўчынка, што перад Стасікам была, у пяць месяцаў памерла. Маруська ў Беластоку замужам, Стасік во з намі на гаспадарцы. І ягоных, майго чалавека, дзяцей было сваіх сямёра, я на іх прыйшла, хоць страшнавата было. Самы старшы — Ясько; ён хварэе, і яго жонка нядужая, другі — Жоржык, а Коля ўзяў сабе жонку з Піша, то што яна — глядзіць толькі сама сябе, каб смачна і мякка, пра мужа не дбае... Зінка дачку ў палякі замуж аддала, і сына, ну, якась там жывуць... Зінчына сынавая вось нядаўна да нас прыязджала, кажа: “Бабулю, я на вёскэ в жыцю не пуйдэ, едно ноц пшэноцоваць і то ценшко”... Усе Максімавы дзеці — як мае, усе дзевяцёра ж я выхоўвала. Усе разляцеліся па свеце, апрача Стасіка. Не мае ён добрага лёсу, Бог мусіць не даў. Чаму не, ажаніўся і ён быў. Якраз *стан ваенны* быў. Толькі з арміі прыйшоў, яны там у

войску страшэнна ўсё перажывалі, нервы страцілі. А наша дзеўка, з суседняе вёскі, з Каўпакоў, пяць гадоў за яго старэйшая, за яго ўчапілася. Казала я Стасіку, угаворвала: "Не бяры яе. То ж і старэйшая за цябе, ты ж пры ёй дзяцюк, і без бацькі гадаваная, распушчаная!" Ну, што ж, узяў. Год пабыла ў нас, усё добра. Не пасварыліся мы з ёю ні разу, нічагусенька, усё добра, усё *харашэ*. А пасля штосьці такое ёй стрэльнула, пацягнулася лепшага шчасця шукаць. Прыйшоў раз увечары Стасік і кажа: "Чаму вы, мамо, самі прыбіраеце, дзе ж Крыська? Пайду на будову, пагляджу". Пайшоў шукаць жонку, я сама ўсё парабіла, а шмат было працы, як то на гаспадарцы: дзве каровы, конь, двое жарабят... Чакаем, чакаем, аж бацька выйшаў за імі. Урэшце, прыплялася Крыська. Дзе ты была? Тая села і давай спяваць. Нічога не гаворыць, сядзіць, глядзіць як той слуп ды пяе. Не слухае, што Стасік кажа: "Так? То ты думаеш мне о так усё рабіць?! Хто так бачыў!" Меў раніцай выязджаць у нядзелю па справах, то не вытрымаў, паехаў у суботу. Казала я ім: "Можа, паладзіцеся, усё будзе добра." Але не, паехаў, не паміраўся. А Крыська давай цягацца, ано сябры, п'янкі, забавы, Павыцягала ўсё, што я ім дала, да бацькоў у свае Каўпакі. Знайшла сабе новага кавалера, у нас жа жанчын мала, кожна знойдзе сабе аматара, хоць найгоршая, а з ёю асабліва хлопцам лёгка прыходзілася. Стасік не мог на яе глядзець, развёўся.

Зышоўся з іншаю, разведзенаю, дзеўчынку сваю мела маленькую. Сама маладая, выскачыла была ў семнаццаць гадоў замуж, цераз суд. А якая ж недарэка! Стасік прыйдзе з працы, мусіць наварыць, накарміць дзяцей (нарадзіўся ім хлопчык), усё памыць. Казала я яму: "Не бяры бабу з дзіцём! Я сама прыйшла на такую грамадку, у свае 35 гадоў, то ведаю, як цяжка гадаваць чужых дзяцей, дагадзіць кожнаму, быць за матку і сваім, і чужым. І мне самой

цяжка будзе, трэба ж будзе вам дапамагаць! А гэта твая мэмла símbolo нават пасцелі не памые, пральку не ўмее ўключыць!? І такая дзіўная: прыйдзе, сядзе, адчыніць поўны халадзільнік, паглядзіць. Сядзіць, потым возьме чыкаляду, з'есць яе, пап'е вадою, кажа, ужо пад'ела. А дзіця бегае, просіць: "Мамо, дай, мамо, дай!" А то ж не дасць, сама ўсю плітку ўвапрэ, абліжацца. Я не магу глядзець на гэта, ці то будзе яе Анечка, ці мой унучак: як так можна з дзіцём! Аж слёзы мне з вачэй плывуць, так мне малога шкада. Мы, старыя, нічога ёй не шкадуем, памагаем, даем усё-ўсянюсенька — наце вам дыван, наце вам мэблю, наце вам ласункі, наце вам усё, дзеткі. А яна, разумееш, усё тое, што дамо, вынясе ў рэчку выкіне! І кумпяк, і спадніцу, і дзе што! Ну, як ненармальная якая! Прыйшоў раз да мяне Стасік і кажа: "Мамо, мая Лілька хоча сабе добры кажух купіць. Маёй зарплаты не хопіць, пазычце". Далі. Дастаў Стасік выплату, паехала Лілька з маткай спачатку ў Гайнаўку, але кажухі не спадабаліся. Заехалі і ў Ворлю. І ў Бельску добрага кажуха не знайшлі. А дзе грошы? На што магла іх столькі выдаць? На гэту блузачку? Узяў Стасік не вытрываў, парваў тую шматку: "Калі ты такая, Лілька, то пайшла ты прэч!"

Ды дзіцяці шкада. Што ты зробіш. І так малы ўжо тры гады як не з намі, а ўжо шосты яму пайшоў. Такое малое звітнае, файнае, харошанькае. Памятаю, глядзіць у акно: "Бабуленька, глядзі, наш дзядулек ідзе"... Гэта тады, як Максім яшчэ мог хадзіць, па падворку ўпраўляўся. І ўсё следам малы за дзедам, пасабляе. А такі харошанькі, пацешны, кучаравенькі. Усе мы так яго любілі, ды і яго сястрычку, Лільчыну дачку, ніколі ў нічым не абміналі, дбалі, як пра сваё, давалі абодвум ўсяго пароўну. Але як жа вытрымаць з такою маткай, якая нават за сабою нічога не зробіць! Прыйшла да мяне Лільчына маці, раскрычалася: "Чыя гэта віна, што разводзяцца? Напэўна, яго, яна ж

маладая і дурная, то павінен яе жыць навучыць, запанаваць над ёю, а не адразу кідаць!” Ну, вазьмі ты жыві, нават быўшы анёлам, калі на кожным кроку з нерваў цябе выводзяць!

Стаў Стасік з таго ўсяго папіваць, але не можам на яго наракаць. Добры з яго сын. Пра бацьку так дбае, як дачка — а яго ж і памыць трэба, і перавярнуць. Я слабая, не дам рады. Усё ў нас у хаце Стасік прыбірае, гатуе, мые. Дзяўчына так не зробіць, як ён, спячы пірог умее нават. Стараецца. Калі б не ён, даўно мы абое былі б у магіле, а гаспадарка зарасла б крапівою. Толькі толку ў яго жыцці мала, я, старая бачу, як яму горка жыць. Што ж зробіш! Як мы стараліся дапамагаць, дагадзіць, і ўступалі, але гэта нічога не дало яму сямейнага шчасця. Такі лёс мусі ў яго быў, не? Дурны лёс. А які мой лёс быў? Я сюды прыйшла ў сталыя ўжо гады. Не было калі пайсці раней замуж, вайна, потым мама памерлі, трэба было бацьку дапамагаць. Ой, як цяжка было, бедаў столькі. Ды і ўсім не было салодка. Столькі гора я перажыла, што не выкажаш! Лягу цяпер, у першы сон крыху засну, потым прачнуся, і такі мяне жаль возьме, плач над маім жыццём. Нервы аж дрыжаць... Я тутака ўжо амаль 50 гадоў, а мне мой родны хутар сніцца...

Столькі тут пакінула, столькі дзяцей выхавала, а амаль адна засталася. Да Максіма ўжо бацюшка прыходзіў, ледзь стары дыхае, ды і што за жыццё... І Стасік чахне мне ў вачах. Што ж я зраблю, скажэце...

## Раман і Юля

— Што з табою, Раманчык, што так шапялявіш?

— Зубоў, Юлечка, нямашака, і паставіць няма за што...

— Ой, дурненькі такі... То ж прыязджай, што ж

зробіш...

Баба Юлька адкладае тэлефонную трубку на апарат сваёй сухой белай далонню. Папраўляе вузел хустачкі пад барадою, памаленьку падымаецца з рыпучага плеценага крэсла ў пярэдняй і з нахіленым станам, апіраючыся аб сцяну сунецца ў кухню.

Нядужая цяпер баба Юлька, прыхварэла. Паўгода таму ніхто ў такой хустачцы б яе не ўбачыў. На працы ў чэпчыку ходзіць. І валасы фарбавала хною, клала па дзве пачкі на сваю густую капіцу моцных, жорсткіх валасоў, і набіралі яны каштанавага колеру з медным адценнем. І фігура Юльчына толькі нядаўна страціла фасон, і бяссільна выглядае нядаўна горда трыманая галава з буйным вянком касы над лебядзінай гнуткай шыяй і высокімі грудзьмі ў белым халаце. Працуе бабка Юля трыццаць сёмы год медсястрой у бальніцы ў горадзе, які вырас у яе на вачах. Паўгода таму ў Юлі Кавальскай быў інсульт, і цяпер прыходзіцца ёй больш думаць і пра сваё здароўе.

З Раманам Кавальскім пазнаёмілася на забаве. Толькі што пачала працаваць у бальніцы, знаёмых у яе не было шмат. Малады, прыгожы высокі хлапец у вайсковай форме вельмі ж спадабаўся маладзенькай медсястры ў раскляшованай блакітнай сукенацчы. Юлька стаяла ў групцы вясёлых напаказ дзяўчат, зіркаючых на шыкоўных кавалераў, што прыехалі з акалічных вёсак на працу ці ў армію. З паненак было найбольш бойкіх дзяўчат, што працавалі на фабрыцы, яны першыя і кінуліся ў танцы. Юлька пагладжвала складкі сукенкі і сціпла заўсміхалася, паглядаючы на боты, калі да яе падышоў чарнявы юнак з вясёлымі вачыма. З кожным іншым барджэй пайшла б ёй размова, чым з гэтым, які ўмомант давёў ейнае сэрца да таго, што білася яно ў грудзях, як злоўленае ў далонь птушаня. Раман, бо так называўся прыгажун, канчаў ужо служыць у Х., збіраўся спачатку вярнуцца на бацькаўшчыну, у падкялецкую вёску, а пасля

зачапіцца недзе ва Усходняй Прусіі ці ў шахтах. У вёсцы, апрача бацькоў і камяністых палосак, чакала яго нейкая Марыля (аб гэтым данёс Юльцы Коля Захарэвіч, што служыў разам з Раманам), адзіная дачка павятовага багацея, і яе лісты ў блакітных канвертах штотыдзень чытаў усяму атраду шчаслівы адрасат. Марыля пісала вельмі ж прыгожа, як з нейкай кніжкі, і ваякі спісвалі ўсе гэтыя прыгоствы ў свае лісты, мяняючы толькі імёны і некаторыя факты. Напэўна, рабіла тая літаратура ўражанне на дзевак. З несхаванай зайздрасцю распытвала Юлька пра таямнічую Марылю ў хлопцаў. Бачылі яны, казалі, прыязджала яна з сяброўкай, тую другую з асалодай успамінае ўвесь батальён, а Марыля глядзела ў вочы яму аднаму — Раману. А калі кавалер загаварыў да Юлі, быццам нейкі верш пра каханне зачытаў, не сцярпела яна, і хоць сэрца сціснулася, запытала:

— Ты што, Раманчыку, Марыліным вершам мяне спакушаеш? Адной пра каханне гаворыш, і другую зводзіш? Гэта ж нельга так гуляць пачуццямі людзей, якія цябе кахаюць!

— Я ж нічым не гуляю! Я ж цябе па-сапраўднаму кахаю, навекі! Кожная на тваім месцы мне паверыла б ужо даўно! На калені перад табою падаю, глядзі!

— То ажэнішся?..

— Вядома, чаму ж нам не пабрацца! Давай паедзем да тваіх бацькоў, няхай рыхтуюць вяселле, колюць падсвінкаў...

Закалолі, вядома, не аднаго, і два бычкі пайшлі пад нож, і курэй пару тузінаў... Шлюб бралі толькі ў Грамадскай радзе. Белую атласавую сукенку пазычыла Юлька ў сяброўкі, тая яе ў Прусах ад нямкіні купіла. Добра ляжала слізкая тканіна на гарачым целе, не магла дачакацца Юлька першае свае жаночае ночы, як у тумане ўсё кружылася ёй перад вачыма. Тры дні гудзела вяселле, не сціхалі песні. Раман ніяк не мог дайсці сваёй цяжкай ад самагонкі

галавой, куды трапіў, адкуль тут, апрача “Шла дзевэчка да лясэчка”, “Сядла пшчулка на яблоні” і “Плынол струмык пшэз зялёны ляс”, якія прагучалі на пачатку балю, пайшлі нейкія “рускія” песні, пачынаючы ад “Бадзягі”, што старыя прывезлі з бежанства. Украінскія, рускія, беларускія, а словы кожнай з іх кожны госць пяяў на свой спосаб, на свой лад, бо назбіралася вясельнікаў з пяці вёсак, а ў кожнай з іх — свая гаворка. І пра няшчаснага Колю-трактарыста са слязамі на вачах спявалі людзі, бо таго Колю ведалі — нядаўна ж усё гэта было, і частушкі рубалі, што “за савета” ўвайшлі ў моду... А ад Рамана не прыехаў ніхто. Можа таму, што вяселле так хутка рашылі згуляць, ці можа лісты не дайшлі?..

Яшчэ гуло ў галовах вясельнікаў, лячылі яны свае балючыя чэрапы і перасохлыя гарлякі апошняй “горкай водкай”, як Раман з Юлькай, з чамаданамі ў руках, пашпарылі на чыгуначную станцыю — паехалі дамоў, у Х., на Юльчыну кватэру.

Жылі там тыдзень. Юльцы спагадлівы доктар выпісаў паперку на тыдзень хваробы. Не вылазіла яна, сапраўды, з пасцелі, нават паесці, бо шкапчык з ежай падсунулі да ложка. Калі трэба было маладой жонцы збірацца на працу, Раман пайшоў у краму купіць хлеб і запалкі.

Не вярнуўся. Праз два месяцы ў Х. прыйшоў ліст з Бяшчадаў. Там “зачапіўся” Раман Кавальскі, лесапільшчыкам. Зарабляе добра, пісаў, але патрэбен яму час усё перадумаць, уладзіць свае справы. Вядома, кахае ён моцна сваю дарагую жоначку, але, на жаль, пакуль не можа да яе вярнуцца ні тым больш забраць Юлю да сябе. Ашчасліўіць яе не ў змозе, а, несумненна, варта яна шчасця. Ну, калі так выходзіць, няхай яна тое шчасце шукае...

Не мела часу Юлька думаць над прачытаным. Цяжарнасць праходзіла ў яе вельмі непрыемна, цяжка, але да апошніх дзён прыйшлося хадзіць ёй на працу.

У пятніцу ноччу была на дзяжурстве ў бальніцы, а ў панядзелак раніцай, пасля адзінаццаці гадзін родаў, мела ўжо сына — тоўсценькага і здаровенькага. Назвала яго Волесем.

Тры гады Волесь сядзеў у вёсцы з бабуляй і дзедам. Калі Юлька, прыехаўшы, не пачула ад малога ніводнага слова па-польску, залямантвала: змарнуеце мне дзіця! Рашыла яго ратаваць, аформіла ў садок. Кватэру мела ўжо сваю, службовую. І толькі ў яе свайго было: праца і дом, і маленькі праменьчык — Волесік. І ўсё чакала лістоў ад Рамана. Не мог жа так яе кінуць, так прыгожа гаварыў пра каханне, і пісаў жа ж, што ніколі не забудзе... І сынок жа ў яго ёсць, як жа дзіцяці без бацькі гадавацца! Напісала да Раманавых бацькоў, паведаміла аб дзіцяці, так адрас напісала: паньству Кавальскім, вёска М., Кялецкае ваяводства. А паньства Кавальскія той ліст атрымалі і нават адказалі: не жонка ты касцельная нашаму сыну, а распусніца і спакусніца, а жонка ў яго з нашага боку, каталічка, Марыля з дому Завадскіх, і дачка ў яго маленькая... І ад Марылі таксама ліст прыйшоў, з размазанымі ад слёз фіялетавымі літарамі, і быццам тыя літары, тыя словы выводзіла не тая рука, быццам гэта не Марыля пісала, тая рамантычная паэтка, якой лістамі захапляліся нядаўна жаўнеры і іхнія дзяўчаты. Проста напісала Марыля Юлі: звычайны хам наш муж Раман, лодыр і прайдзісвет, хлуснік і хуліган. Гадуе ад яго Марыля дачушку, і добра, расце малое, і яшчэ лепш, што татку чэрці ў свет панеслі, хай яму сонца не свеціць, бо лепш такога бацьку дзіцяці не бачыць; дасць Бог, выгадуецца без яго, галоўнае, што не будзе пасмешышчам для іншых, касцельны ж бацька ёсць, законны ў малое Ганусі ён... А яны, мацяркі — маладыя, здаровыя, прыгожыя, сваё шчасце ад іх не ўцячэ...

Юлька не мела ні сілы, ні часу таго шчасця шукаць. За працай і клопатам і не заўважыла, як Волесь

кончыў пачатковую школу, пасля ліцэй. Ціхмяны быў хлопец, выдатны вучань, памочнік матулі ды бабе з дзедам у вёсцы. Пайшоў у палітэхнічны, працаваў у студэнцкім кааператыве, крыху гандлем займаўся, грош дахаты прыносіў.

Аднойчы прынёс каляровы пакуначак. Усхвалявана трымаў на руках невялікі вузялок, з якога вызіраў чырвоны тварык з кірпатым носікам. За Волесем стаяла спалоханая дзяўчына, лепш сказаць дзяўчынка, астрыжаная пад хлопца.

— Гэта мой сынок, мама. А гэта яго маці, Ася, мая аднакурсніца. Я яе кахаю, добрая з яе дзяўчына, і ты Асю будзеш любіць, я ведаю. Дапаможаш нам?..

Чатыры гады, пакуль не кончылі вучыцца бацькі, Роберт чакаў іх то ў бабы Юлі, то ў прадзедаў Ганны з Іванам. Гадаваўся. За ейнага сына бралі Юльчынага малога, за позняе дзіцятка. А пасля з'ехалі Волесь з Асяй за мяжу. Калі абжыліся ў Штатах, выпісалі туды і малога. Прыйшлося бабе Юлі адправіць за акіян пятнаццацігадовага ўнука, якому пад носам вус ужо сыпаўся, высокага, дужага — .на развітанне на лётнішчы падняў Роберт бабулю высока-высока, пацалаваў яе, а потым паляцеў далёка-далёка... Абяцаў лісты пісаць.

Асталася Юля адна. Не, не адна. Ёсць у яе хворыя, якімі апякуецца. Іхнія клопаты і болі — Юліныя. І не наракае яна, не плача, не скардзіцца, што ёй свайго гора хопіць, што ёй ад уласнае бяды цяжка, што чужая ноша ёй не па сіле і не вельмі патрэбная.

Аднойчы зазваніў у Юлінай хаце тэлефон. Стомленаю рукою падняла трубку.

— Юлечка, гэта я. Раман Кавальскі. Муж твой. Памятаеш мяне? Як там твае справы? Жывеш шчаслівая? У мяне... гэтага... зубоў нямашака...

— ... Прыязджай...

# Пад акупацыяй

Калі б не тая вайна, Ганс і Сонька не сустрэліся б. Калі б не вайна, Ганс не дастаў бы кулі ў лоб за каханне з дзяўчынай рабскае расы. Калі б не вайна, іначай выглядаў бы сённяшні свет.

Унучка Ганса і Сонькі разумее слова “мяжа” і “ўзброены канфлікт”, але жыве ўжо ў Еўропе, якая хоча аб’яднацца і, забыўшы ўсе крыўды, глядзець у будучыню, але для яе “вайна”, другая сусветная вайна — амаль пустое, абцёртае з усяго значэння, абрыдлае са школы слова. Але, можа, будзе пра тое ўсё пытаць яе ўнук, народжаны ў Швейцарыі, з бацькі, для якога родныя — тры мовы? Унучку Сонькі-беларускі і Ганса — шлёнскага немца, ад маленства вучылі размаўляць толькі па-польску ў Беластоцкім краі.

Нашы вёскі папалілі немцы ў 1941 годзе, усе тыя, што пад пушчай былі, — расказвае баба Ніна Барысёнак. — Немцы ў нас у зямлі знайшлі руду, рэзалі пушчу, пракладвалі вузкакалейку, чыгунку. Шмат хто з нас, маладых, каго не ўзялі ў Германію, мусіў ездзіць класці пуці, сыпаць насыпы і ўсё іншае, што загадалі. Я была кульгавая, майго брата павезлі ў Прусію, і каб не тое маё калецтва, і мяне, можа, узялі б на паняверку*, маці адна асталася б...

І Соньку таксама хацелі забраць, бо брат збег. Замуж Сонька пайшла ў жніўні трыццаць дзевятага, а як пайшоў ейны Міша на фронт, то ні слыху, ні дыху. Ездзіла з намі Сонька на чыгунку, маладзенькая такая, харошая, то зараз немцы пачалі яе зачапаць. Вядома, не агрызнешся, хоць тыя залёты табе пракудныя, яны ж тут — паны. А Сонька заўсёды такая ганарыстая была, і да замужжа недаткнёна, нікуды не хадзіла, па забавах мала гуляла. І раз сядзім мы на прычэпе,

---

* паняверка – poniewierka (поль.) пакуты

вязуць нас на чыгунку, а Сонька белая сядзіць, як папера, вочы падпухлыя, бы ўсю ноч плакала. Чаго, кажу, Сонька, баішся, што цябе хочуць на прыбіральшчыцу ў камендатуру?.. Нічога страшнага, пратрываеш, пакуль рускія не пагоняць іх адсюль... А дзе тут рускія, усё ўцякалі, але што ж, мы ўсе надзею мелі, верылі, што Расея вялікая, магутная, і Сталін — правадыр вучоны, разумны і хітры. А Сонька ў плач, кажа, зганьбуюць, далібог, гэтыя жывадзёры, а пасля што людзі скажуць, хоць ты ідзі ано вешайся... Сонька вельмі харошая была, не то, што я — малая, рабая, да таго і з нагой карацейшай. Высокая, стройная, ано ў кіно яе бяры. А вочы васільковыя, косы да пояса, жоўтыя, як спелы авёс. Ці ж не хацелі б мець такую немцы ў камендатуры, каб ім падлогі мыла ці што там яшчэ? Вядома, страшна Соньцы было.

— Чаго ты баішся? Там работа чыстая. Немцы народ акуратны. Папрыбіраеш...

— Якое там прыбіранне. Найстарэйшы адразу мяне за сцёгны хапаў. І ў рот заглядаў, што я, кабыла якая, ці што?!

— Чаго ты, Сонька, перажмаешся. Пратрымацца неяк трэба. Выжыць. З імі ніхто яшчэ не выйграў. Бачыла, якія ў іх самалёты, танкі, аўтаматы! Нікога яны не баяцца, нават Бога. Але калі рускія рушаць сюды... Бо ж Бог не дасць святую Расею заваяваць такому вар'яту. А ты ў жывых астанешся. І маці ўратуеш.

— Ды агідныя яны мне. Бацьку прыбілі, Міша ў чужой зямлі гніе, а мне лезці пад якога паганца?.. Што народ скажа?

— Махні ты рукою на "народ". Не адна захацела б ісці да чыстае работы. Маці што-небудзь прынясеш дахаты...

Не думайце пра мяне кепска, што я так яе намаўляла. Тады так было. Страшна. А жыць жа кожнаму хацелася. Выжыць. Асабліва нам, маладым.

Што тая вайна, смерць, голад — калі мы проста любіць хацелі, цешыцца, сем'і заводзіць, гаспадарыць... А тыя немцы здаваліся нам усе на адзін капыл, ці стары, ці малады, ці паліцэйскі, ці жаўнер, ано стаяць у вачах іх твары, бы ў лялек, і тая іх нянавісць да нас, і тая зброя, і агонь. Усе вёскі папалілі, а калі хто вярнуўся восенню хоць бульбіну ўзяць са свайго поля, то з таго поля і прапаў, як хоць бы Павел Семянюк з Міклашэва... Ненавідныя былі нам тыя нелюдзі.

— Сонька, — кажу, а мне ў сэрцы аж шчыміць, — так трэба. Ідзі.

Яна і пайшла. Не думаю, што хтосьці мог што кепскае сказаць на яе тэму. Здаецца, да пэўнага моманту і не згадвалі пра тое, што Сонька Максімянка працуе ў немцаў. Да тае пары...

Да тае пары, як стала сустракацца з Гансам. Ганс быў просты жаўнер, ранілі яго недзе на ўсходзе, везлі яго дадому, і пакінулі яго тут у нас. Патрэбны быў, пэўна, перакладчык, а Ганс са Шлёнска быў. Насіў свой зялёны мундзір, тым і вылучаўся сярод паліцаяў. Такі трохі дзіўны той Ганс быў, якісь бы не з іхніх. Глядзіш на яго і думаеш: як сюды трапіў такі харошы, ветлівы чалавек, чаго пайшоў на нас з вайною, з гвалтаўнікамі, рабаўнікамі, забойцамі, якія нас так ненавідзяць? Зусім як наш хлопец, русы, трошкі рабы на носе, нават трохі падобны на майго брата Якіма, што забілі яшчэ ў верасні... Усе пачалі ўголас пра іх гаварыць, як у Сонькі жывот быў ужо вялікі. Ад Мішы весткі няма, то адкуль у маладое жонкі такі трыбух? Тым больш, што нідзе не цягаецца... А сама бачыла Соньку з Гансам на ўзлеску, ноччу. За ручкі трымаліся, цалаваліся. Я наляцела на іх, бегла з суседняе вёскі. Сонька абняла мяне з плачам: "Ніначка, не кажы толькі нікому, бо нам смерць будзе. Ён такі добры, ён жа нявінны, што вайна..." — "Ніна, я кохаш Соня", — прабалбатаў Ганс, схапіў

маю руку і прытуліў сабе да сэрца. — “Не вечэч нік, не мувіш нік”. Я і нічога не сказала, вядома, а злякалася тады так, што два дні праляжала ў пасцелі.

Соньцы нічога не зрабілі, але Ганса расстралялі. Не за тое, што з нявольніцай меў справу. А за тое, што ім сказаў праўду, што кахаюць адзін аднаго. Божа, чаго ж трэба ім было яго забіваць! Паслалі б на фронт за такі грэх, ці што... Сонька сказала мне, што ўцякаць сабраліся, але куды ж ім можна было падацца? Кругом вайна, фашысты ва ўсёй Еўропе. Ой, які лёс страшны! Калі б не тая вайна, маглі б жыць тыя людзі як людзі... Калі лёс даў ім сустрэцца! Гэта ж як здзек над чалавечым сэрцам! Ну, але калі б не пайшлі немцы на нас з вайной, то ці спаткаліся б Сонька з Гансам...

Труну з забітым Гансам адправілі матцы ў Нямеччыну. Думаю, што не пісалі ёй, як сын загінуў, што ад, так сказаць, роднае кулі. Я так мяркую. Бо іначай, пэўна, закапалі б яго абы-дзе, як здрадніка.

Сонька нарадзіла дзяўчынку. У 1954 годзе вярнуўся Міша з Сібіры. Не чулі мы, каб сварыўся на Соньку за Анютку. Малая была запісана на яго прозвішча, татам яго называла. Мы таксама ўсе маўчалі. Але толькі глянеш на малечу — чыста той няшчасны шлёнскі Ганс — вочы блакітныя, русы чуб, і той трошкі рабенькі носік. І тая разгубленая ўсмешка.

Соньку прыдушыла сасна на лесапавале. Міша Анютку гадаваў адзін, у школы паслаў. Замуж выдаў за сваяка, даў пасаг. Тады зямля яшчэ вартасць мела, не тое, што цяпер... Нарадзілася яму ўнучка, Гражынка. Вельмі ж тое дзіцянё любіла дзеда. А Міша, як ні стараўся, неяк не мог перамагчыся. Кажу яму: “Міша, прытулі маленькую, ліпне да цябе Гражынка, больш чым да бацькоў”. І сапраўды, больш мела ад яго ласкі, чым ад бацькоў. Анюта з Колем выехалі ў горад, то на канікулы ўсё Гражынку ў вёску высылалі. Калі Гражына была ў ліцэі, то сама ўсё

ездзіла да дзеда, амаль штотыдзень. На студыях па свеце вандравала, то ўсё дзеду паштоўкі слала, а то і падарункі. Паказваў мне тыя каляровыя картачкі з замежных гарадоў і здымкі, гаварыў: "Ніна, і што мне рабіць... Які ж мой лёс нялюдскі... І бач, няродная кроў, фашысцкая цячэ ў гэтым дзіцяці. Але адна яна ў мяне, што мне на старасць радасць прыносіць. Хоча нават да нас у вёску прыехаць працаваць..."

Але не перасялілася Гражынка да нас, не. У Швейцарыі пазнаёмілася з нейкім ці то немцам, ці то французам, і там замуж выйшла, хлопчыка нарадзіла, здаецца, Норман называецца, ці Герман, неяк так. Пераназвалася на Грацыелю, бо цяжка было там ім вымаўляць яе імя. Можа, кроў яе да свайго пацягнула. Але мала то нашых па заграніцах шчасця шукае?..

## Марысенько, не ўмірай!

... бо ты мне адзіная асталася, — моліць сваю старэнькую сяброўку яшчэ старэйшы дзядуля, Адам Кавальскі з Беластока.

Пазнаёміліся яны на могільніку. Марыся пахавала якраз свайго мужа-пакутніка. А пан Адам наведваў сваю Стэфку, якая спачывала на беластоцкім каталіцкім могільніку ўжо два гады. Адчуваў сябе ўсё блажэй, хоць яшчэ выглядаў добра. Яшчэ крэпкі і дужы, здавалася б, усё горш спраўляўся з усімі справамі. Без догляду жаночай рукі рабіўся ўсё больш недалужны, хаця не хацеў пра гэта думаць.

Спадар Кавальскі калісь быў моцны чалавек. Не хварэў, хоць не шкадаваў здароўя, каб забяспечыць сям'ю. Пагадаваў, павывучваў дзяцей, купіў ім кватэры, збудаваў два дамы, даў на машыны. А апошні дом збудаваў у Беластоку, двухпавярховую

вілу — для ўнука якраз яе збіраўся быў апісаць, найменшага, каб пры ім і завяршыць сваё багатае і працавітае жыццё.

Унук той ужо жанаты, жыве ў тым шыкоўным доме. А дзедава логава, калі занядужаў, стаіць там у калідорчыку. Каб медсястры бліжэй было да туалета, калі прыйдзе перавярнуць старога і памяняць брудную пасцель.

— Ніколі не падумаў бы, што буду прывязаны да ложка, і гаршкі будуць з-пад мяне вывальваць! — плача дзядуля. — І ў сваім стуле буду качацца, пакуль хто-небудзь загляне. Чужы, бо родныя зусім пра мяне не дбаюць. І смерць не прыходзіць, бо сэрца ў мяне моцнае ды вантробы.

Бо чаму ж кідаць працу і займацца бацькам дачцэ-юрыстцы? А забраць дадому яго не можа, бо ў яе сапраўды месца няма ў блёку. Другая дачка, вось, сама ўжо пенсіянерка, яна ж не кіне дому ў Варшаве і мужа, не паедзе ў Беласток, каб займацца ляжачым бацькам! Ён жа тут мае вілу, на гэтага ўнука яе апісаў, а не на ейнага сына; то няхай ён ім і займаецца!.. Ну, не будзем пералічваць сваякоў пана Адама, бо задоўга трэба было б цягацца па судах. Хопіць сказаць, што на нікога з родных разлічваць ён не можа.

Спрабаваў быў пан Адам перад гэтай апошняй бядой стаць на роўную, новую дарогу, каб з кімсьці пад руку прайсці свой перадапошні шлях у дружбе. Не ў самоце. Сустрэў быў раз на могільніку паню Марысю. Вядома, што тут гаварыць пра каханне — калі яно ёсць, то іншае, чым магло быць паўвеку раней... Марыся не магла забыць свайго мужа, усё сніліся ёй страшныя сны, калі ўміраў у пакутах, не мела таксама ніякай патрэбы вязацца з кім-небудзь; сама неяк давала сабе рады, хоць усё больш хвароб пачало да яе чапляцца. Горш было з панам Адамам. Мужчына ў гадах, калі траціць блізкую асобу, якая была яго апорай і шмат у чым выручала ў жыцці,

часам у новай сітуацыі ніяк не можа дайсці да сябе. Адчувае сябе і паводзіць так, быццам толькі што нарадзіўся. Простыя штодзённыя справы здаюцца быць яму не пад сілу. Пан Адам пачаў ужо быў апускацца долу, але сустрэча з пані Марысяй паставіла яго на ногі.

Пан Адам мог разлічваць толькі на сяброўства. Так сказалі абое. Але справу мусіла вырашыць радня, як толькі зведала, што ў дзядулі ёсць “сімпатыя”. Ніхто не выказаўся супраць адкрыта, але патрабавалі спачатку аформіць дакументы наконт спадчыны. Так, на ўсякі выпадак, бо старыя як дзеці, скажуць, што пабірацца не будуць, а тут раптам патэпаюць у загс... а пасля судзіся з новай дзедавай жонкай ды яе раднёю! А маёмасць праўна належыцца ж роднай сям’і! Адна дачка нават прыехала бліжэй знаёміцца з бацькавай сяброўкай, каб дакладна высветліць адносіны. Яна нават намаўляла іх на шлюб, бо тады ўсе абавязкі апякункі ўзяла б жонка, калі “што не дай Божа, бо нам жа няма як займацца татам”.

І так яны ездзілі адно да аднаго, сазвоньваліся, сустракаліся. Раіліся, як правесці час, шпацыравалі... Аж раптам здаровага, здавалася б, дзядулю, паваліў інсульт.

— Я ўсё чула, як доктарка з “пагатоўя” верашчала і трасла пана Адама, — кажа суседка Марысі пані Марыя Фядорчык. — Хацела яго на ногі ставіць, а гаспадыню лаяла: “Чаго так над ім скакаць, пан хутчэй ад яго капыты выцягне!” А праз нейкі час ізноў вызвалі “скорую”, доктар лямантаваў, чаму так позна яго паклікалі, ратунку хіба не будзе, і паперлі рэанімацыйнай карэткай. Думалі ўсе, што пан Адам памрэ, але якасьці выкараскаўся. Адно толькі што паралізаваны. Пані Марысенька сама ледзьве ходзіць. Прыехала да яе Адамава дачка, кажа: бярыце бацьку да сябе. А Марыся: “Ці я яго сям’я?! І сілы не маю, і ў маёй кватэры няма як, а ў яго ж ёсць віла. Але мяне ж

туды не пусцяць, каб ім апекавалася, бо і яго ложак паставілі ў сенях!”

Так яно ёсць, уздыхае Марыя Фядорчык, суседка: нарабіўся чалавек за ўсё жыццё, пагадаваў дзяцей, а цяпер плача: “Марысенько, не ўмірай!..”

## Надзя з Пядзі

У Надзі Іванюк з хутара “На Пядзі” тэлефон паставілі яшчэ ў сямідзесятых гадах, адразу ж тады, як праз падмоклыя лугі, парослыя алешнікам, пакрочылі тэлефонныя слупы. Цягнулі драты да аднае адлеглае хаты тры кіламетры. Надзя жыла тады ўжо адна, і ўсе бабы ў Н. паўтаралі, што танней будзе пакінуць ёй, нестарой удавіцы, тую Пядзю, распрадаць усё і перасяліцца ў вёску, пайсці нават за кавалера (іх тады ўжо кішэла па вёсках, беспрытульных нежанацікаў) або за нянечку падацца ў Нарву, Гайнаўку, ці нават у сам Беласток, чым абрабляць тыя чатыры гектары, цягнуць “кулковыя” машыны на адлеглыя палеткі і луг. Надзіна поле давала някепскі плён, на былой “тарпе” ляжала, але ж траха макравата на ім нават у сухі год, а пры дажджах прыгожую, булаватую бульбу ледзь выдзярэш з чорна-чырвонай зямлі, перавітай рудым карэннем. Пакуль даедуць машыны, Надзя са сваім конікам тупала па сваім маёнтку ад цямна да цямна. Уся счарнелая ад сонца і ветру, забягала Надзя ў краму, што працавала гадзіну ў дзень (нават у свята, калі трэба, Мікола Бязносік адчыняў кожнаму, бо *склеп* размяшчаўся ў ягонай хаце), купляла кіло цукру, муку, лаўровы лісток, зрэдку пляшку, каб было чым плаціць за дапамогу ў гаспадарцы.

Цяжка было ўгадаць, колькі Надзі год будзе. Як

памёр на сэрца яе Івашка, не было ёй і дваццаці сямі, і ад таго часу амаль не змяніліся ні яе стан, што дзяцей ніколі не насіў, ні сухі ды бронзавы твар з дробнай сетачкай светлых маршчынак пад вачыма, ні сіваватыя валасы, гладка зачэсаныя, схаваныя пад хустачкай. Трошачкі толькі яна ссутулілася, нахілілася ёй спіна, злёгку направа, быццам усё нешта цяжкае Надзя несла ў руцэ.

Надзя шчыравала ў полі на ўзор старым і малым. А што з таго мела? У царкву прыходзіла ў сваёй сіненькай сукенцы, проста пашытай, з белым крухмаленым каўнерыкам, узімку сціпла станавілася пад сцяною, хукала ў чорны каціны каўнер палітэчка, зрэдку пасля багаслужбы заходзіла да жанчын у вёску, з ціхім жалем паглядаючы, як хутка растуць чужыя дзеці. Дома ў Надзі не было нікога з людзей, а чалавечае слова чула з тэлевізара. Дзядзька Костусь Астапчык, “кулковы” трактарыст, якому найчасцей даводзілася ездзіць на Пядзю рабіць, казаў, што Надзя надта ж любіць амерыканскія фільмы пра каханне і *багатыроў*.

Не мусіла Надзя жыць адна. Паяўляліся час-часам на Пядзі сваты, спачатку з’язджаліся на фурах, са святочнай радзюжкай на гнаянках — чырвоныя ад уцехі дзядзькі з зялёнымі пляшкамі ў кішэнях. Пасля сваты дабіраліся на “Сірэнках”, “Ладах”, “Трабантах”, з няп’ючым гаспадаром-суседам і крыху спалоханым залётнікам пад гальштукам, апырсканым “дзікалонам”. Спачатку аднеквалася Надзя, марыла аб больш рамантычных сустрэчах, але пачала пасля і ў агляды ездзіць, і ўсё больш маркотная хадзіла...

І неяк Надзя прапала з Пядзі і з вёскі Н. Ніхто быццам і не бачыў, як з хутара выязджала. Коніка і кароў збывала паціху, парэзала ды паела курэй, падсвінкаў на базу павазіў ёй Костусь. Бурка, хоць выязджаючы адвязала яго ад будкі, трымаўся гаспадаркі, ноччу бегаў па балоце і лесе, карміўся

тым, што ўпаляваў. Пільнаваў хату да замаразкаў, бегаў што і раз на палявую дарогу, па якой гаспадыня раней вярталася з Н., хадзіў два разы ў дзень на аўтобусны прыпынак, чакаў, углядаўся ў вочы прыезджых, ці не ведаюць што пра Надзю... Аж у адну снежаньскую нядзелю, калі змрок хутка апусціўся на астылую зямлю, у сваіх сенцах убачыла яго цётка Гандзя Максімава, вяртаючыся з адведак. Ляжаў Бурка на анучы пад парогам, цяжка соп, уцягваючы паветра гарачым носам і стагнаў.

— Ну, што, захварэў? — запытала яго баба. — А ідзі ты, здыхляціна, з хаты!

Адсунула сабаку нагой пад дзверы, а пасля пашкадавала, вынесла скарынку хлеба і адчыніла яму дзверы на двор.

Бурка павалокся ў шопку, выпусціўшы той пачастунак з балючай пысы. Лёг на пілавінне. Да раніцы акалеў.

На Пядзю нікому не было па дарозе. Ды і чаго там было шукаць! Заглянулі туды былі Яська Буй з Жэнікам Дралем, думалі, можа якое дабро пакінула Іванючка. Адкруцілі кручок, на які зачынены былі дзверы, паварочалі ўсё ў хаце, але не было чаго браць. Не варта было чапаць нават старой "Тэслі", што пылілася пад макаткай, з вялікімі рэгулятарамі і малюсенькім шэрым экранам. У хаце было ўсё так, як пакінула гэта Надзя — забрала з сабою што лепшае з вопраткі ды пасцель. Хлопцы селі, закурылі, затапталі недакуркі ў чыстую падлогу, засыпаную мышынымі бобешкамі, пажавалі паморшчаных слівак, што віселі ў мяшочку ля пліты. Яська прыхапіў з сабою дзве торбачкі сушаных шапачак баравікоў ды вырваў тэлефоны апарат, каб не здавалася, што дарам хадзілі на Пядзю.

Толькі раз прыехала Надзя наведаць аколіцу. У чырвоным вялікім "Фіаце", з тоўстым дзедам у малінавым касцюме ў два гузікі, з высокай дзеўкай у

джынсах і скураным заплечнікам ды лысаватым дзядзькам з чорнай дыпламаткай. У краме купілі бутэльку гарэлкі, каўбасу, чорны хлеб ды памідоры. Мусібыць, той тоўсты дзед узяў Надзю за жонку, надта ж добра да яе адносіўся, проста ў рот ёй глядзеў, казаў пасля крамар. Надзя ў вішнёвым ваўняным касцюме, у такога ж колеру пантофлях на корачку, з сівенькім, нізка зачэсаным гуглікам пад капелюшом, з торбачкай малюсенькай на далонь, — Мікола казаў, што выглядала як з нейкай амерыканскай "Дынастыі". А дзеўка, клікалі яе Аська, студэнтка, Надзю называла "мэмі" ці як там. Сапраўды, хацеў той малы пузач купіць зямлю, тую з Пядзі, каб яе падзяліць на ўчасткі, распрадаць пасля ці то гарадскому люду, каб сабе той дачы ставіў, ці немцам якімсьці.

— Decyduj sam, Antoni, o tym kawałku. On mi wyżarł zdrowie, nie mogę już na niego patrzeć! — зморшчыла Надзя свой худы тварык, пацягнула са шклянкі аранжавай "Фанты".

Мікола каторы ўжо раз праціраў анучкай прылавак, паглядаў на згаданага Антона — той быў у выдатным настроі, з размахам ляпнуў пакупніку ў далонь.

— Zrobione! Давай, дзядзька, другую пляшку, будзем піць барыш! — і ўсміхнуўся роўнымі снежнабелымі зубамі да прадаўца.

Надзя толькі памачыла губы ў кілішку, выцерла хустачкай рот і выйшла на падворак. А ў краме, за сталом, накрытым цыратай у васількі, запівалі яе зямлю.

## Настуля

Настуля прыехала ў Каўпакі даўно. Калі? Памятаюць ейныя аднагодкі, якім цяпер за восем-

дзесят, што гадоў з дзесяць пасля вайны прыехала. З дзвюма падгадаванымі дзяўчынкамі. Муж яе кінуў, казалі, за бабамі чужымі пабег. Ну, бо і колькі тае Настулі! У нашай вёсцы бабы, як печы, а тая, бы палена, толькі носік тырчыць, здаецца, усю ў жмені змясціў бы, такая драбнеча. А ўчэпістая да працы, о-ё-ёй! Яшчэ цяпер як рушыць на загоны, то маладзіца з ёю не ўправіцца.

Прыехала туды ў пяцідзесятых. Даў ёй каморку стары Лапуцкі. Сапраўды, Максім ужо тады моцна старэнькі быў. Настулі за сорак, а той — адною нагою на тым свеце. Прыняў Настулю за няньку і гаспадыню. Самотны (хоць дзяцей чацвёра адправіў у горад), хворы. Вядома, Настуля агірачыла гаспадарку. Ёй ці на сваім, ці на чужым — адна слава. Зямля гарэла ёй у далонях. З жывёлай спорылася, асабліва добра цяляты пайшлі. Дочкі памагалі. Стары і духам, і целам акрыяў, з любасцю паглядаў, як гаспадарка падымаецца з руіны. Дзе там было яму да бабы, дый такое маладзіцы, але ўсё ж пачалі ў сяле бомкаць, што, пэўна, Настулю за каханку мае, і ці не было б ім лепш жыць па-божаму? Зычлівая суседка памчалася ў Беласток, да ягоных распанелых дачок, маўляў, чужая бацькоўскае ім крадзе. І пачалася валакіта. Зачасцілі штонядзельку “таксоўкі”, выязджалі з пляскатымі шынамі, столькі дабра валаклі дахаты, бо цяпер ужо было з чаго браць. І аднойчы старэйшая дачка запытала ўпрост: ці не запісаўся ўжо стары, бо як што, то ў выпадку ягонай смерці не дадуць ані кропелькі гэтай прыблудзе, гэтай сухой б.., што тут рашыла ўкараніцца разам са сваімі бахурамі. Настуля засмяялася: маўляў, патрэбны мне мужык! Сябрам мне толькі ваш бацька, добрым чалавекам, які не адмовіў дапамогі, даў кавалак хлеба, вяду яго гаспадарку, толькі і ўсяго. Бразнуў кілішкам малады Лапуцкі: не будзе тут табе, прыблуда, месца! Няхай усё пагніе, але чужым не аддамо ні каменьчыка з

нашага поля! Сядзела Настуля спакойна, склаўшы сціснутыя далоні на падол, слухала лаянку раптам ахопленых сыноўскімі пачуццямі дзяцей Лапуцкага. Потым устала, пайшла пакаваць свой парэпаны кардонавы чамаданчык: укінула святочную выпалавелую сукенку, сандалікі дзяўчынак... Дочкі Лапуцкага паставалі ззаду, сцяўшы зубы. Стары прытэпаў, аслаблы апёрся аб вушак дзвярэй і старэчым дыскантам прапішчаў:

— Вон з мае хаты, д'яблава насенне! Трапіўся мне добры чалавек, што з сэрца мяне да магілы датрымаць хоча, а вы як сцярвятнікі прыляцелі тут усё расцягнуць?! Прэч!

Захадзілі дочкі, забегаў сын па пакоі. Узняўся такі вэрхал, што ўжо не чутно было галасоў з вуліцы — паўвёскі стаяла пад ліпай і абмяркоўвала, хто каго паб'е і чым уся справа закончыцца. Цёткі ўжо збіраліся высылаць хлопца на ровары ў мястэчка, каб званіў па скорую і міліцыю, бо, пэўна, кроў паліецца. Але як стукнуў малады Лапуцкі Настулю ў вуха, як тая завішчала, усе кінуліся разбараняць. Не спадзяваліся гэтага маладыя — першы раз такое здарылася ў вёсцы, каб суседзі захацелі мець дачыненне да чужое справы. Праўда, Юля Васілішына цягнула свайго чалавека назад, шарпалася:

— Чаго ты туды прэшся, гэту сухую к... ратаваць бяжыш?! А хай сабе пазабіваюцца, дый годзе! Якая там табе справа!

— Настуля ніякая не такая, каб які гаўнюк меў права яе біць! Гэтыя сцярвятнікі жыць бацьку не дадуць, цяпер то яго ўспомнілі, а так то хоць бы жывым у зямлю пайшоў! — адмахнуўся Юлін Лукаш і пабег за іншымі.

З'ехалі тады хутка патомкі Лапуцкага, паламаўшы спачатку новы плот ды пабіўшы новы посуд у хаце, які Настуля за сваё купіла. Зноў запрапанаваў Максім Настулі, каб запісацца, бо, хоць між імі няма ніякага

дачынення як мужа ды жонкі, то хто ж мець будзе права да дабра, якое тут пры ім нажыла? Вядома, згодна з правам Настуля як удава будзе мець нейкія правы на зямлю і хату. Усё махаў галавою над сваім жыццём Максім, смерці выглядаў хоч бы і заўтра, але Настуля нават пра гэта і не думала. Не хацела рабіць цырку з замуства, бо якія ж яны муж і жонка, калі яму не на ложак глядзеці, а на дамавінку, і няньчыць яго трэба, а не абдымаць ды цалаваць! Але ўпёрся стары, нэндзіў, маліў, аж упрасіў Настулю запісацца. Два месяцы да свае смерці. Пятнаццаць год, бачыце, пражыў пад Настулінай добрай рукою, і пахавала яго як чалавека, і помнік заказала. Праўда, аж два помнікі дасталіся Лапуцкаму: ад "pogrążonych w smutku synów i córek", з дарагога чорнага каменя, з залатымі літарамі, і цэментавы, просценькі, ад жонкі; потым яго скінулі з копчыка, каб на яго месца паставіць той багаты, на ўвесь могільнік. Што той помнік! У параўнанні з коштамі судоў з Настуляй гэта было нішто! Спачатку дзеці хацелі даказаць несапраўднасць тастамента, маўляў, стары ўжо не пры памяці быў, хітрасцю абматала старэчу хцівая кабета. Другое — гаспадарку да руіны давяла (знайшліся сведкі ў вёсцы, што бачылі, як спекулянтам выводзіла тузін бычкоў на прыцемках, каб ніхто не звочыў). І што не пятнаццаць год гаспадарыла, а пару месяцаў да пахавання. Бо, ведаеце, без прапіскі ў вёсцы сядзела, хто ж там у той час так на паперы глядзеў, як сёння! Нічога, аднак, нашчадкі Лапуцкага не даказалі ў судзе. Сплаціла іхнія часткі Настуля, засталася амаль голая, з пустымі хатай, хлявамі, аборай. Толькі пару курак бегала па падворку. Добра, што поле было абсеяна-абсаджана. Яшчэ і з сёлетняга плёну прыйшлося шмат аддаць за паслугі "кулку". Зараз і дочкі свае замуж пааддавала Настуля. Адну мазур узяў — ой, як плакала маці, не хацела аддаваць яе чужому, не рускаму чалавеку. І мела рацыю — не

ўшанаваў Аліны. Праўда, жывуць дагэтуль разам, але што гэта за жыццё, калі штодзень чуе яна “кацапка” ды “кацапка”, і ад яго, і ад свякрухі, і ад родных сыноў! Малодшая, Крыська, за нашага пайшла, але не ўжыліся, хоць характарамі падобныя. На старасць уздумалі развесціся. Крысіны дзеці цяпер штотыдзень да бабы прыязджаюць, усё раяцца, пытаюцца не ў маткі ці бацькі, а бабу слухаюць. Баба, хоць ёй ужо 84 гады, гаспадарку дзяржаве не аддае, можа, унучак наймалодшы адумаецца, возьме маёнтак у свае рукі? Добры хлопец, кемлівы, разбіраецца ў гаспадарцы, хоць сам працуе на фабрыцы. Тут жа на сваім быў бы. Гаспадарка дагледжана, выраблена кожная грудка зямлі. Амаль усе гаспадары ў вёсцы, нават на гадоў дваццаць маладзейшыя ад Настулі, пааддавалі сваю зямлю “панству”, на пенсіях калякаюць, але як жа можна зямлю аддаваць, калі яе ніхто рабіць потым не хоча?! Ляжаць палоскі аблогамі! Як чалавек можа на гэта глядзець! Ці ж ім сэрцы не баляць! Бо з чаго ж, як не з любові да зямлі яна, Настуля, тут учапілася, у гэтыя пясчаныя пагоркі! Даказала сваю ўласнасць не толькі да Максімавага поля, але і да гэтае калісь чужое ёй вёскі, дзе знайшла прытулак. Праўда, ейная гаворка і сёння адрозніваецца ад суседскай, але яна іхняя цяпер, з Каўпакоў.

— Глянь ты, — кажа баба Настуля, — дае Бог людзям роднае месца, куды, як птушкі ці звяры вяртацца, ляцець павінны. А, бачыш, толькі на мой панадворак мае птушаняты заглядаюць. А не зязюлі ж нашы бацькі, ніхто ім не можа закінуць, што яйкі камусьці падкідалі! Нагадавалі сабе памочнікаў, але куды тыя падзеліся...

# На сваім

Ну, то я вам раскажу, як нам тут у глушы жывецца... Я сама старая, то мне ўжо не да жыцця, не то, што раней, як жылі мой чалавек і сын. А тут я во так адна калякаю, узіраюся, як іншыя жывуць. Каму ў чым-лень дапамагаю, другія мне штось дадуць... Кругом лес, панімаеш, лес мае палоскі зарос, ладны ўжо маладняк, у чалавекі два ростам будзе. Усё вышэйшаю сцяной хутар мой ад вёскі гэтым лесам аддзелены, бачыш. Найбліжэйшая мне — Марылька. Як прывёз яе Федзя за жонку, адразу мне яна спадабалася. Рабацяшчая такая. Не ўсядзіць ні хвіліны. Добрая маладзіца, ветлівая, спакойная. Казалі, бацька-анкаголік моцна яе біў, матка паралізаваная гадоў дваццаць ляжала, то ўся гаспадарка была на Марыльцы, найстарэйшая ж была, і выхаванне сясцёр і братоў, а тых малечаў было, як гарбузянят! Федзік, можа, і таму яе браў, што спраўная ў гаспадарцы і недурная паненка, бо гадоў пад трыццаць... Ды і яму ж каля сарака, бо дзяўчыну на жонку ў наш час як во цяжка знайсці. Голую браў, як той казаў, у адной сукенчыне, бо ў страшнай галечы Ракіцкія жылі — што бацька прапіў, што сыны з хаты на гарэлку павыцягалі (во, бачыш, які прыклад стары сынам даў!). Апошнюю людскую сукенку матцы Марылька ў труну аддала. Крыху цётка з Беластока анучак прывезла, сваёй дачцэ падабрала, трохі новага братанцы купіла з пенсіі. Ну, так Марылька прыйшла ў нашу вёску, на суседні з маім хутар.

Ой, добра я ведала, у якую хату яна трапіла! Бытта людзі някепскія, як усе, цягавітыя да працы, хоць, праўда, не ўсё ім спорылася, ды якіясь яны... як ваўкі. Дзівакі. Прыйдзе старая Маланка да мяне дахаты, дзень добры скажа або і не, але перагляне табе ўсё па

закутках. Або зойдзе на панадворак, лазіць, ходзіць, заглядае, а наш сабака аж на будку ўзлезе, заходзіцца. Тупне на яго Маланка, кіне каменем, як на свайго. Думаю, спушчу яго на гадаўку, хай пакажа, хто тут гаспадар, але ж не, усё ж такі — суседка, прыйдзецца з такою жыць да самае смерці.

Як Марылька хадзіла першым дзіцём, то Маланчына дачка прывезла нейкія таблеткі ад знаёмага доктара з Бельска, ну, і ўкінула ёй тую атруту ў суп, каб дзіця выкінула. І страціла дзіцятка Марылька, і сама ледзь не памерла ў шпіталі ў Беластоку, куды яе скорая на сігнале павезла. Ледзь яе адратавалі, бо плод ужо гніць пачаў. Ой, рады былі, пэўна, Маланка з дачкою! Маланка хадзіла, хадзіла па полі і лесе, як нявестка ў бальніцы была, я сама чула, як прыгаварвала: «Ой, не думай ты, што будуць у цябе дзеці, што ты тут на маім укаранішся! Дам я табе такое, што ніводнага не народзіш!»

І не было б зусім Марыльцы жыцця ў хаце, але муж рашыў аддзяліцца ад бацькоў. Зрабілі старым у каморы пакой немалы, адрамантавалі, вокны вялікія, светлыя ўставілі, а самі — у другім пакоі з кухняй. Марылька нарадзіла Бажэнку. Як ні старалася Маланка, каб не дапусціліся больш дзяцей! Казала: «Ты, Марылька, хударлявая такая, яшчэ нам памрэш пры родах, ці што, а хто тваіх байструкоў гадаваць будзе!?» Але Марылька паздаравела. Федзя з ёю добра абходзіўся, шкадаваў, у гаспадарцы ўсё лепш ішло, расло ўсё, гадавалася... На здзіў! І нарадзіла Марылька яшчэ дзве дзяўчынкі і чатырох сыноў!

Як ні стараліся старыя нарабіць бяды нявестцы! Цяжарную схопяць, бывала, стары трымае за рукі, а Маланка дзвярыма стараецца яе сціснуць! Хіба хацелі так дзіцятка з жывата ёй выдушыць?! Хоць старэчы нядужыя, а так ушчаперацца, моцы такое ад нянавісці набяруцца, што не, не паверыш, маладзіца ім не дасць рады! Потым Марылька тыдзень не магла нічога

зрабіць у хаце, падаіць кароў. Памёр Федзеў бацька, бо старэнькі, нямоглы быў у свае восемдзесят чатыры гады. Маланка на ўсю вёску загаласіла, што атруціла яго нявестка. Не хацела потым ад яе узяць ні кавалачка хлеба, ні кроплі малака.

Маланцы ішло ўжо на 88 год, але жвавая, усё за грыбамі па лесе хадзіла, прадавала. Прыйду я, бывала, да Марылькі, каб з ёю ў лес пайсці, бо з Марылькай і паразмаўляеш ад сэрца, такая людская, спагадлівая, разумная кабета, што і часу не страціш, калі нават ні грыбочка не знойдзеш, і лягчэй якасьці на сэрцы робіцца. І не наракала Марылька, пра сваю бяду ніколі слова не сказала. А Маланка за намі прэцца, крычыць: «Ты, старая акулярніца, што ты тут шукаеш, шпігуеш? Сядзі за сваёю хваінаю, хто цябе сюды прасіў?! Збяруцца дзве чараўніцы і ўсё думаюць, як мяне звесці з белага свету!» Праўду кажучы, то страшна было пакідаць дзяцей адных у хаце, бо бабе бралася на дурныя жарты: а то серпікам па ножцы малому паласне, а то макавіннем з цукрам пачастуе ці воўчай ягадай... Казала я Федзю, каб завезлі матку да псіхічнага доктара, бо ці ж яна нармальная? Але хто хоча, каб яго маці ў псіхбальніцу паклалі! Ёй хіба хто і сказаў пра маю параду, бо Маланка так мяне зненавідзела, што пачала камянямі лупіць, як толькі пакажуся на сцежцы.

Марылька не толькі гаспадаркай займаецца ды дзецьмі. Не могуць нахваліцца людзі ва ўсёй гміне — дзе не ўдасца нікому, Марыльку пасланць можна; яна і з ураднікам паразмаўляе як роўны з роўным, а калі трэба, дойдзе і да ваяводства ці нават абаронцы грамадскіх правоў Зялінскага, ніхто яе не запалохае. Не баіцца, умее справу лагічна вылушчыць, разбіраецца ў палітыцы, гаспарадцы, вясковых бедах. Дзякуючы Марыльцы хоць дарогу ў нашу вёску зрабілі, і да грамадскага пачыну не раз нас заахвоціла, нават такіх старэчаў, як я. Хацелі мы яе выбраць у

самаўрад, але ж часу ў яе няма — гаспадарка такая вялізная, дзяцей, як гароху! Дзеткі дагледжаны, добра вучацца, толькі якіясьці баязлівыя.

У апошнюю зіму выбралася была Маланка пагасцяваць да другое дачкі, у Бельск-Падляшскі. Памятаеш, такія маразы моцныя ўзяліся ў лютым? Во-во, само тады. Федзевы думалі, што маці пераначуе ў Бельску, але не. Аўтобус давёз яе да нашае дарогі. Холадна ёй, пэўна, было, адкаркавала бутэльку, што дачка ёй дала. Надпіла крыху, пагрэлася. Памаленьку апаражніла паўпляшкі.

Знайшоў Маланку Антось Піліпаў, што раніцай збіраў ад гаспадароў конаўкі ў малачарню. Конь захроп, запырхаў ды стаў, як укапаны. Антось злез з шытак. Старая сядзела ў сумёце, абняўшы калені, з бутэлькай у заснежанай далоні, бы спала. Ля яе выструніўся іхні Бобік. Калі ўбачыў суседа, вяла махнуў хвастом і пабег у лес па сваіх справах.

Маланка памерла сто метраў ад свае сялібы, якое так не хацела аддаць “чужой”.

## Аўдосіна неба

— Намалюй мне, Федзя, на полапе сонца ды хмаркі, калі ўжо фарбаваць будзеш, — сказала баба Аўдоська. Калісь бяліла бэлькі глінкай-сінькай перад кожным святам, пэндзлем з мяккае рачное травы. Але пакойны Сідар роўна абіў іх плітай, памаляваў васільковай алейнай фарбай, і цяпер ужо клопату няма. Але ж выцвіла ўсё. Маляваць нанава трэба. Грошы Аўдося мела з рэнты, невялікія, але на такі рамонт хопіць. Ну, які ёй вялікі трэба, бо ўсё паскрэбла, памыла, але ж столі сама не памалюе, на драбіну ж не палезе! Ну, а каб цікавей было — давай, Федзя, тыя сонца ды воблачкі. Нескладаная ж справа.

— Я маляр пакаёвы, не мастак, — закіпеў гонарам Федзя Барбушын. — Вам яшчэ сонца ды хмары! Яшчэ можа і месяц! Хто то бачыў такое, палацы!

— А што, не зможаш? — здзівілася бабуся. — То ж і дзіця, і тое сонца першае малюе, бо бачыць. Ну, пляшку дам.

— І за пляшку, і за грошы — на такую дурноту на драбіну не палезу, дзякуй! Смешная вы кабета, баба Аўдося.

— То ж не з цябе смяяцца будуць. Намалюеш добра, то і пахваляць яшчэ.

— Як хочаце, то за пляшку вам зробяць гэта студэнты, яны ў Карпа пасяліліся. Такія то жарты любяць. Да таго — замежныя, хоць па-нашаму гавораць.

Патэпала з калочкам бабуля да маладых, а маляваць яны сапраўды ўмелі — у акадэміі ў Мінску маляваць навучаныя. І вывелі яны на бабулінай столі і сонца, як жывое, паўднёвае, гарачае, і воблачкі белыя, пёрыстыя, і бурыя хмары, і ружовыя як пад захад, а сярод іх нават самалёцік цягне белую смужку, а над печкай — срэбны маладзік сярод зорак.

Цешыліся, смяяліся. І Аўдося, лежма ўжо, у нядузе, успамінае тую радасць, той смех, гледзячы на сваё неба.

## Ноч у Бельску

Марысін унук, васемнаццацігадовы Юрась, забіў Гандзіна свінчо падвесну. Даў абушком у лоб, ашаламіў, і закалоў умела, пхнуўшы швайку проста ў аорту. Свінка крыкнула, паткнулася і бухнула крывёю. А потым бегла, бач, аж на другі паверх вілы Гандзіных сваякоў, уцякала з адчайным енкам па сходах, шаравала мяккім жыватом па мармуровых

прыступках, аж уткнулася сухім гарачым лычом у гаспадынін прыпол.

Не змагла ўцячы Гандзя ад свінячае смерці на пакоі.

... Прыехала з вёскі у Бельск разам з маленькім дробным парсючком. Паклала яго ў "летнюю кухню" свае сястры. З туга завязанага кужалёвага мяшка заенчыў ён, і мяшок пакоўзаўся па слізкай, пакрытай пліткай падлозе.

— Гандзя, што ты сюды прывалакла? Не будзе тут табе ніякіх свіней! Хоч, гадуй іх у сваёй Маліноўцы. Што ты хочаш, каб Мірык адправіў нас абедзвюх назад? Тут панская хата, а не якісь хляўчук!..

Гандзя падняла на калені рухавы мяшок, паправілася на зэдліку, расшпіліла першыя гузікі цвёрдай ад марозу балонневай курткі, выцягнула з кішэні пакамечаную мужчынскую насоўку, з шумам выцерла балючы нос. Крыху аслабіла завязку мяшка, каб парасё падыхала, з чуласцю ўсунула руку ў сярэдзіну.

— Ну, што, як, кажы, — Гандзіна старэйшая сястра змахнула з цыраты на стале крышаны, у кубачак насыпала гарбаты, у разетку ўваткнула малы падарожны кіпяцільнік.

Гандзя была галодная, пад'ела б чаго, хоць бы супу, не толькі гарбаты напілася. Быў лістападаўскі ранні вечар, а столькі ж ехала з вёскі — добры кавалак аўтобусам, потым пару прыпынкаў цягніком. Уцякла з уласнае хаты, ад свайго Паўла. Куды ж было ёй ехаць, як не да сястры?! Марыся шмат гадоў жыла ў сына ў Бельску, тры гады будзе, як у навюткай вілі. Гаспадарку дапамагала весці, праўнукаў ужо няньчыла. Яшчэ здаровая, хаця старэйшая ад Гандзі на пятнаццаць гадоў. Жыла цяпер, праўда, у летняй кухні, але гэта, казала, з выбару — не мела ўжо сілы хадзіць па паверхах. Старалася яшчэ і чым-нечым дапамагаць, але практычна жыла за сваё, хапала ёй свае пенсіі, хоць невялічкай, але магла што і унукам

купіць, і праўнучкам. Не без значэння было хіба і тое, што і ў гэты дом свае грошы ўваліла, і да машыны далажылася... Глядзела цяпер на яе, Гандзю, з ейным парасяткам на каленях, сваімі выцвілымі, але жывымі вачыма. Гандзі, вось, за шэсцьдзесят, але не сказалі б, што гэта яна, Марыся, яе калісьці няньчыла, што гэта Марыся дала жыццё паўтузіну дзяцей, павыхоўвала іх, пагадавала, у свет пусціла, і ўнукаў пагадавала і выправіла ў людзі, і вось прабабкаю ўжо... Акуратна падстрыжаная, у чыстым хвартушку на спраўным стане, у цёплых, абшытых пухам тапцях стаяла яна над сваёй сястрою ў зашмальцаванай балонцы, з парасяткам, бы дзіцём, якога ніколі ў яе не было, на руках. Ні дзяцей, ні мужа, якога ўрэшце пакінула на пушчанскім хутары...

— Сядзі, сядзі, зараз тваё парасё пусцім у шопку, не павінна замерзнуць, не бойся! Перанач уеш у мяне тут. Не думаеш хіба на старасць ісці ў свет? Не ў тваіх гадах, Гандзя! А што людзі на тое скажуць, ты падумала?! Гэта ж грэх! Як жа дасць сабе рады твой Павал? Загіне без бабы! Ты падумала?

Парсючок заварушыўся, стукнуў балюча капыткамі ў Гандзіны грудзі. Кінула яго на падлогу. Заенчыў, пасунуўся ў бок прыпечка, дзе заціх.

— Падумала, Марыся... Ты толькі хоць мяне не выкінь. Ды што там, пайду ў людзі, можа, прыме хто. Буду дзяцей няньчыць, мыць, гатаваць... Магу апекавацца якім старэчам...

— Ты, Гандзя, сама паглядзі, што і табе незадоўга вады падаць трэба будзе! А твой чалавек? Ці Павал такі зноў кепскі? Усе ж п'юць па вёсках, што ты зробіш! Можа, гэта ў яго ўсё ад таго пайшло, што дзетак сваіх у вас няма? Няма гаспадарку каму пакінуць...

— Нікому няма, калі нават у каго дзеці і ёсць. Мы там усе пагінем, Марыся.

Марыся заліла гарбату кіпнем, з шафкі дастала

купны пірог.

— На, Гандзя, пакуль што гэтага паеш. Мірыкавых ніколі дома няма, а сёння вось паехалі на вяселле. То я і не гатавала сабе нічога. А парасё давай вынесем, не замерзне, а то зараз, можа, яму на двор захочацца...

— Не, лепш яму тут будзе. Вось вашыя сабакі такія злосныя, яшчэ што яму зробяць, возьмуць пакусаюць... Або шчэ хто яго ўкрадзе...

Пераначавалі на ляжанцы за печкай. Ноччу Марыся выходзіла, падкідала вугаль у печку цэнтральнага ацяплення. Тут, у летняй кухні сцяноўка доўга трымала цяпло, Гандзя добра пагрэла спіну. Парасятка стагнала ў сенцах, бразгала вёдрамі, стукала ў сцяну. Тры сабакі, якіх спусціла з ланцугоў Марыся, насіліся па панадворку і агародзе, безупынна брахалі, дзерлі пад дзвярыма, — пэўна, пачулі жывёлу. Дыхалі цяжка пад парогам, скрабліся, а тады свінка квікала з перапуду і бегла ў другі кут, перакідаючы цэбрыкі.

Марыся паправілася на ляжанцы. Не спала.

— Ведаеш, цесна ўжо маім у вілі, — сказала з натугаю. — Вось унукі іхнія павырасталі, кожнаму трэба свой пакой. Юрась ужо будуецца... Ды мне тут лепш, прывыкла я да жыцця ўнізе... Маюць, ведаеш, сваю служанку, то прыбірае, гатуе. Не трэба мне ўжо лазіць па паверхах... Вось, а тут і гарод прыгожы, і сабакі добрыя, хоць злосныя, мяне любяць, то і бяспечна жывецца. Я ж іх таксама ад шчанючкоў пагадавала...

— Марыся, колькі ты ўжо ў Бельску будзеш?

— А, будзе дваццаць, як няма майго Мікіты, а, здаецца, быццам усё ўчора было... Гандзя, не пакідай ты Паўла. Так цяжка быць аднаму...

— Не-не. Я тут застануся, калі ты не супраць.

— І калі нічога не скажуць мае.

Марысіны не мелі нічога супраць. Прынамсі, нічога не сказалі. У Гандзі быў свой грош. На падворку не

замінала, на пакої не прасілася.

Праз два гады, калі Марысю правялі на гарадскія могілкі ў сасновай труне (грош на яе ў чорным вузельчыку трымала за іконкай, разам з шэрай грамнічкаю яшчэ са свайго вянца), Гандзя засталася адна жыць у хатцы. Парсючок рос харошы, гладкі. Выпускала яго Гандзя пабегаць з сабакамі па агародзе вечарамі і калі гаспадароў не было дома. І супраць свінча нічога Марысіны не мелі.

Забіў Гандзіну свінку перад Вялікаднем Марысін наймалодшы ўнук. Не хацела Гандзя таго мяса есці, хаця каўбасы давялося ёй рабіць. Круціла ноччу ручкай мясарэзкі, плакала, а пад дзвярыма нецярпліва саплі Рэкс, Азор і Тарзан.

## Дом Паўліны

Аранжавы "Фіат" хутка сунуўся па бліскучай ад нядаўняга дажджу шашы. За рулём пускаў за шыбу тытунёвы дым немалады ўжо кавалер, сын Паўліны Хведарчай. Сама Хведарча, упёртая вострымі каленямі ў пярэдняе сядзенне, круціла на бакі галавою ў ядвабнай хустачцы, — успаміналa родны краявід, хапала за руку суседку, паказваючы пальцам на ўсё новыя, для Карусі аднолькавыя і нецікавыя, карціны. Шаша роўна бегла паміж бярозамі, свежыя лісточкі якіх павявалі на доўгіх, далікатных галінках над узбоччам дарогі, там-сям прамільгалі за маладняком хутары ў старых садах. Паднялося роўнай шчоткай жыта, праз шыбу ўціскаўся салодкі пах гною і свежае зямлі.

— Бач ты, рана да Юр'я зямля сёлета адчынілася, — заўважыла Хведарча. — Каб толькі надвор'е не папсавалася... Ой, ля, Карусё, хутар Павэльскіх, ля!

Жыў Павэльскі на пяскеві, але хадзіў у капялюшыку. Аноп, ня ведаеш ты, як там цяпер з іхнімі? Як ім там жывецца, га? Нашу хату, Карусё, яны калісь купілі, перанеслі сюды, у Ляхоўшчыну, як мы пабудаваліся ў Новым Мосце... Карусё, а чаму ты такая белая стала, кепска табе ў машыне? Мне спачатку надта ж блага ў самалёце бывала, першы раз, як ляцела ў Амерыку, але цяпер хоць бы дзічкі, толькі спачатку ў вушах закладае.

Каруся Маліноўская, Паўлініна сяброўка з дзяцінства, ехала са старою ў сваю вёску. У сяло, якое знікла з мапаў і з паверхні зямлі. Палову яго ўхапіла сабе новае возера, другая — хутка зарасла дзірваном. Каруся сама не выбралася б туды, бо і чаго, але не давала ёй спакою Паўліна, што прыехала ад сына з Чыкага. Добра Хведарчай — мае да каго ездзіць; пасля смерці Хведара Катовіча аддала зямлю дзяржаве за пенсію і сядзела ў сваіх дзяцей — то ў нежанатага Анопа, то ў дачкі ў Познані, то зноў у Амерыцы — у Шурычка ці Валіка... І хацелася ёй цягаць старыя косткі! Здаецца, такой Карусі выбрацца да лекара ці на кірмаш ужо цяжка, а Паўліна, якой больш, бо ўжо семдзесят гадоў, лётае сабе па свеце! Ёй-та, можа, і лягчэй — на Хведарчай ні грамулькі тлушчу, адно жылы ды косткі, перабірае сваімі доўгімі нагамі, што малады ледзь з ёю збяжыцца! Ано паморшчылася непрыгожа, узрост па далонях відаць, твар сухенькі, а ў Карусі гладчэйшы, румяны. Але зубы якія ў яе, Божа мой — такія зубы! Хіба ж не штучныя, бо не вымаюцца, але як снег!..

— Што ты, Карусё, так мне ў рот усё ўглядаешся? — Хведарча вышчэрыла свой снежна-белы гарнітур. — На зубкі дзівішся? Гэта я ў Амерыцы такія ўставіла. Думаю яшчэ пасмакаваць жыцця. Не пашкадаваў Шурычак даляраў, кажа, што хоча мець матку амерыканскую, як у “Дынастыі”. Вось мне такія і прышрубавалі. Цах-цах! — глядзі, косць магу

перакусіць! Хоць старая, то з такімі зубкамі кожнаму прыдамся!

— Вы, мамо, глядзіце, бо і сапраўды які наш кавалер вас у Амерыку не пусціць, калі да яго ўсміхнецеся! — адвярнуўся Аноп. — Во тут бабыль недалёка жыве адзін, у Барысках, што нашу хату ад Павэльскага купіў, перанёс. Мамо, хочаце нашу хату пабачыці?

— От, прыдалося б. Ты ж у гэтай хаце нарадзіўся. Колькі ж ёй будзе? Ставілі мы яе ў пяцьдзесят другім, так ці не... А ты мяне, сыну, замуж не выдавай, сам сабе лепш якую людскую дзяўчыну знайдзі. Мне ўжо больш няволі не трэба, адпакутавала я за свайго Хведара! А вось і нашы Барыскі, надта ж хутка на машыне, ледзь слова скажаш, і на месцы.

Спыніліся перад новымі жоўтымі веснічкамі ў счарнелым пахілым плоце. Хведарча спусціла за парог машыны свае доўгія ногі, але хутка падабрала іх назад — паркан пераскочыў вялікі худы сабака і гыркануў перад яе тварам. Ад падворка ішоў босы мужчына, высокі і чорны, у цікавым летніку. Затрымаўся перад брамкай, узяўся за драцяную пятлю, заложаную на слупок і паглядаў з разяўленым ротам.

— Гэй, дзядзьку, мы да вас у госці! — высунула з-за шыбы нос Паўліна. — Патрымай свайго д’ябла, а то шчэ каго пакусае!

Босы чалавек скінуў дрот, адчыніў брамку, схапіў сабаку за карак і шпурнуў убок. Той прысеў, запішчаў па-шчанячы.

— Ну, чорт! Пайшоў прэч, бо заб’ю! — затупатаў на яго гаспадар.

Сабака прылёг да гаспадаровых ступакоў, заенчыў.

Госці вылезлі з машыны. Хведарча падабрала сваю доўгую ваўняную спадніцу, каб не памачыць яе ў высокай траве, скіравалася цераз падворак да дому, не азіраючыся на гаспадара.

— Мы, пане, не так да вас, як да свае хаты.

— А хто вы будзеце? — мужчына прыспешыў свой крок, каб паспець за Паўлінай.

— Паўліна Катовічыха. А гэта мой сын Ануфрэй, а во гэта пані — Маліноўская Караліна. З хутара Залескага наша хата пайшла на Ляхоўшчыну, да Павэльскіх, а вы яе ад іх купілі. Пабачыць прыехалі, як наша хата маецца. Не будзеце супраць паказаць нам, як жывяце?

Ішлі паўз доўгую бела-жоўтую, пакрытую глінкаю сцяну старэнькае будыніны з аселым у зямлю зрубам накрыж, з малочна зашклёнымі маленькімі акенцамі. Чорна-бурая саламяная страха павісла на ўзроўні чалавечага росту. За гэтым домікам стаяла хата Паўліны.

— А чаму ж ты не разбіраеш гэтага страшыдла? — Паўліна прыпынілася перад зарослым дзікай канаплёю парогам. — Хіба ж ёй будзе сто гадоў, як не болей?

— А шкада, ды й не хочацца яе чапаць. Рушыш пальцам, то падворак заваліць, потым смецце вывозь. А так сабе няхай стаіць, паціху гніе. Мне там яна не шкодзіць.

— Ай што вы, яшчэ хто чужы прыедзе, здымкаў наробіць, апіша, як то ў нас людзі жывуць, цыт! — заматала галавою Каруся. — Ну, ведаеце, я даўно такое развалюхі і не бачыла!

— Не развальваецца ж, стаіць, то хай стаіць, як яе прадзед паставіў. Сваё served — 

— Што, адзін жывяце? — пацікавіўся Аноп.

Падышлі ўжо да іхняе хаты, учарнелай, але моцнай, з шэрымі крэйдавымі лічбамі на бэльках; побач слаба зарысоўваліся такія ж, расплывістыя ўжо, зробленыя сінім хімічным алоўкам. Дом стаяў на вялікіх камянях, няроўна склееных цэментам.

— Адзін жыву, як бачыце. Не ўдалося мне знайсці братняе душы. Да сарака меў яшчэ надзею, сватаўся то там, то сям... А вось апошнія гады, як мама памерлі, то ўжо так сам калякаю. Садок во маю, харошы. Вуллёў трыццаць, мёд маю добры, авечак трымаю, курак, трусоў... І жыву сабе, вось... — мужчына рыпнуў дзвярыма, прапускаючы гасцей з сенцаў на кухню.

— А-а-а, вы так запланавалі, — заглянуў Аноп за заслону, што аддзяляла кухню ад пакоя. — У нас тут сценка была...

— А во тут ты, сын, нарадзіўся, — паказала на куточак за кафлёвай печкай маці. Агледзелася па хаце, перажагналася да іконы святога Юрыя над акном у белым неадпрасаваным ручнічку.

— Прысесці можна ў вас, гаспадару?

— Ай-яй, сядайце! — замітусіўся мужчына, выцягнуў з-пад стала доўгі шурпаты столак. — Можа, мёдзікам пачастуецеся, панства? Толькі сцукраваўся ў мяне ён штосьці... — захадзіў каля шкапчыка з посудам.

— То, пэўна, увесь мёд на зіму пчолкам забралі, а цукар даць ім — то ж не тое... Не любяць яны, пчолкі, калі ім мёд цукрам замяняць, слабеюць, уміраюць! — са знаўствам распавядала Паўліна, каштуючы з лыжкі цёмны грачаны мёд. — А як цябе, сынок, клікаць? Чый ты будзеш? Ці часам не Дамінісін, такі чарнявы?..

— Не, Дамінісінае сястры сын. Ганулін Ігнась.

— О, бач ты... Счула — знаёмае. То ж Гануля з маім братам Лёнікам меліся к сабе! Думалі, што будзе што з гэтага... І прапаў наш Лёня ў Прусах... Ай-яй-яй! То ты будзеш Ганулін! І што, не зладзілася табе, Ігнась, жыццё?

— Што ж зробіш, цётко... Не сам жа чалавек свой лёс выбірае. З лёсам на гэты свет прыходзіш...

— Ой, не-не! Што ты кажаш! Каб так кожны думаў,

то свет зусім не змяняўся б! А ты... То ж ці мала дзяўчат у твой час было? Ну, не трапілася твая. Ну, можа і праўда... Як мяне мой Хведар браў, то я ад шчасця ўмірала, а потым ледзь ад таго шчасця выжыла! Але што зробіш — трэба было нашым дзецям на свет паявіцца. Каб не яны... Але я не кінула свайго чалавека, дагадавала да ягонае смерці. Быў паганец, такую і смерць меў, Бог адплату кожнаму дасць. Ён ведае...

— Вам то, цётко, добрэ, у вас сваё ёсць. І я хоць хату маю, зямлі кавалак, то і жыву так. У іншых і гэтага няма. А што кабет тычыцца... Ужо сабе ніякай не знайду, застары, і маладзейшыя хлопцы ў нас іх не знойдуць. Хоць ты сядзь ды плач!

— Але, — згадзіўся Аноп. — І ў мяне з гэтым загвоздка. Каб так жыць, то яна да цябе пайшла б, але не на вёску...

— Ты, Анопе, не кажы, бо лаяцца буду! — замахнулася лыжкай Паўліна. — Ля, жыў з нейкай Жаннаю, то не хацеў пабірацца, жыць па-божаму. То і кінула.

— Не кінула, а паехала сабе да лепшага. Рускую сабе выпісаў, — растлумачыў Аноп. — Прывёз, хвайная баба, усё на месцы мела. Падумаў, можна і запісацца. А тая зараз за манаткі і ходу. Пабачыла, што за мною не нажывецца.

— Ага, пажыў ты з ёю паўгода, не кажы. Трэба ёй быў пашпарт, то знайшла такога, хто яе ўзяў. І маеш — ні кала, ні двара. Бо што ж гэта за дом — каморка ў блёку. Ты, Ігнась, аж дзве хаты маеш, — засмяялася старая. — А ў мяне дзетак аж чацвёра, і ў Амерыцы, і ў Еўропе, але хаты ўжо ніякае свае. Во што я маю на старасць. А колькі табе, сынку, гадоў будзе?

— От, ні жарты — пяцьдзесят чатыры. Не заўважыў, як гадкі праляцелі... — уздыхнуў Ігнась, заглядзеўся ў акно.

— А, мамо, збірацца будзем, а то цямнець пачынае, не паспеем да Бандароў дабрацца, а і вярнуцца назад у Гайнаўку трэба... — схамянуўся Аноп.

Сабраліся хутка. Сабака неспакойна выглядаў з-за вугла белае хацінкі. Выскачыў з брэхам на зарослую травой дарогу, калі машына рушыла. Не пабег за ёю, дзёр лапамі мураву, брахаў, як быццам лаяўся. Гаспадар схапіў яго за карак, падняў уверх і пацалаваў у здзіўленую, спалоханую засліненую морду.

— Аноп, дасі нам свайго "Фіата" на нядзельку? — хітра запыталася ў Анопа маці. — Правы ў мяне ёсць, вочы добрыя, не выпіваю, машыны твае не паб'ю, вядома.

Аноп зірнуў у люстэрка. Паўліна з усмешкай паглядала на мілевыя слупкі, што мільгалі ўзбоч дарогі.

## Піліп у фасолі

Не пазнаў Піліп свой загон у роднай вёсцы. Хоць зямлі ён не забыў.

Піліп з М. з Гарадоцкае гміны што і раз прыязджае ў вёску, хоць даўно абжыўся ў Беластоку. Коля і Надзя, ягоныя стараватыя бацькі, і не думаюць здаваць гаспадарку, хоць ім ужо ўелася ў косці. Але, нават цягнуцца абрабляць палеткі суседзяў-пенсіянераў, — во там на ўрадлівых агародах пасеялі гуркі, там фасолю, там лапік аўса, тут будзе рэпа... Стары з крэктам лезе на трактар, Надзя коціцца за ім следам. Нават на той трактар уцягвае сваё поўнае, хоць ужо не такое дужае цела. Летась падала Насця з трактара, паламала нагу, то Коля ў тое лета зусім з сілы выбіўся. Але ўдалося ўсё ў мінулым годзе сабраць, ды нічога не было б, калі б не Піліп са сваім сябрам (сябру давялося добра адплаціць).

Думалі раз ужо старыя кінуць усё і адпачыць. Але калі толькі прыгрэе веснавое сонейка, запахне свежай зямлёй і гноем, зазвініць жаўрук, Коля Пячкур ажывае, бегае па падворку, сюды-туды ездзіць па гаспадарчых справах, арэ... Аж сэрца баліць, калі бачыць, колькі добрае зямлі марнуецца. Ізноў набярэ зямлі, а нават і без пытання робіць тое, да чаго ніхто прызнацца не хоча, дзярэ даўно нячэпаны дзірван. Іншыя жыхары ўзіраюцца і мяркуюць на лавачках: нашто Печкурам тая работа, тая зямля? Тыя бульба, пшаніца, жыта, авёс, тыя соткі гуркоў, ячменю, буракоў?.. Тыя каровы, авечкі?.. Дзеці ўсе ў горадзе, усім кватэры бацькі пакуплялі, цяпер унукам усё поўныя торбы цягнуць... А і так нявестка, Васева жонка, цешчу кацапкай абзывае... Торбы аж пэнкаюць, толькі ім усяго валакуць. Каб не тыя гасцінцы, то, пэўна, не было б ім чаго і цікавіцца старымі?.. Каму ўсё гэта пакінуць, тую гаспадарку? І так толькі Піліп што і раз прыедзе, робіць як шалёны — удаўся ў бацькоў. Замест ехаць дзе на *ўчасы* — учарнее на лузе. Такая добрая ў Печкуроў зямля, але і так нікому яна непатрэбная: ніхто з дзяцей яе не хоча ўзяць, — ні тры дочкі, ні два сыны. Нават Піліп кажа: "Тато, нашто мне яна? У мяне добрая пасада, іду ўверх. Тато, мамо, здавайце ўсё, будзеце мець грошы кожны месяц. Адпачывайце. І так у нас у горадзе ў ніводнага месца няма — кватэры малыя, дзяцей поўна. Не будзе вас куды ўціснуць, калі расхварэецеся. Лепш у някепскім здароўі жыць вам тутака, дыхаць свежым паветрам. Мы і так вас наведваць будзем." І, праўда, звоняць дзеці што і раз, пытаюцца, як здароўе, калі даўно матулі ў горадзе не было.

У мінулым годзе ў М. камедыя атрымалася, на пацеху ўсім людзям. А ўсё праз Піліпа і фасолю. Засеяў Коля пяць палеткаў фасоляю — тры свае і два суседчыны агароды. Парасла фасоля буйная, высокая,

з крамянымі струкамі; усё тут расце добра, на былой тарпе. Прызджаў Піліп, тры разы палоў тую фасолю, умацоўваў яе на калках, падвязваў — на ўсіх загонах. Пра ўсё так дбае ён у бацькавай гаспадарцы — зярнятка ў яго не прападзе. А прыйшоў час, гаспадарлівы сын сабраў плён.

Вырваў Піліп сцябліны фасолі, калочкі роўненька пакладваў на мяжы. Склаў фасолю на кучку і пайшоў па мяшок. Прыходзіць — няма фасолі! На загоне, які тата ўзяў у арэнду ў Каваліхі! Вярнуўся Піліп дахаты, трымаючыся за галаву.

Ускіпеў Мікола! Успыхнуў чырванню, як індык: старая... Кавалёва забрала, няйначай. Ці памылілася яна, ці спецыяльна так цікавала, каб украсці плён, сабраны са свайго загона!?

Пячкур пабег да суседкі, заламатаў у сенцах, загрукатаў кулаком у дзверы. Кавалёва якраз высыпала попел з-пад пліты. Аж упусціла попельнік, так спужалася. А добры сусед за сівы гуглік валасоў на яе старой галаве ўчапіўся!

— Што ты, Коля, хочаш? Якая фасоля? Ды твая фасоля стаіць на градзе, уся ў пустазеллі! Ніхто яе не палоў, аж шкада было глядзець. Я сама ўжо думала прапалоць яе, ды быллё парасло вышэй мяне, як мне туды лезьці з кульбаю! Трэ было Піліпа прыслаць. Ты што мяне, суседзе, за косы турзаеш?! Во зараз пайду да солтыса, хай вызывае паліцыю! Супастат ты паскудны!

Вось такая справа! Піліп даўно не бачыў абедзвюх суседак, а і пасля дваццаці пяці гадоў забыўся, якая з іх “Каваліха”, у сапраўднасці Манька Куцінская, а якая Маруся “Кавалёва”, па прозвішчу Каваль. Каваліха рада — нейкі добры чалавек яе фасолю акуратна палоў, падвязваў, а нават і пазбіраў, то ўзяла радзюжку, забрала плён і панесла дахаты. А фасолю, якую пасеяў вясною Коля Пячкур, перараслую лебядой, пырнікам, драсёнам і чым там яшчэ, ледзь

выдзер бедны Піліп.

Збегліся ўсе з вёскі, нават тыя, на кульбачках, прытэпалі, каб паглядзець, як беластоцкі пан бушуе на загоне.

## Ратунак

Вярнуліся з Нямеччыны вясною сорак пятага. Чалавека не было яшчэ, я і надзею страціла, што думае ён, вытрымаўшы ўсю вайну, жыццё аддаў за рускімі. Ано хадзіла, енчыла, бо наша месца занялі сваякі і думаць не думалі, каб на сваё ісці. Урэшце перабраліся, але пакуль тое, што я ўсё хадзіла, прасіла па суседзях, каб хто поле зараў, каб пару кошычкаў бульбы пасадзіць далі на зіму, каб дзеці з голаду не памерлі. А муж вярнуўся, весь апухлы, у кастрычніку, дзіўны якісь, такі прыбіты.

Дачакалі мы другое вясны. А маміны браты пабудаваліся каля Белавежы, у лесе, у іх свой хлеб ужо быў. Нават на самагонку хапала. Мамін брат найменшы гнаў яе з хлеба. Убачыў, што я канцоў не магу звязаць, дык кажа: “Ведаеш што, дзіця, прыходзь, бяры ў мяне гарэлку, насі прадавай.” А ў нас там у ваколіцы заўсёды п’яніцы былі. Ну, я і ўзялася таргаваць тою гарай. А да дзядзькі трэба было ісці аж 12 кіламетраў. І я кожны тыдзень, а калі не, то праз дзве нядзелі, ішла ў той бок, а потым ноччу валакла шасцілітровы круглы шкляны буталь. А абіваўся ж ён мне па спіне! Каб пляскаты быў, неяк плецачок зрабіла б, лягчэй было б несці. А то ўб’юся — то ў адну руку перакіну, то ў другую, то зноў на плечы, і так лесам, каб ніхто не бачыў. Мяне не надта слядзілі, прынясу гэта ў Н., пасля, калі, зноў пачне змяркаць, цягну да нас, схаваю. Я вось

прывалаку тую гарэлку, у бутэлькі разліваю, а чалавек мой нават не хоча да яе даткнуцца. Такое *путо* было з яго, не да жыцця.... А ў нядзельку ўсё тое прадам. І раблю людзям за кусок хлеба. Жыць жа трэба, карміць дзяцей. А жылі ж мы на голым пасля вайны, вёска была спалена фашыстам... Так Бог дае чалавеку труд, каб выжыў...

Дачакаліся вясны. Людзі дапамаглі, далі бульбы. Я з восені жабравала была, не дай Божа! Зайду ў С. Тамашнія бабы дзівяцца: "Дзесь ты знаёма кабета, скажы, адкуль сама?" — "Не пытайцеся, адкуль я вам знаёма, а дайце мне, колькі хто можа, жытка, мне яго змелюць, я хлеба дзецям напяку." І да каваля была зайшла, прадала яму пару метраў тканіны, што з Нямеччыны прывезла, даў мне за яе мех зерня, і нажабравала я мех жыта, і на цалюткую зіму быў дзецям хлеб...

А во і цёпла стала. Аж нарваўся адзін чалавек. Прыйшоў да мяне, кажа: "Чуў, ты прадаеш гарэлку смачну, з хлеба. Ты мне ў кожны ранак дасі яе па кілішку." А да майго чалавека і не азываецца, той сядзіць, як нежывы. "Байкі, не прайграеш. Я не маю грошай, так плаціць, але ты знаеш, хто я? Я — гаёвы, у мяне цахоўка ў кішэні. Я з тваім не гавару, бо якісь дзіўны ён... Я табе памагу. А піць не буду кожны дзень, толькі тады, як мне трэба будзе..."

Пахадзіў так да мяне. Ён дадому — мой мужык з хаты. Гаёвы ўзлаваўся: "Чаго ты выходзіш?! Я прыйшоў кілішак выпіць. Не-не, я сваю жонку маю!!! Я вам хачу дапамагчы." А ён усё ж выйшаў на растрэсены ганачак, маўчыць. Гаёвы кажа мне: "Шукай назаўтра пілу ды сякеру". А ў мяне няма іх. Кажа сусед: "Ну, бяры ў мяне, але ты сваё *путо* разварушы, каб таксама ішоў!" Гаёвы кажа: "Будзь і ты ў лесе. Ведаеш кварталы ў пушчы?"

На другі дзень прыходзіць ізноў і кажа: "Знайшоў я клён, сасну і яліну сухія, усё прыгатовіў. Е піла і

сякера? Заўтра ранютка, каб былі там і там.” Я ўзяла паўбутэлечкі гарэлкі, хлеба кусочак, суседка дала да хлеба. І пайшлі цераз рэчку.

Гаёвы сядзеў ужо на пянёчку, чакаў. Ну, кажа, скідайце летнікі і шапкі, будземо палоць што трэба. І ўзяўся, разам з усімі, за працу. Столькі нарэзалі, што хапіла на хлеў у тры дзверы, і клуню, і хату. На латы, на кроквы, на ўсё. А гаёвы такі майстар — як секане сякерай, то як хтосьці гэблікам! Нашыкавалі дрэва, наспускалі, пацерабілі...

Склалі дрэва на падворак. Давай я пытаць у людзей, дзе мне да яго трача знайсці. Прыйшоў цётчын сын і кажа: “Дасі мне ад метра, той я прыйду рэзаць, у мяне е піла доўгая”. А я сваяку: “Мой чалавек не здужае з табою рэзаць, бо ён хворы і галодны, а ў цябе ёсць хата, у хаце хлеб і да хлеба. Ён з табою не выцягне.” Тады настроілі мне С. з М., і той хлопец згадзіўся памагаць за... літар гарэлкі. Я кажу дзецюку: “Ты, я з Нямеччыны прывезла такі летнік харошы, ты ж сірацiна, абарваны, абшарпаны”. Дала яшчэ таму хлопцу ганавіцы, падштаннікі, сарочку, кашулю і рубашку. Елі работнікі тое што і мы — таўканіцу, крупнік і сякі-такі боршчык, абы хлеб быў. І зрэзалі мне ўсё на будову. Так мяне Бог пашкадаваў...

А тую няшчасную гарэлку насіла я яшчэ тры гады. Гэта ўсё, каб выжыць. А пушча нас ратавала.

Пра ўсё жыццё з мужам гаварыць не буду. Адным словам — біў.

Двух сыноў я пажаніла. З хаты на старасць выгналі. Цяпер жыву ў дачкі, таксама ўжо бабулькі. Па начах плачу, хоць мне ў яе добра. Кажуць: “Не плач, бо ёй прыкра; яна ж цябе глядзіць, есці табе дае, вядро тваё носіць, а ты плачаш?!” І глядзіць мяне, і слова скажа. А колькі старых нас тут у пушчы гібее...

# Раман

Не трэ было Раману, дзякуй Богу, ніколі па судах цягацца. Не спатрэбілася. І не судзіўся, і як сведак не ставаў, ні ў справах уласных, ні ў чужых. Калі раз трэба было ў суд ехаць на зацвярджэнне тастамента па бяздзетным браце, сваю спадчыну пісьмова пераказаў іншаму сваяку-сіраце; вядома, паперка была пацверджаная, а сам Раман, на ўсякі выпадак, "захварэў". Бо чаго валачыцца ў Беласток, плаціць грошы за дарогу, час, прызначаны на гаспадарку, траціць! Бачылі вы такое!

Хто любіць таўчыся па свеце, а хто і не вельмі. Хопіць Раману штосераду завезці свае прадукты на рынак у гміннае мястэчка. У Беласток, да дзяцей ды ўнукаў, Раман ужо толькі жонку высылае. Хай нават і пару дзён  пасядзіць яна там, а яму тут, у хаце, спакайней. Без бабы справіцца: электрычнасць у хаце і хлявах, не трэба статак кароў два разы ў дзень тузаць за вымя. Уключыў — і пайшло; іншая спрва, ці карове прыемна. Усё дзівуюцца Раману: нашто яму столькі ўсяго, тая гаспадарка на старасць, калі б мог ужо здаць усё "пад панства". А то капусты насадзіць столькі, што ўся вёска менш яе мае, то бульбы, пшаніцы, то жывіны столькі... А набірае зямлі яшчэ больш, бярэ суседскую ў арэнду, аблагі заворвае... Ну, весь век добры гаспадар быў. Без зямлі жыць не можа, рукі склаўшы. І цяпер, хоць усе аднагодкі — ужо пенсіянеры, Раман калупаецца ў зямлі, сее, збірае, гадуе. Таўчэцца. Чалавек добры, з суседзьмі добра жыве. І добра было б, каб так і да канца...

Ці прадаў Раман Верцы капусту? Ці, можа, яна накрала яе ў яго? Калі б нават украла, то, пэўна, не заўважыў бы, а калі і нават прыкмеціў, то не пашкадаваў бы тых пару галовак. Хай наварыць, наесца. Муж яе пакінуў, жыве адна, зусім апусцілася.

Здаецца, штось у яе не так і з галавою ад тае самоты. Шкада старое. Прывалачэцца ў тваю хату, сядзе, транты раскіне, то злосць бярэ, што нічога не робіць — пайшла б дадому, ушчувае суседку Раман, але брыды ж не робіць. Была з яе добрая гаспадыня калісьці. Што ж зробіш, жыццё кабеце не ўдалося. І цяпер яшчэ гаспадыня з яе, на яе зямля пішацца...

Ці то хтось параіў Верцы, ці не сам Раман падказаў, каб тое зямлі пазбылася. Значыць, не ў арэнду давала, а прадала. За тыя грошы дажыве ці тутака, ці ў Дому старцаў. Дзяцей не мае, то хто ж яе дагледзіць. А і зямля тут падаражэла, народ мястовы купляе яе на дачы. І тут раптам аб'явіўся Верчын муж, што дух ягоны быў ужо прастыў у ваколіцы.. Падаў на жонку ў суд, што ненармальная, каб правы адабраць. Што ў грашах яна не разбіраецца, што ходзіць бы блудная па сяле, што вось у Рамана накрала капусты... Шкодная, значыцца, для грамадства, зачыніць яе трэба ў псіхушцы, а маёнтак перадаць мужу, каб распараджаўся. Разводу ў іх жа ж няма. Адваката нават Антон наняў.

— Рамане, я ж у цябе нічога не крала... Не? Паедзь у той суд, скажы, як то было, — узмалілася Верка. Яна не думала пра сапраўдныя матывы дзеянняў мужа, забалела ёй толькі тое, што робіць з яе зладзейку. Яшчэ каб пэгеэрскае брала, але гаспадарскае?!

Паехаў Раман у Беласток, пасведчыць. Сказаў, што трэба: не крала суседка ў яго капусты. Гаварыў, а глядзеў усім у вочы — і суддзі, і адвакату, і Верцы, і быламу суседу Антону... Каб нікому не зашкодзіць, каб ніхто не пакрыўдзіўся... Каб добра было.

Ехаў увесь мокры дахаты.

# Марыя Кузьма

Сагналі нас усіх у пераходны лагер ва Уроцлаве. Апошнія дні вайны былі, баі астатнія. Нагналі столькі народу з лагераў, з работ — тысячы! Я з сям'ёю, з дзецьмі, з маткай тры гады ў Нямеччыне была рабіла... Сагналі нас у такі раён, што наўкол толькі развалiны, руіны, адно брама цэлай засталася.

А такія енкі, такі лямант — людзі, дзеці плачуць вады, а вада... бяжыць проста па вуліцах. Вадапомпу якраз разбілі, кажуць, вада атручаная, нельга яе чапаць. А ўсе ад смагі гінуць, і думка адна, што нас тут усіх кончаць. А тых стражнікаў чатырох стаіць ў той браме, кудою цяжкія машыны праязджаюць. Людзей як маку... Малых, старых... Гляджу на аднаго немца, на яго пагоны — заслужаны, а сам маладзюсенькі. Ідзе — я за ім. А мая мама сядзіць каля майго меншага, народжанага ў трыццаць дзевятым — ён ужо нам ссінеў, так без вады яму кепска... Уміраць будзе... Я за тым немцам, ззаду, за ім... У цемры бачу — нейкі сівы коц вісіць, пад ім двое старэчаў сядзіць, святло нейкае б'е ў тунелях. Кажуць старыя немцы таму маладому: "Глянь, а хто ў цябе ззаду стаіць?!" Я ўсё разумею, кажу па-нямецку: "Не бойцеся". — "А чаго ты хочаш?" — "Мой *юнг* уміра́е, вады яму трэба". — "Дайце трошкі вады," — кажа малады немец; пэўна, бацькі гэта былі ягоныя. Яны патарабанілі ў бак, кажуць, што і ў іх вады няма. Усё ж нацюркалі мне трошачкі. Вайсковец кажа: "Я буду ісці спераду, а ты — за мною. Я выйду, а ты пастой яшчэ крыху, каб ніхто не бачыў, што мы разам ідзем".

Я хутчэй бутэльку маме: наце, паіце. А тут людзі рушылі да мяне: адкуль ваду ўзяла?! У цыстэрнах жа вада атручаная! Я падышла да тых немцаў, што стаялі ў браме, гляджу па-за імі — а там лонкі відна, даліну,

волю! А вада гудзе па тратуары. Кажу немцу: "Дайце вады! Мы на вас столькі працавалі! Дзеці нашыя ўміраюць, вады просяць... З нашых гаспадарак тое ў нас засталося, што на плячах, а мы ж мелі дамы, кароў, коней... Нас сагналі вы сюды тысячамі, дайце нам хоць перад смерцю напіцца. Пасля можаце нас усіх, і дзяцей нашых — пабіць". — "Нэйн, нам нельга". — "То скажыце, што з намі зробіце! Біце адразу!" Я тады была такая цянюткая, толькі што выйшла з бальніцы, страшныя атакі болю пячонкі мяне ў крук сагнулі... Стаю такая маленькая перад тымі ўзброенымі немцамі. "Я свайго шаснаццацігадовага сына, такога як і вы, аддала ў акопы, не ведаю, ці ён жывы... Дайце вады! Жыццё і так усё страчана наша. А не — то мы самі вас паб'ём!" — "А як ты нас паб'еш? У нас жа ж ружжо!" — "Вы нас усіх не паб'еце. Вось колькі *манаў* нашых стаіць. А хоць бы і штыкетамі!" А нашым мужчынам кажу: "Ламіце штыкеты, будзем іх страшыць, я пайду папярод". Сабралася дванаццаць нашых, сталі мы перад стражнікамі... А тая вада рвецца, па тратуарах, па вуліцы, а піць не можам! Такая пакута! Ступілі мы пару крокаў. Тыя — лясь-лясь! — ружжом. Ано даць залп — і ўсё з намі. Кажу хлопцам: "Пастойце, я яшчэ з імі пагавару". З пяць крокаў яшчэ ступіла. І ўсё да аднаго немца звяртаюся, а тыя трох — ані слова. "Ці магу яшчэ падысці?" — "Ja, kommen". Я цап яго за руку, гляджу яму ў вочы, усміхаюся: "Дайце вады!" — "А як жа тую ваду вам даць? Як напаіць столькі народу?" — "Калейка! Разумееш, што такое чарга? Як пяць чалавек, то будзе дзесяць вёдзер. А калі дзесяць чалавек, то..." — "Ja, ja..." — "Кідайце сваё ружжо, ідзіце па вёдры".

Мяне паставілі ў той вадзе, а яна бяжыць, такая цёпленькая, сонца якраз з поўдня свяціла. "Ты будзеш першая, каго заб'ем, калі твае будуць уцякаць!" — "А хто тут будзе ўцякаць, калі тут сем'і, дзеці... Але ці я

іх упільную?..”

Людзі пачалі браць тую ваду. Крычыць немец: “Не піце гэтае вады, спачатку яе зварыце. Ламіце платы, раскладвайце агонь!” Усе платы палеглі. У пяці месцах распалілі агні. Людзі прынеслі маім дзецям кубачкі, хлеба, вады...

Наранку не было ні немцаў, ні вады. “Людзі, уцякайце хто куды!” — адзін вялікі крык. Мы разбегліся, адзін аднаго не бачачы. У бункеры, у разваліны.

Сядзелі мы пад якімісь трубамі. А перад намі — вайна. Пад адной сценкай — рускія байцы, пад другой — нямецкія. І за кожную адну сценку біліся. Гэта аж немагчыма расказаць! Кацюшы б’юць па мурах — бух! бух! — усё ў агні. Малы мой вельмі ж крычаў: “Дзе тата?! Дзе тата?" Занялі нас рускія, пазбіралі, уцягнулі ў якісь дом. А на трэцім паверсе — немцы. У паніцы выбегла адна жанчына. То выбяжыць, то зноў вернецца, нікога не слухае. Трэці раз выбегла, немец з акна — пах! У апошні дзень вайны загінуць... Бабы ў плач. Я выйшла, прашу таго, што з камяніцы страляў, па-нямецку: “Не трэба страляць! То ж усенька Бог бачыць! Мы ж столькі год на вас рабілі! А гэтая ж жанчына нямецкая *фраў*, і яшчэ адна тут з намі ёсць, бо мы тут усе, цывільныя, перамешаныя!” Бачу, перабег той немец доўгім акном. Кажу людзям: “Бярэце свае гаспадаркі на плечы, пойдзем. Не плачце! З намі Бог. Я з радзінаю сваёю пайду спераду”. Усе пабралі клункі, мой чалавек узяў малога... Пайшлі.

Ішлі мы з самюткага рання ў тыл. А там стаялі рускія штабы. “Ежели польский — пройдёшь, ежели русский — пропадёшь”, казалі тады. Майго чалавека ўзялі на расстрэл. Я з мамай папаўзла на каленях да тых саветаў, каб яго пакінулі пры жыцці. Пусцілі, але, кажуць, праз тры кіламетры зноў яго затрымаюць. Адзін старшына нас асцерагаў, адчайваўся: “Матка

маладая, і ты таксама такая маладзенькая, памардуюць па дарозе пад корчыкамі!”, ды правёў нас далёкаю дарогаю, каб абысці наступны пост...

Схаваліся мы ў адным бункеры. Ноччу мусіла я выйсці, не буду ж мачыць клункаў, усе людзі на падлозе спяць. Па ўсходах сышла, а тут хтосьці — топ-топ! — ходзіць. “Хто ты?” — “Руская. Але пусці мяне, мушу выйсці за патрэбай. А там мая сям’я, нас там многа, у бункеры начуем. Толькі схавай гранату, не палохай нас.” Ён увайшоў, пытаецца, дзе мая сям’я, дзе муж. Дастаў бутэлечку гарэлкі, наліў мужу. А той не хоча. Выпі, выпі, кажу майму. Клыкнуў. І сам рускі клыкнуў. І кажа: “Як будзеце праходзіць праз пасты, калі будуць цябе затрымліваць, кажы, што ты — паляк”. Так і застаўся мой муж у жывых, прыкінуўшыся палякам... Праўда, усё ж загналі яго яшчэ руіны развальваць, парадак наводзіць на развалінах. Вярнуўся дадому амаль праз паўгода пасля нас, увесь апухлы і хворы. Усё ж, жывы.

Дзве вайны пражыла, і ў хаце вытрывала, і трэба ўміраць, бо і не? Дакументы з таго часу пагубілі, сведкі паўміралі. Хто за пакуты ў Нямеччыне нейкі грош дастаў, бы можна было за такое заплаціць! Але і гэтага я не маю, бо не залатвіла. Але што мне тыя грошы, калі я сонца не бачу...

## Русалчын дом

Газьбета Вараўка ў вяночку з бярозкі, драсёну, свірэпкі і дзятлінкі на галаве ў гэты раз без хусткі сунулася па пахі ў разнатраўі. Тут касіць ніхто не збіраўся цяпер — угіналася пад нагамі, калыхалася тарпа, завешаная над тванню, смачна чвякала пад лазнікам, маладым алешнікам, што займалі ўсё больш

і нахабна нядаўныя лугі. Над дурманячымі крамянымі кветкамі і парасонікамі, над сыплючымі залатым пылком вяхоткамі ў празрыстым паветры пагойдваліся бязважкія важкі-стракозы, віселі аксамітныя матылі, у высі цурчаў жаўрук. Газьбета падняла свой карычневы ў разорах змаршчын маленькі твар да неба, доўгія травы і сцяблінЫ з павялымі ўжо лісточкамі гайдануліся, апалі на сутулую спіну ў выпалавелай ліловай сукенцы. Бледна-блакітныя, як і тое неба, вочы ўтаропіліся ў дробную кропку-птушачку, якая званіла, залівалася проста над старою, абвяшчала сваю радасць і волю. Аж праняў той моцны і далікатны свіст Газьбету да косці, скалануў, і зябкі холад пачула ў закарэлых ступаках, і рэдкія кроплі расы пакаціліся па спіне. Успомніла — поўдзень, а яна крыху паела ў Сцепанковай Золькі зусім зранння, калі тая выносіла бідоны з малаком на дарогу, недзе каля шостай — Максім Бараўскі, Андрэеў сын, унук Петрукоў з Сірочай Гары збіраў на прычэпу-балонавы конны воз якраз банкі з суседніх вёсак ды вёз у злеўню. Золька вынесла ёй у алюмініевай місачцы булён-зацірку з вялікімі вочкамі тлушчу. Суп быў добры, густы, з пакручанымі абсмажанымі кавалачкамі вэнджанай каўбасы. Газьбета ела памалу, са смакам клала ў рот счарнелую лыжку, за кожным глытком выцірала свой бяззубы рот крайком белае хустачкі з карункавымі беражкамі — адзінай рэччу, якая асталася ў Газьбеты з усяго багацця.

От, якое багацце — дом, гаспадарка, пасажны куфар з бабскім дабром, пярыны, карова. Дзеці былі ў Газьбеты, парачка, і муж някепскі, непітушчы. Добры быў чалавек “Чорны” Андрэй, разумны, гаспадарлівы, ласкавы для сямейнікаў, людскі для чужых. Але ці кожнаму дагодзіш — падклаў нейкі сучын сын, меркавалі людзі, што Разверыкаў Іван, агонь пад клуню, усё з нянавісці, і пагарэла ўсё — і жывіна, і

машыны ўсе найлепшыя ў вёсцы, і будынкі ўсянюткія датла, і малыя падушыліся, схаваўшыся ад полымя ў шафу, не дала ім ратунку абгарэлая маці, — бегала толькі пад падаючымі кроквамі, выла як звер, ледзь яе вырвалі з полымя, паўсляпую, з жывой ранай на ўсім целе... Андрэй сканаў па дарозе ў бальніцу. Як усіх хавалі ды перакопвалі папялішча, Газьбета ў псіхбальніцы ляжала, бо заматалі яе ў каптан, — зусім з сябе выходзіла, рвала бінты. Падлячылі яе, пусцілі ў людзі, не пытаючыся, куды ёй ісці. Вось так і ходзіць Газьбета па вёсках, есці просіць, а на зіму, калі хто не прыме яе дахаты, ідзе ў шпіталь або да гаспадароў, якія з бальніцы бяруць сабе памочнікаў, кормяць іх, апранаюць — вядома, такі хворы шмат у чым прыдатны, дапамагае. Абы толькі веснавое сонца выпарыць у снезе першыя праталіны, Газьбета завязвае свой клуначак, нацягвае на сябе свае чыстыя, выбеленыя сонцам апранахі і збіраецца ў дарогу.

Няма ў Газьбеты свае хаты, але колькі ж іх сёння па вёсках, гэтых хатак, у якіх няма гаспадароў! Стаяць некаторыя, як стаялі, ніхто ім ні дзвярэй, ні вокан не забівае. Толькі гаспадар ці гаспадынька не загляне на падворак, у агародчыках штовесну вылазяць былінкі, пахнуць для сябе толькі нарцысы, цвіце бэз, аддаюць шпакам свае плады чарэшні ды вішні. Калісьці як не сваякі, то суседзі, вынесшы з хаты ўсё што можна было ўзяць у прыпол ці ў спадніцу, браліся нават за печы. Цяпер самотныя хаты бліскаюць чорнымі вачніцамі на апусцелую дарогу, дзверы без замкоў нікога не запросяць, хоць, бывала, шчыра яны напаўрасчыненыя, усміхаюцца пакручанымі парогамі. Запрашалі ў сябе хаты хіба толькі Газьбету, чакалі яе доўга і цярпліва, кветкі ў чужых агародчыках прасілі пяшчоты яе руплівай далоні.

У гэту вясну затрымалася Газьбета на Лукаўскай лагчыне, будзе ў кіламетры за тры ад Зяўроўкі, над самюткім возерам. Вада заліла шэсць вёсак і чатыры

прысёлкі — народ рассеялі то па суседніх вёсках, то па мястэчках, хто перасяліўся нават у Беласток — за забраную зямлю дзяржава дала гаспадарам грошы на новае жыццё. Рэдка хто, ужо пенсіянер, хацеў будавацца, ставіць дом, усё новае заводзіць, і шмат іх пайшло жыць у блёкі. У тыя бетонныя дамы-клуні загналі некалькі вёсак адразу. Паставілі, пісалі ў газетах, тут на турызм, але на гэтым не зараблялі яны, былыя гаспадары, а прыезджыя, што панастаўлялі будак з ежай і пітвом для галодных турыстаў. Паставілі дзядзькі ды цёткі перад блёкамі лавачкі, так як калісьці ставілі кожны пад сваім плотам, пасеялі ў жоўтым пясочку мацыёлу... Газьбета наведвала ўсіх знаёмых каля гэтых блёкавых кволых агародчыкаў, разбітых на пяску, сцішаных старэчаў сярод плоймы сабак, катоў і дзяцей, якіх усіх, ад кацянят да дзіцянят, клікалі цяпер па-польску. Дзеткі, праўда, былі ветлівыя ў гэтай мясцовасці, размаўлялі з Газьбетай, хоць крыху боязна азіраліся на ейныя апранахі — безліч чыстых спадніц, кофтачак, якіх каўнерыкі акружалі доўгую худую шыю старое, расцягнутыя, пералатаныя лыжныя штаны. З Газьбетай было дзецям цікава і крыху страшна ды дзіўна. Ад Газьбеты пахла ветрам, сенам і чамусьці свежым хлебам патыхала яе карычневая, паморшчаная скура ў чырвоныя плямы, куды ўеўся быў калісьці агонь. З торбачак даставала “гасцінцы” — дзеці іх крыху баяліся браць, і частавала сабак і катоў. Яны цесным рухавым кругам клубіліся каля ног Газьбеты, ставалі на задніх лапах, заглядалі ў торбы, цалавалі твар і рукі, асцярожна бралі ў зубы пачастунак. Які сабака адыходзіў і выплёўваў скарынку, але так, каб старая не бачыла, што грэбуе сардэчным дарункам. Праводзілі Газьбету ў дарогу звяры і дзеці, вялі да асфальтавай шашы, пакуль старая босаю нагою не сходзіла на абочыну, парослую запыленым трыпутнікам і драсёнам. Тэпала далей адна памаленьку, па лясных і палявых дарожках

і сцежках, па якіх заходзіла ў адной ёй вядомыя месцы і схованкі.

Казалі Андруха Зарэцкі і Барэцкі Юлішч, што бачылі Газьбету ў шостым квартале пушчы, як маладыя ваўчкі каля яе торбаў гулялі, частавала іх, лашчыла, і вось ваўчыха падышла, абнюхала лахманы старое, палізала ёй галаву. Андруха расказваў суседзям, як на абамлелых нагах забіўся ў гушчар, а за ім плёўся збялелы Юлішч, але ўсе смяяліся — ведалі байкі абодвух; на п'яную галаву ўсё здацца можа рэальным.

— Ну, я ж Газьбету бачыў, як цябе, Коля, жывую, як ваўчанят песціць, а наўкол яе галавы было такое блакітнае святло, зусім як на іконах у святых...

— Гэта табе так ад сіненькай дзінатуры адбівалася, дый годзе! — прадаўшчыца пад бокі бралася, а Андруха аж пеніўся ад злосці, што яму не верацьь. Газьбета ўсміхалася, глядзела на Зарэчнага, адстаўляла сваю бутэльку "аранжады", брала Андруху за закарэлую далонь з паўрастанымі ў пальцы пазногцямі, ківала галавою:

— Ой, Андрэйка, хлопчыку, кінь ты піць тую поскудзь, кінь сваю красу і маладосць траціць! Ты ж такі добры, добры і відушчы, і розум твой вялікі, і шмат што мог бы ты людзям зрабіць...

— А ці я што кепскае каму раблю?! — вырываў руку Андруха з лёгкай, амаль празрыстай бабінай далоні, соўгаў яе ў кішэнь сваіх цікавых штаноў.

— Нічога не робіш, Андрушка, у тым справа...

Бегаў, бывала, за "дурной Газьбетай" табун дзяцей, рагаталі, прызываліся. Але гэта было калісь. Сённяшнія малечы насцярожана пазіралі на яе незвычайнае адзенне, заглядалі ў снапкі зелля, якое перабірала на выгане, пра тое-сёе пыталіся, з ухмылкай слухаючы яе смешную польскую мову (мала якое з іх ведала хоць пару "простых" слоў). Больш цікавіліся яе асобай гарадскія дзецi, што

летаваць у нашу аколіцу прыязджалі. Яны і прадзіраліся з "бабай Эляй" праз гушчар, лазілі па лугах, аж бацькі, павядомленыя спужанымі бабай ці дзедам, забараўнялі ім хадзіць з "tą wariatką, bo jeszcze co zrobi!"

Сёння ішла Газьбета ў Залуку. Свята хацела зрабіць, паспяваць крыху — прыехалі ў Сцяпанаву хату госці з Беластока, прывезлі і самога Сцяпана. Ён вось ездзіць па зарослым агародзе, аж каляска падскоквае па здзірванелых загонах. Рукі ў яго яшчэ дужыя, круціць імі колы каляскі, кіруе рулём, але нейкі ўжо слабы сам, чахлы, ад гарадскога, можа, жыцця, хоць, кажа, рай яму там у Януся ў Беластоку. Падыхаць старому хочацца сваім, то і прывёз яго Янусь "фіатам" на загоны. Сцяпанава хата амаль на самым беразе стаіць, і якасьці не хіліцца, бо на сухім астраўку яна, але ўсё цяжэй туды даехаць, усё больш гразка наўкол робіцца, пакінутым хатам падгніваюць падрубы, зрубы парахнеюць, асядаюць. З таго боку ўжо цвіллю нясе, смерцю. Усюды жыццё буяе, нават на могільніку тут яно, — такія там разгалістыя, шумналістыя дрэвы, галасістыя птушкі, цвыркуны і жабы — а тут быццам страх птаху збочыць, каб не засмактала яго ўспатнелая, змучаная зямля.

Сабраліся ў Сцяпана ўсе тыя, хто астаўся ў суседнім пасёлку. Янусь пакінуў бацьку разам з пачастункам — з торбамі поўнымі ежы і бутэлек, абяцаў прыехаць да змроку, бо нельга было старому аставацца ў сырасці, рвала ў касцях, адзываліся прастрэленыя ў партызанцы лёгкія. Прыйшоў Віцак з паўкіло "звычайнай" каўбасы, Гандзя Канчэўская з бутэлькаю парэчкавага віна, закаркаванай анучкаю — добрае вінцо выхадзілася, прытэпала памаленьку Люба з-за хваінкі, з лазовым кошычкам — напякла залацістых пернікаў, узяла і слоік бруснічнага варэння. На старым ровары прыкаціў касцісты Рыгор Новік, праз плячо з мяшочкам з закуссю і бутэлькай,

яшчэ з Каляд; бутэлька абівалася па Рыгоравых рабрынах, калі з натугаю націскаў на педаль хвораю нагою. Цяжка дыхаючы, ад аўтобуснага прыпынку прынёс сваё магутнае мяккае цела Яська Бэзубік, перакідаючы з рукі ў руку важкую цыраваную торбу з падзертымі ручкамі — надавала яму Анюта падарункаў для Сцяпана і ўсяе кампаніі. Паштарскі самаход падвёз Бяльчанак — Анелю ды Адэлю; яны цяпер у Гайнаўцы, усё незамужнія, але ад гарадскіх аматараў не могуць адбіцца, якраз на старыя гады!

Расклалі прыпасы пад хатай на клятчатых пледах, парэзалі хлеб, адкаркавалі бутэлькі... Хто сеў на коўбіку, хто ўладкаваўся на паваленым пянёчку, рэшта з крэктам ды стогнам пасядала на хустках і летніках. І ўставаць не хочацца, і цяжка, толькі Анеля з Адэляй бегаюць, як заўсёды лёгкія, наліваюць, падаюць ежу на лапухах...

— От, урэшце паспяваць можам што іншае, чым па пакойніку, а то ўсё... — выцерла вусны ільнянай хустачкай Гандзя, прыўстала на калені, набрала паветра ў грудзі і зацягнула:

— Песенька мая харошая, ууу! Схаваю цябе к налецейку! Да к налецейку, к Ушэсцейку. Паеду ў поле з сахою, вазьму песеньку з сабою...

Прыўстаў на сухія калені Віцак, замахнуўся каўбасою ў такт:

— Вол бушуе — вясну чуе, воран крача — сыра хоча. Воран крача — сыра хоча, дзеўка плача — замуж хоча! Не крач, воран — нажарэшся, не плач, дзеўка, — нажывешся!

Са смехам ляпнуў Віцак Газьбеце па спадніцах. Яна адняла ад паморшчаных вуснаў кавалачак хлеба, памаленьку паклала яго на лапух, устала, падпіраючыся ўсім целам на рукі:

— На граной нядзелі русалкі сядзелі. Ой, рана-рана, русалкі сядзелі. Русалкі сядзелі, на Бога глядзелі, ой, рана-рана, на Бога глядзелі. На новай сялібе пшаніца

стаяла. Ой, рана-рана, пшаніца стаяла. Пшаніца стаяла, каласком махала...

Далучыліся ўсе цёткі, зацягнулі, заглядзеліся ў бок возера вачыма быццам невідушчымі, бы ў душу вады глядзелі.

Газьбета выцягнулася, выпраставала сутулую спіну. Глядзела ў бок возера, што стальным жыватом выпучалася да бухматага неба.

Забурчэла нешта ад шашы. У бок Сцяпанавай хаты накіроўваліся бліскучыя машыны — адна легкавая і дзве высокія, з шырокімі блакітнымі дзвярамі.

— Дзевачкі ж, сястрычкі, падайце ж вадзічкі... — працягвала Газьбета, але іншыя заціхлі, з цікавасцю адвярнуліся ў бок дарогі.

— Цяжка мне стаяці, каласком махаці. Ой, рана-рана... — тоненька пяяла Газьбета, глядзела на ваду і неба, на новыя, сучасныя будынкі пасёлка, што рассеўся на другім беразе.

З машын выскачылі мужчыны ў скураных куртках, з нейкімі прыладамі ў руках. Бабулі спахапіліся, кінуліся папраўляць хусткі, мужыкі ўзяліся зашпіляць гузікі.

— О, тэлевізыя, — заўважыў Віцак. — Здымаць нас тут думаюць, старых?.. Пакажуць у тэлевізары? О, людкове...

— Няма чаго хваліцца, паказваць чужым сваю старасць! — Гандзя насунула на нос хустку.

— Гэта ж мы фальклор тут маем, можа, не? — засмяяўся Сцяпан і пакаціў сваю каляску ў бок, дзе чужыя, не пытаючыся, расстаўлялі апаратуру.

— Хто сюды іх просіць?! — сарвала з галавы свой вянок Газьбета. — Чаго ім тут трэба?! Прэч!

Газьбета падхапіла ў жменю спадніцы, пераступіла булку хлеба, што ляжала збоку на ручніку.

— Даруй мне, хлябец, — шапнула, заўважыўшы свой грэх, і накіравалася за агарод, у бок луга. Аператар з камерай на плячы пабег за ёю.

— Ой, мы былі ды ў велікім лесі, ды ізьвілі куста із шырокаго клёну, — Газьбецін голас ставаўся ўсё менш чутным з-пад Сцяпанавае хаты. — Ой, Тройца, Тройца, ды пасеем жыта, ды няхай зародзіцца...

Аператар забег Газьбеце дарогу. Адмахнулася ад яго, як ад назойлівай мухі, і цягнула далей:

— Няхай наша жыта ды ў полі буяе, ой, няхай куст наш дый па свеце гуляе!

Змоўкла, кіношнік ухапіў у аб'ектыў яе востры профіль, кавалак неба і вады, зрабіў панараму злева ўправа па возеры і вярнуўся на Сцяпанаў падворак, дзе яго калегі заўзята здымалі фальклор.

## Старэнькія

Зацялася баба Нюра: не азываецца да суседзяў, на дзень добры не адкажа, бы не чуе, а нават кульбачкай можа прыгразіць, калі хто ўжо яе міне ля лавачкі пад плотам, дзе выгравае свае старыя костачкі на сонейку.

— Можа, не бачыць? — не хочуць крыўдзіцца маладыя Іванавы. — У такім узросце акуляраў насіць не хоча...

Так, яшчэ зусім добра бачыць баба Нюра. Так, прынамсі, сама кажа. Каб вы такія вочы мелі ў свае дзевяноста два, усміхаецца, калі нявестка, таксама ўжо бабулька, пытаецца, ці костачкі выбраць з рыбы. Бо рыбу вельмі любіць баба Нюра, добра высмажаную, з цыбулькай; нічога, што жуецца цяжка штучнымі зубамі на запалых пашчэнках. Хоць крыху таго смаку пачуеш. Смак рыбы бабе Нюры нагадвае маладосць, калі лавіла рыбу ў рэчцы Омцы ў бежанстве.

Раней баба Нюра вяла свае расказы без пачатку і канца, амаль нягледзячы, хто яе слухач, і толькі пацягвала яго за рукаў, перапытвала: "Чуеш ты ці не?"

і паўтарала: “Ну, праўду кажу, так ці не?”

Цяпер і слухачоў тых менш. Тых, найлепшых, малых, як калісьці Нінка і Галінка Грыцавы былі. Яны толькі і чакалі, калі баба Нюра пакліча іх, пачне частаваць грушкамі-гнілкамі, успамінаць пра былое. Не адцягнеш, бывала, дзяўчынакваламі! А колькі тады дзетак было! Сёння, калі нават хто і падыдзе, то кажа, каб па-польску да яго гаварыць, бо бытта не разумее. А хай яе, з тою польскаю мовай бабы Нюры! На смех курам! Часам якое прыйдзе, нібы папытацца, каб упароць які жарт, каб пасмяяцца, — выманяць з бабы Нюры якое слоўца і аж за жываты трымаюцца, аж пападаюць, так рагочуць.

Але вось зацялася баба Нюра і да нікога не азываецца! І есці ёй не есца, нават улюбёныя рыба, таўканіца ды квас з гурэчнікам! І на лавачку яе не цягне... Уміраць збіраецца, ці што? Зачапіла яе была Ліда, што да сына прыехала з Беластока.

— Бабо Нюро, а што ж вы да нас не заходзіце? Пра здароўечка не пытаецеся? А як яно ў вас? Расказалі б што нам з мінулага...

— Ой, не, нябось! Не пайду я да цябе, зладзюга! Бяссовесна ты!..

Ліда стала з разяўленым ротам, не могучы слова прамовіць. А ўвечары падалася да ейнае нявесткі. Тут ізноў нарвалася на злосную бабульку.

— Што, зноў украсці прыйшла? Аддай мой сачок, што ў мяне забрала!

— Які сачок?..

— А той, маліновы. Як апошні раз ты прыязджала, я ў вас яго пакінула была. А ты яго і забрала ў той свой Беласток!

Сапраўды, быў у бабулі шыкоўны малінавага колеру жакет, прыгожы, з вялікімі гузікамі, з падушачкамі на плячах. У ім баба Нюра прэзентавалася вельмі спрытна: аж маладзела, праставалася, быццам бы і вышэла. І ў адну нядзельку бабуся, вярнуўшыся з

царквы, зайшла да Іванавых. А як сачок прапаў, ніхто і не ведае. Можа, цяля з'ела? Ёсць у Іванавага Валіка такі дурны бычок, што ўсё зжуе, сцягнуў, пэўна, той сачок з плота, ці як... А можа дзе ляжыць ён у шматах? Таго адзення поўна ў хаце...

— Хадзеце, удвозе пашукаем, — падхапіла Ліда бабу Нюру пад бок. — Тых ануч цяпер у Валіка столькі, што калі б пасля вайны іх меў, то разбагацеў бы ой-ёй-ёй!

— Табе, Лідо, то ано багацце ў галаве. Зусім самашэчча! — задыхалася ад злосці баба Нюра.

Ліда крыху супакоілася, варочаючы ў шафах, на ганку, у куфрах... Аде сачка нідзе не было.

— Цётачко, я ж яго не брала, — амаль у слязах прамовіла Ліда. — Нашто ж мне ён, у мяне таго адзення хоць прадавай, хоць раздавай... Сюды папрывозіла, пры рабоце зносіцца...

Ніхто не пераканаў бабу Нюру, што сачок мог сам па сабе прапасці. Заўзялася яшчэ больш. Ці не галодны страйк аб'явіла, наслухаўшыся ў тэлевізары пра пратэст лекараў?

— Мамо, ешце, бо ўмрэце... — палохае яе нявестка.

— Эгэ, смерць не такая страшная. Ды і пара ўжо мне, так ці не?

— Мамо, у бальніцу вас адправім, будуць вас калоць кропельніцаю...

— Ага, у Хварошчу ў псіхбальніцу хочаш мяне аддаць, як Настулю выслалі, на смерць? Сама ты туды ідзі. У мяне розуму рыхтык што трэба. Гэта вы ўсе парабіліся ненармальныя. Каб так старога чалавека абакрасці, бачыў хто такое!

І маўчыць баба Нюра з людзьмі. Толькі шчырая яна перад коцікам, што грэе яе абалелыя, пакручаныя ступакі — кладзецца на іх распрастаны, і вуркоча. Як на каціны ўзрост — і ён такі ж старэнькі, як бабка Нюра. Але не мусіць плакаць пра адзенне — ніхто ў яго не адбярэ ягонае футра, раз лінялае, раз зусім

шыкоўнае. Можа, і ён пра штосьці ўспамінае, можа, і ён наракае на болі? Але хто там мае час слухаць іх, старэнькіх!

## Свята

Цвыркун прачнуўся. Неяк горача зрабілася. Карцела паварушыць нагамі, крануць струны скрыпкі. Здавалася, сон доўжыўся, а ў тым сне, на высушаным ветрам лузе, сярод шаўковай травы і кветак, якімі ветрык калыхаў, клаўся на іх, і ўсё яму паддавалася, таму веянню і трапятанню, і Цвыркун аддаўся пяшчоце лета. Пацягнуўся, распраставаў рукі і ногі, пакратаў сваю скрыпку, пацягнуў смыком па струнах. Ой, зайграў бы хоць зараз песню ветрыку і птушкам! Адплюшчыў адно вока — ды не, сядзіць тут, у цёплым куточку ў кухні Дзеда з Бабай. Ды і не так тут і цёпла, каб вызваляцца ад сну і за скрыпачку брацца! З восені вось тут Цвыркун сядзіць, раз-пораз прабуе, ці не заснулі струны, ці не аплёў іх павучок. Баба з Дзедам і так задобра не чуюць ягоных рэпетыцыяў і канцэртаў, са змрокам хутка павячэраюць, святло ў кухні гасяць, ідуць у пакой, уключаюць тэлевізар, і доўга праз прыадчыненыя дзверы падае ў кухню блакітнае святло, нешта гудзіць і траскоча. Моцна, бывала, стараўся іх звабіць Цвыркун назад у кухню, пілікаў на скрыпачцы, аж пашчэнкі яму балелі, але глухаватыя Дзед з Бабай нават пры гэтым грукаце і выстралах на экране пачыналі падрэмваць. Аж заснуў быў урэшце Цвыркун, думаў спакойна дачакацца вясны.

А кухня ў Дзеда з Бабай такая прасторная! Выправілі ж яны ў свет шасцёра сыноў і дачак. Калісьці ўсе тут разам сядалі за гэтым сталом.

Вядома, Цвыркун не такі ўжо стары, каб памятаць той час, калі Дзед з Бабай былі маладымі, моцнымі. Ведае іх цяпер, нядужых, хоць стараюцца ўсё ж тэпаць і рабіць нешта. Поля ўжо ў іх свайго няма — зямлю чужыя ўзялі, бо дзеці яе не хацелі. Цвыркун, праўда, бачыў летам нейкіх меншых людзей на падворку, як і ва ўсёй вёсцы. Ой, небяспечная дзетварня, ледзь вырваўся са слоіка, у які злавілі яго з братам. З меншым сваім братам Цвыркун так і не пабачыўся больш... Калі пахаладзела, людзі пазачыняліся ў хатах. Забраўся і Цвыркун у хату Дзеда з Бабай. Вось так і днюе тут ды начуе, не гаруе, але і цешыцца няма чым, абы хутчэй тая вясна... Можа, удасца сям'ю завесці Цвыркуну, дзетак займець у наступнае лета, разжыцца крыху. Жыць жа трэба, род прадаўжаць... От, спаў бы сёння, ды неяк занадта прыпякае... Ці не вясна ўжо?.. І нейкая мітусня ў кухні, гоман! Такога тут хіба даўно не было! І так светла, як на лузе ў спякотны поўдзень, калі цень кароткі і дыхаць цяжка... А чаго ж яны так крычаць, пайшлі б хутчэй у пакой!

Не, сёння яна, кухня, якая карміла і паіла, вітае гасцей — даўно не бачаную дачку Галю і сына Колю з іхнімі мужам і жонкаю ды дзецьмі, таксама дарослымі, разам дзесяць душ, калі не лічыць Дзеда з Бабай, Цвыркуна і кудлатага пісклявага сабачкі, што з гасцямі прыехаў. Баба завіхалася, бегала, але чамусьці цяпер села, вочы выцірае, за грудзі хапаецца. Дзед усіх цягне ў пакой, але пакуль ім добра за гэтым сталом на тоўстых кручаных нагах. Гудзе агонь у пліце, бразгоча посуд...

Цвыркун не можа супакоіцца. Раз-пораз ірвецца рука да смыка, але ў такім гомане хто ж яго пачуе!

— Якое свята! — пляскае ў далоні Баба. — Шкада, што пост, то загулялі б...

— Які... пост? — дзівіцца зяць Аляксей. — Новы ж год праз тры дні!

— Ды не наш, Алёшка, не наш жа ён. Але сёння для

нас — найбольшае свята. Напісалі б раней, то хоць мы падрыхтаваліся б...

— Мы ўсё маем, мама, — кажа дачка Галя. — Заўтра ўсе едзем у Вену, на “Сільвестра”. Пуфіка пакінем у вас да вясны, можна? Толькі што ён, мама, бульбы не есць, сабакам бульба шкодзіць. Будзеш памятаць?

— Вядома, Галюня, сабачка ж мястовы.

Цвыркун не спаў доўга. Праўда, з кухні хутка ўсе пайшлі ў пакой, уключылі тэлевізар, гаманілі. А пасля Цвыркун іграў сыну Дзеда і Бабы, таксама ўжо немаладому. Коля доўга сядзеў за сталом у пляме святла з вулічнага ліхтара (электрычны слуп стаіць у гародчыку), падпершы галаву. Можа драмаў, можа — слухаў Цвыркуноў канцэрт? З такой думкай Цвыркун, рады добрай справе, заснуў пад печкай, падклаўшы скрыпачку пад сваю зялёную шчаку.

## Віктар, Нічыпар і Рэня

Даўно Нічыпар не спяваў. Старэнькі, з парадзелымі пёрамі, быў, так сказаць, на пенсіі ў бабы Рэні. Трымала яго, як і цюціка Віктара (малы сабачка — да старасці шчанюк), беспародзістага, з норавам і крывымі кароткімі ножкамі таксіка, аблавухага ды з пёрыстым буйным хвастом бы з іншага сабакі — як песцяць звяроў шмат хто з самотных людзей. За радню Рэні былі, за сяброў Нічыпар ды Віктар. Віктар выгульваў бабу Рэню зранку ды ўвечары, а то б сіднем сядзела ў хаце перад тэлевізарам або ў касцёле.

Віктар бадзёра, трошкі сіплавата час ад часу пабрэхваў — пільнаваў, каб ніхто не пакрыўдзіў гаспадыню ды каб хто чужы ў хату не зайшоў. А Нічыпар моўчкі падзюбваў канар, сядзеў у клетцы,

здавалася б, зусім абыякава.

Анямеў Віктар, убачыўшы на падлозе Нічыпара. Ад нечаканасці прысеў, віскнуў. Нічыпар начапурыўшы бляклае жоўтае пер'е, баявіта ступіў да сабакі, надзьмуў пёркі на шыі і адчайна закрычаў. А пасля з яго перасохлай ад страху дзюбкі палілася песня — услаўленне волі, адвагі, жыцця. Віктар гэта адчуў, і, паглядаючы на адчыненую клетку старое канарэйкі, узвыў разам з пташкай адчайна, шкадобна.

Прысутнічаў Віктар на пахаванні старога Нічыпара. З ганаровым салютам — трэскам запальнічкі бабы Рэні, што закурыла пад канец сумнай цырымоніі ў лысым ляску за блёкамі, прысеўшы на кукішкі над маленькай магілкай канарэйкі. Паклала была мёртвую птушку ў кардонку ад дзіцячых боцікаў, што знайшла на сметніцы ля супермаркета, загарнула ў латку ядвабнай тканіны ад сукенкі ў макі, што ў маладосці сабе пашыла, худое вялае цельца колеру пяску. І асыпала нябожчыка пялёсткамі вяргіні, што расце ў гародчыку пад блёкам.

Ля магілкі праходзілі штодзень, выгульваючы сябе ўзаемна, баба Рэня і сабачка. А хадзіў часам і сам Віктар. Затаптаны быў ужо копчык, але ён сваім прачулым нюхам адчуваў, дзе ляжаў Нічыпар. Бачыў яго ў сваёй кароткай памяці, як верашчыць на падлозе ваяўніча, не прымяраючы, як тыя вароны на сметніку. Не выпадала сабаку раскопваць магілку, але неяк давялося. Гнаны інстынктам паляўнічых продкаў, узрыў Віктар тое месца. Але не было там чамусьці Нічыпара... Нават кардонкі, у якой быў пахаваны.

Ад жахлівага смуроду бензіну, шмару і бруду Віктар ажно скалануўся і пабег дадому. У гэты раз з ахвотай палез у ванну, дзе яго выскрабла ды вымыла шэрым мылам баба Рэня. Яшчэ і сам дзёрся лапай, чухаў спіну, выціраўся аб дыван. Гатовы зноў быў яшчэ раз улезці ў ванну, да гаспадыні, што цяпер хлюпатала там сваім худым жылістым целам, па

самую шыю ў пене. Тая пена, што востра пахла ружай, найбольш збрыдзіла сабаку — умакнуў туды толькі лапу, абтрос і пайшоў у свой кошык.

У сне ўздрыгвалі яму лапы, варушыліся чуткія вусы, хадзіла скура на ўсім целе — снілася паляванне. Не на выбітай пляцоўцы перад блёкам, а сярод буйных кустоў, якія білі яму лістоўем у спіну, сярод дрэў, што аблівалі прахалодай. Лапы неслі яго амаль у паветры над пругкай зямлёй. А наўкола лёталі жоўтыя Нічыпары і спявалі пра волю.

## Тры вёскі, тры палоскі

Тры вёскі на ўскраіне пушчы. І не пушча яна тут, а рэдзенькі лясок з перасохлым ягаднікам, і тыя вёскі — сялібы ў пару хатак, ды і то ў большасці паўпустых, з адной-аднюсенькай цёткай ці дзядзькам і іхнім сціплым дабыткам. А наўкол — густы сасновы маладняк, які ўлез на нядаўна парослыя нізенькім жытам і пацярэбленым каларадскім жуком-стонкай бульбоўнікам палеткі; вядома — шосты клас якраз пад хваіну. Летам яшчэ ўнучкі ды праўнукі маюць рай — маслякі высыпаюцца, як град пасля летняга цёплага дажджу, але і грыбы на вачах сохнуць, точыць іх чарвяк на рэшата, не даючы дарасці нават да дзвюх цаляў. З суседняй Зяўроўкі налятае на лясок хмара раз'ятраных грыбнікоў, узброеных амаль што не ў косы, дзяруць-грабуць ігліцу, як бульдозеры, у пошуках лісічак і баравікоў, з імпэтам, вартым большай справы, збіваюць мухаморы (і той мухамор як не мухамор — куды ж падзеліся крамяныя прыгажуны ў вялікіх сочна-чырвоных капелюшах у снежна-белыя крапіны?..).

Баба Галенка яшчэ нядаўна насіла на "пункт

скупкі” зёлак то траўкі ды кару крушыны, то па кашолачцы лісічак, па кубачку чарніц “прываціжам”, каб свежы грош быў унучцы, а цяпер сабе ледзве на зіму насушыць. Дый апетыт не той, кажа бабуля, не цягне так ужо на ягадку ці на солены баравічок! Смак не такі, як калісь, чалавеку ж пад дзевяноста! І сапраўды, не так ужо цікава жывецца, як калісь, хоць і клопату менш, ано са здароўем... Нават папляткарыць няма з кім і пра што, бо са сваімі суседкамі ўжо перамылі костачкі ўсіх жывых і нябожчыкаў. Каб хоць якія маладыя былі... Пра гэтых пару маладых, што ў ваколіцы, цяжка сказаць, у якім яны ўзросце: паабрасталі як ваўкі, з гануч не вылазяць, з п’янкі не прачынаюцца! Галенчына суседка, Каця, мае трох такіх ганавічнікаў у хаце. Можа, калі б яны дзяўчатамі былі, пайшлі б у людзі. Кацiна дачка ў Беластоку ў “прадшколлі” вучыць дзяцей, кавалера мае мястовага, да таго ж маладзейшага ад сябе на сем гадоў. І вучыцца хацела, і вось з Юркам выбіраецца за мяжу. З хаты нічога не прасіла, што ж, дацягнула так да трыццаці дзевяці гадоў, але хоць свет пабачыла. А гэтыя “махамэты”... Колік хоць у арміі быў у Варшаве, траха абцёрся ў свеце (праўда, там у войску піць навучыўся, і такі нейкі жорсткі зрабіўся да бацькоў, ненавісны, быццам па іх віне жыццё яму не склалася). Адася і Косцю выкінулі з “завадовак”, вучыцца ніяк не хацелі. Косціка бацькі ад малога меркавалі пакінуць на гаспадарцы, вельмі ж цягнуўся да жывіны, да машын... Тады ў Валянцеяў былі конная жняярка і сеўнік. Цяпер вось трактар ёсць, снапавязалка, бульбакапалка, плугі. Хлопцы людзям усё паробяць, пасля сабе аруць, сеюць, збіраюць... Як на работу налягуць, то няма чаго на іх наракаць. Але ж для каго ўсё гэта астанецца! Адасю ўжо сорак пяць, Косцю — сорак два. Каця ў той век ужо бабуляй была, найстарэйшая дачка, Крысця, унучачку ёй тады нарадзіла. І вось цяпер, гляньце, меўшы пяцёра

дзяцей, Каця тую адну ўнучку і мае. А магла б жа ж і прабабкай быць!

Каця з Федзем (ва ўдовах яна ходзіць дваццаць ужо гадоў з гакам) надта ж зямлю любілі ды паважалі. Бо што ў чалавека больш добрага ды вечнага, што яму дадзена ва ўладанне на той зямлі — як не тая зямелька? Бо гэта ж не хата, нават не дзеці, а яна, вечная, што дасталася ім ад бацькоў. З каменнем, пяском, што ад стварэння свету на ёй ляжаць. Карані з яе прадзед павыдзіраў, кожную пядзю потам абліў...

Пабіта была раней тая зямля на вузкія палоскі, падзелена паміж сваякамі-суседзямі, параскіданы ўчасткі былі па ўсёй аколіцы. Каця з Федзем мелі наддаткі нават ля ўрочышча Зазулін Кут. Усюды гані каня, закідай рубель на абы дзве капіцы сена. Больш клопату, чым прыбытку. Калі чвэрць веку таму пачалася камасацыя грунтаў, перасварыла яна ўвесь народ. Нават не ведалі, што ў людзях аж столькі злосці сядзіць! Павылазілі з забыцця старыя беды і жалі, нават здавайны і бежанства, нейкія крыўды-болі стрыечных прадзедаў, забойства сабакі, украдзеная ў дваюраднага дзеда нарачоная... Сваркі і камісіі цягнуліся гадоў за дзесяць. Адзін аднаму то прыворваў мяжу, іншы зноў улазіў на свой дагледжаны чарназёмны кавалачак, то чакаў ля каменя на раздарожжы, каб палічыцца без слоў, але красамоўна. Галенчынаму Сцяпану Міхалко Саладыха са сваім шваграм Пянтохам Зарэчным пад крамай Зюні Бязносіка жывот распаролі на плоце, не лепшы раней быў, дарэчы, і Сцяпан — Міхалку штыкецінай так урэзаў, што ржавым цвіком разадраў шыю ля аорты, ледзь дух не аддаў. І, сорам сёння прызнацца старэчам, Манька Максімча, не гаварыўшы са Сцепаніхай гады чатыры, так красамоўна выказвалася на тэму сваіх да яе адосін: пасярэдзіне вулачкі задзерла сваю спадніцу ды выпнулася ў яе бок голым азадкам. У адказ і Галенка бліснула ёй сваёю

касцістай дупкай у байкавых доўгіх майтках з матузамі. Так і стаялі бабы пасярод дарогі ў заходзячым сонцы, сракамі да сябе, зацятымі тварамі ўглядаючыся ў супрацьлеглыя канцы вёскі. І дзецям сваім забаранілі былі размаўляць, але вядома, што для маладых непалады бацькоў і тым больш тая зямля, за якую старыя так грызуцца! Пайшлі дзеці ў свет, іншага шчасця шукаць.

А яны, старыя? Каму на пенсію, каму ў магілку. А зямлі той — *да панства*. А ў таго *панства*, у тае дзяржавы польскае, яе досыць. Калі ў яе няма мукі на хлеб, прывязе з-за мяжы!

У крамку дзядзькі Зюні свежы хлеб прывозяць штодзень аж з Беластока, з другога павета.

## Як Кастэнцік з Чортам за зямлю біліся

Жылі-былі Кастэнцік і Чорт, суседзі ды сваякі. Хто якім каму быў братам, дакладна невядома, бо ўся вёска настолькі каранямі пераплецена, што не дойдзеш, хто каму стрыечны дзед ці брат у сёмым калене. Выраслі Борка Кастэнцік і Зюня Кастэнцік, Чортам званы, з аднаго кораня, які потым разросся, пусціў парасткі па ўсім свеце, нават у Амерыку ды Сібір. А кожнаму патомку Кастэнцікаў, што засталіся ў ваколіцы, дастаўся кавалак зямлі. Завуць іх цяпер па-рознаму, некаторыя нават не ведаюць, што сваяком будуць суседу з заплоцця ці з канца вёскі.

Цераз плот суседзямі ёсць Борка і Зюня. Не яднае ён іх, той плот, аднак, а раздзяляе. Па-першае, невядома, на чыёй частцы ён стаіць. Борка цвердзіць, што гэта ў ягоны агарод убіў слупы Чортаў бацька, а Зюня, са свайго боку, праклінае Кастэнцікавага

продка, які нахабна ўрэзаўся на паўметра ў яго садок. У тым садку сёння гібеюць хваравітыя пакручаныя яблынькі, што вясной амаль толькі пустацвет выпускаюць, але на гмінных картах тут ад дзесяцігоддзяў красаваўся колцамі пазначаны сад. Падобна і дарога, абапал якое ляжыць вёска, даўно на краёвых дарожных мапах — чысты асфальт, а не разбітая жвіроўка, абляпаная па баках каровінымі блінамі. Дарога тая ўжо даўно змяніла сваё рэчышча ад таго часу, як засноўвалася вёска, калі абселі яе маленькія хаткі Кастэнцікаў, што, выйшаўшы з пушчы, узяўшы грош за скуры і мёд ды руду, купілі былі той кавалак зямлі. Тут яны досыць хутка ўзбагацелі настолькі, што панамі сябе адчуваюць — у бежанства адправіла іх гісторыя саліднымі гаспадарамі, якія мелі што шкадаваць, беручы ў далёкую невядомую вандроўку жменю дабытку. Кінулі тады ўсё — ад ладнага сасновага бору, меданосных пукатых вулляў, амаль выработленага поля (можна было яшчэ і ў пятнаццатым капаць лучыну на палетках) да маладых садкоў, ставаў, добрых пашаў на грудах пасярод дрыгвяністых балот, за якімі сядзелі галадранцы-басінцы, якія не ўмелі плуг трымаць, то і ў галечы жылі. Было што кідаць, і старыя мужыкі без аглядкі, каб не плакаць, пайшлі на ўсход, галасілі і маліліся бабы, выносячы іконы.

Вярнуўся Боркаў бацька Федарко Кастэнцік на ўдзірванелае поле і збітыя былыя сенажаці. Курэў быльнёг, дыміла ваколіца знаёмым пахам гарэлага стэпу. Боркаў бацька вярнуўся з касавокай маладзіцай, нізенькай ды худзенькай, як трэсачка. Памерла шырокаскулая худзёба, Лінай яе звалі, нарадзіўшы дужманага хлопчыка. Борка з маткі ўзяў худэчу і чорны цвёрды волас, што дыбіцца над нізкім лобам.

У той жа год, дваццаць чацвёрты, нарадзіліся Борка і Зюня. Зюня, як казалі, “на заказ”, — прыйшлося

Анопу Кастэнціку-Чорту, багацею ўжо толькі ва ўспамінах, цяпер голаму, як бізун, узяць у нявесткі дачку-перастарку Данілы Місюка з Басіна. Гэлька з Самары з бацькам вярнулася, у стэпе пахавалі матку (тыф яе забіў, як даканаў шмат іншых нашых людзей), выдзерлі з каранямі лазу ды бярэзнік, што ўварваліся на іхні палетак, выбралі камяні. На Місюковым кавалачку казе не сесці, а радзіў ён толькі свірэпу ды пырэй. Гэлька ў бацьку свайго Данілу не ўдалася, спакойная, ціхая, за сваё біцца не ўмела, але стары, убачыўшы яе з пукатым жыватом, што сарамліва хавала, сціскала хусткамі, схапіў сякеру і папёр да Кастэнцікаў, ляснуў дзвярыма, тваю маць! Мае браць, калі зганьбіў, але ў пасагу поля свайго — не, Даніла не дасць! А каму ж даваць? Дачцэ, якая толькі і вартая, што пойдзе чужым быць за няньку ды парабчанку? Колькі таго жыцця, што сам Даніла, уцёкшы ад смерці, у свае пяцьдзесят гадоў можа ўзяць (незадоўга пасля Гэльчынага вяселля з Анопавым сынам згуляў і сваё, пабраўся з бяздзетнай удавой з хутара Мокрага; яе чацвёра дзетак у адзін год мор быў забраў).

У трыццаць дзевятым Борка і Зюня былі замаладыя, каб іх пабралі ў Савецкую Армію, што ўвайшла на Беласточчыну. Аноп зноў паехаў стэп асвойваць. Хлопцы трапілі пад Кёнігсберг, служыць вялікай Германіі ў бауэра. Борка збег, злавілі яго ўжо пад Бельскам. Аж у Аўстрыі ў лагеры застала яго свабода. Вярнуўся не той хлопец — сівавалосы, бяззубы, з пераедзенымі цынгой дзёснамі. Зубы сабе Борка справіў амаль праз дваццаць гадоў, як у вёсцы стаў працаваць “асяродак здароўя” і апынуўся ў ім на паўгода зубны ўрач. Да таго часу Борку не перашкаджаў гэты недахоп — ажаніўся з харошай дзеўкай, нажыў чацвёра дзяцей, паставіў на ногі гаспадарку, упарта не аддаючы яе пад “калхоз” (што на вачах вырас, загробшы некаторыя гаспадаркі, і

памёр натуральнай смерцю). Адно Борку заядала — у Зюні быццам усё ішло лепш! У ягоным садзе даспявалі чамусьці больш крамяныя яблыкі, у цяпліцы-шклярні хутчэй чырванеюць памідоры... Каровы лепш выцельваліся, тлусцейшыя свінні рохкалі ў хляве, не так каларадскі жук-стонка бульбу глуміў, жонка Зюнева была харошча, з круглейшымі сцёгнамі... І, гад, з паўметра ўрэзаўся ў Боркаў панадворак, во як гэты плот стаіць! Да вайны плецены з голля той плот быў, во тут ровар сам Федарко закапаў, каб ён акупанту не дастаўся. Ліпа расце тутака, сам няхай кожны гляне. І на карце тут яшчэ значыцца агарод, а не дурныя Зюневы парэчкі! Ой, нямала грошай выдалі сваякі, Борка ды Зюня, на суды, даказваючы, хто мае рацыю і за кім сапраўдная праўда.

Самі яны ўжо засталіся са сваім плотам. Абое на пенсіі, здалі дзяржаве свае гаспадаркі. А для чаго так біліся? Каб справядлівасць была, каб сваіх дзяцей не пакрыўдзіць, каб нічога не страціць з бацькоўскае спадчыны, з таго, да чаго вярталіся з далёкага свету. Боркавы дзеці нават у Польшчы не жывуць — дачка ў Францыі, сын у Канадзе, другі сын ад нядаўна ў Нямеччыне, малодшая дачка за венгерца пайшла. Зюнеў сын Коля ў Варшаве інжынерам, падземныя шляхі будуе, яму бацькоўская хата не была і не будзе патрэбна, нават летам не загляне, унучкаў дзеду не прывязе; Зюнева дачка ў Нямеччыне малых немчыкаў няньчыць, сваіх малых у Беластоку мужу на выхаванне пакінуўшы, грошы зарабляе.

Не змагла Кастэнцікаў Федарковых і Чортавых ні калектывізацыя, ні камасацыя, ні меліярацыя ды іншыя агітацыі ды “рацыі”. Сядзяць цяпер абое кожны на сваім кавалачку, які “належыцца” таму, хто аддаў за ласкавы грош зямлю дзяржаве, і дамагаюцца адзін з другім свае справядлівасці.

А Пушча, якую іхнія дзяды і прадзеды хацелі пад

свой бот узяць, памаленьку на іх ідзе: спачатку высылае страж — лазу, альшыну, бярозу, потым ідуць хвойка з ялінай... Крок за крокам лес падступае да пахілага плота.

## Смерць і Волька

Ішоў цёплы дождж, святочны і светлы. Волька рыхтавалася да смерці.

У яе доміку "на чвараках" стаяла гуллівая ціш. Але ці тут калі ціха бывала? Да пушчы — рукой падаць, а між хатамі, якія неўзабаве чакае сякера, бо "блёкі" тут будуць ставіць, і стройным чыстым лесам з могільнікам наперадзе — шаша, па якой сёння з мусу павальней сунуцца аўтамашыны з турыстамі. А ля кожнага драўлянага доміка, дбала збітага калісьці з "фабрычных" дошак — агароды. Чаго тут людзі ні сеюць! Над градамі гуркоў, памідораў, капусты, кабачкоў, буйнымі кветкамі маку — высокія парасоны кропу, які, нагрэты сонцам і прапаласканы дажджом, разам з пахам лісця парэчак, гурэчніку і квецця шчыльна запаўняе гэты кавалачак фабрычнага горада, уціскаецца цераз адчыненае акно Вольчынага пакоя.

У Волькі адно што з усяго жыцця добры нюх астаўся. Заплюшчыць сухія вочы, уцягвае ў ноздры пах нядзельнага спакойнага дажджу, які ў сваёй макраце і далікатнасці ўсюды такі — ласкавы, пяшчотны, чысты. Прыгожы. А Вольчыны вочы разам з яе былою красою выцвілі ў Сібіры, у партызанцы, у працавітыя будні ў Белавежскай пушчы, у полі, на фабрыцы, у начныя варты пад фабрыкай, пры дзецях. Мужыкоў пахавала двох. Нажылася.

Была калісь Волька харошая! Не адзін афіцэр ёй гэта казаў, не адзін настаўнік ці партыец. Каб за

такога якога пайшла, то паняй была б, бяды б не ведала. На картачку глянеш — толькі ў фільме паказвай. А ёй добрыя каб вельмі мужыкі трапіліся, то не. Ды дзе цяпер добрага чалавека знойдзеш! Возьмеш харошага — не ўпільнуеш. А сама ты прыгажуня — то зараз цябе прыставіць да каго хоча. Мусіць і за тое білі чалавекі Вольку, што гожая, і за ўсё яе білі. За тое, што добрая. Бо дабрыні яе не бачылі, шчырасці. Нічога ў свеце не бачылі за работай і гарэлкай.

Расклала Волька на стале карты. Села бокам да труны, каб лепш бачыць: паставіла яе пасярод пакоя, абставіла вазонамі, букетамі кветак у слоіках. На крэсла павесіла сукенку, якую была купіла сабе на смерць, панчохі, хустачку, пад крэслам — роўненька блiскалі туфелькі. Цеснаватыя яны ўжо крыху, — ад таго часу, як купіла іх у "Стадоле", сталі ногі Вольцы моцна пухнуць. Але хадзіць яшчэ можна, ды куды там на тым свеце хадзіці будзеш; абы з фасонам туды трапіць... Хэ-хэ-хэ, усміхаецца да сябе старая.

Адклала Волька на хвіліну карты. Падышла да крэсла, узяла ў далоні боцікі, хукнула на бліскучую скуру. Абуваліся цяжка, прыйшлося пяткі ўціскаць лыжкай. Нацягнула сукенку, ссунуўшы долам спадніцу. Прайшлася па пакоі, па-святочнаму акуратна прыбраным, заглянула ў кухню, у якой на стале пад цэлафанам стаіліся пірагі і булка хлеба на белым абрусе. Адчыніла халадзільнік — за ўсю пенсію накупіла вяндліны, кілбас, гарэлкі, віна для кабет. Выцягнула паўлітэрку, пагладзіла яе па халодным стане, які хутка пакрыўся расою. Волька здрыганулася ад халадку, які прабег па спіне — ці не смерць гэта ідзе ў госці?.. Вып'юць людзі добрае гарэліцы на мярлінах, не "Раялу" ж дасць, паўспамінаюць добрым словам... Волька, калі магла хадзіць, праводзіла ўсіх памерлых, якіх ведала і не ведала, плакала па іх, шкадавала іхняга жыцця, але

ўсё больш лічыла гэта толькі расстаннем; прыходзілі да яе ў сне, прыгожыя і маладыя, і клала ім карты, як калісьці. А клаліся ім не трэфы і не віно, а жывыя чырвоныя бубны, а найбольш іх, сэрцаў, што весцяць любоў, ласку, шчасце... Якасьці не страшна было Вольцы ісці туды, да іх, на сустрэчу з невядомым.

Боцікі крыху расхадзіліся. Не распранаючыся, Волька села за стол. Раскінула пасьянс. Карты клаліся паслухмяна, лёгка, быццам толькі іх купілі ў краме, бліскуючыя ад лаку, — зусім не тыя, якімі прадказвала калісьці Волька будучыню людзям з ваколіцы Гайнаўкі. Праўду казала дзеўкам! "Ты замуж за яго не пойдзеш, не-не! Будзеш за чарнявым." Дзеўка была з нарачоным, тыдні тры да шлюбу, мала вачэй не выдзерла ўпартай варажбітцы. Праз паўгода прыехала з кветкамі, прасіла прабачэння — было яно ўсё так, як прадбачыла старая. А Волька, папраўдзе, і ў карты тады не глядзела.

Засвяціла сонейка, кінула рухомае павуцінне промняў цераз фіранку на труну. Волька роўненька склала карты ў стосік.

Падставіла ўслончык, каб выгадней было, і ўскараскалася на труну. Дамавіна трывала стаяла на табурэтках. Волька папраўіла сукенку на каленях, паварушыла падушачку, запаліла свечку і ўмасцілася, як у калыску. Склала рукі на грудзях. "Цікава, як гэта збоку глядзіцца?" — падумала. Было так, як павінна, каб з гонарам, акуратна, па-людску, каб добра ўсё было. Памалілася і заснула, закалыханая ціхім пошумам далёкага, хоць і блізкага, гораду.

У гэты дзень Волька не памерла, хоць праз гадзіну суседка Ганна з крыкам панесла навіну па "чвараках" і па ўсіх суседніх блёках. Адышла праз тыдзень, і правялі яе чужыя людзі, паводле ейнага сцэнарыя, на той, лепшы бок свету.

# Вёска

Над Вёскай, над маладым лесам павіслі пярыністыя хмары колеру дзінатуры. Сонца, гняўлівае і бездапаможнае, што хіліцца ўжо на захад, валілася за гарызонт трапяткім цяжкім колам, кідала прамень у фіялетавую гушчу. Зубасты лес клаў свой цень на палову Вёскі. Ногі Дзямяна трывалі нерухома ў пяску, што стыў і ўбіраў сырасць, заглыбляліся ў прахалодны цень, і морак ішоў да Дзямянавых старых касцей, скрадаўся да сэрца, якое адчуваў у нутры моцна: вось тахкае, прытамляецца, потым зрываецца зноў, як разбуджаная птушка на досвітку. Ногі хацелі ісці ў той фіялет, тую чырвань, рваліся ўперад, але Дзямянавы плечы хіліліся да штыкецін старога плота, абымшэлых, аблітых ружовасцю і цёплым золатам.

Вёска маўчала. Гэтая Вёска маўчала. Не рыпаў асвер-жораў, не бразгатала вядро на калаўроце. Маўчалі людзі і сабакі, не было іх. Не іржаў ніводзін конь, хоць бронзавы цень Лысага, здаецца, прабег, як памяць, за агародамі. Нёсся з таго боку пах гурэчніку і кропу, задушаных у абдымках лебяды, драсёну, асоту і крапівы.

Засакатала курка Рудка, годна высунулася з лапухоў — рада з яечка. А другая, надзьмута-пухкая, квохкаючы, памалу вывела з-пад куста парэчак, вывела сваіх байстручкоў, крадком выседжаных, уцалелых, дагледжаных. Пакуль лета, курка Чапурка мае іх чым карміць, хоць гаспадыні ўжо няма. Не ведае квактуха, што яе дзеткі неўзабаве зложаць свае галоўкі, ледзь аскубаныя, недаваранымя-недапечаныя. Яна — маці, ёй добра, яна бароніць і корміць, і што ёй Вёска, што ёй іншы свет... Яшчэ не адзічэла, дасца падысці Жорку з сінім носам. Ён быццам накрышыць ёй хлеба, вытрасаючы нейкую патраху з кішэні навідавоку: “ціп-ціп-ціп, цю-цю-цю”. Чапурка кінецца

бегма на пачастунак, а за ёю ейныя падпеўнікі ўжо, падкурачкі; колькі з кожнага з іх будзе закусі — што з галубка... Жорку ўжо смяюцца вочы! Дзямяну што тая курка і яе вывадак — і так заўтра едзе ў Дом. Да Жоркі сёння прыйдзе, пачастуецца курацінкай, выбярэ маладое мяска, на старыя зубы...

З суседняй вёскі чутно яшчэ жывое.

## Хата з краю

Дом Лявона Квяткоўскага стаіць на ўскраіне ўжо дужманай хваіны. Лес падступіў пад ягоны (цяпер сынаў) хутар шчыльнай сцяною. Хата велізарная, у дзве паловы, на каменным падмурку, з цэментавымі ўсходамі, з двума ганкамі. Пабудаваў яе быў Квяткоўскі ў 1956 годзе саліднай, каб памясціла ўсю сям'ю. Бо дзяцей меў, бы таго гароху — дванаццацёра, з тых, што жылі. А Ганна, жонка ягоная, бачылася ўсё або з жыватом, або з дзіцёнкам пры грудзях. А колькі іх маленькімі пахавалі! А і няпорныя былі... Нарадзіла яшчэ ў сорак шэсць гадоў, быўшы бабуляй. Пахаваў Ганну Лявон у 1975 годзе. Да канца рабіла, ужо моцна хворая, не аглядалася на наймалодшую нявестку, Зоську. Зоська не вельмі была даспадобы старым, нейкая такая няласкавая, жорсткая. Злосная, быццам лёс ёй не ўдаўся. Але што зробіш, добра і так, што Стась знайшоў сабе дзяўчыну, і то нябрыдкую, а то бабылём астаўся б, і што пасля сябе пакінеш на тым свеце?..

Зоська скаланула была Стася: трэба нам новы дом, абавязкова мураванка, з вадой гарачай і цэнтральным ацяпленнем. Стары пакрыўдзіўся: то ж гатова стаіць хата, як звон, ні шашаль яе точыць, ні грыб! Можна яе і атынкаваць, і ашаляваць, краны ж ёсць, бойлер на

гарачую ваду можна ўставіць, а печы ёсць — калі мароз, то ж лесу столькі, маладняк церабіць трэба... Месца, о, колькі ў хаце, пакоі вялізныя, нарадзі ты таксама тузін, і памесціш усіх... Але Стась заўзяўся. І паставілі мураванку ў два паверхі, нават падстрэшак вышыкавалі, і парабілі ўсё, мэбляю абставілі. Не горш, чым у месце. Сёння было б гэта хіба немагчыма, але гэта было яшчэ за першага сакратара Герка...

— Ойцец, рэнту мае і час, то няхай сам сабе купляе, — звярнулася была Зоська да цесця. — Найвышай дам яму сырадою. А памыць нех укіне ў пральку, улончыць умее.

Праўда, тады стары мог сёе-тое пры сабе зрабіць. Але колькі ж можна сядзець у хаце, чытаць кнігі і газету... Тэлевізар нават папсаваўся...

— Не лазі лепш у вёске, яшчэ дзе заслабне, — папракала яго Зоська. — А калі ўбачу, што зноў выпіўшы, то і гаварыць не буду!

— Ды не піў я гарэлкі, гэта лякарства так патыхае, — мямліў Лявон бяззубым ротам, — пратэзу згубіў у рове ля абочыны шашы, мацаў, лазіў, шукаў ды і не знайшоў...

Зімой паліў толькі на кухні, якая стала і спальняй, і сталоўкай. Не змог адзін уставіць дубальтовых вокан. Стасю нічога не казаў — столькі работы ў сына! Купіў ён трактар, машыны, усё лета і восень рабіў на сваім і чужым, цяпер у лесе гаруе, вяртаецца ўпрыцемках. Папраўдзе бацька рэдка яго і бачыў. Зоська раз прышле малога з малаком, раз не... Сама не прыходзіць, не пытаецца, чаго старому трэба...

Цяжка было разагнуць Лявона Квяткоўскага, каб памыць, адзець у чыстае і пакласці ў труну. Заснуў навекі, як сядзеў за сталом. На бруднай цыраце ляжалі сухі кавалачак хлеба, пакусаны мышамі, Евангелле і нераспакаваная з бандэролі "Gazeta Białostocka" (па ёй пазналі, калі памёр). Прасядзеў так нябожчык

тыдзень, пры запаленай лямпе, углядаючыся ў шыбы, зарослыя марознымі кветкамі.

Хавалі яго цяжка. Мужыкі ледзь аддзяўблі зямлю на магілку, акалелі. У царкве ўсе калаціліся, мерзлі, а пара ўздымалася аж пад панікадзіла.

Лявонаў дом стаіць і сёння, яшчэ пусты. Зоська мае намер яго наймаць турыстам — усё парабіла ў ім, як у шклянцы. Абабілі яго белай шведскай бляхай — аж слепіць вочы! І які помнік бацьку ўзвялі — граніт, залатыя літары, верш. Ад усіх дзяцей з сем'ямі.

## Адпачывайце, бабо!

У такім узросце адпачываць ужо толькі пара. Глядзець на ўнукаў, цешыцца пагодай і грашыма з пенсіі. Бо на здароўе не наракае баба Зулька, хоць дажыла 79 гадоў. Толькі вось давялося ехаць, хай яе ліха, са сляпою кішкаю ў шпіталь. Доктар крыху баяўся, што не зажыве хутка, але баба Зулька худзенькая, лёгкая, тлушчу на ёй няшмат, то і хутка паднялася са шпітальнай пасцелі.

Дахаты паехала адна. Праўда, заглядала была да яе ў палату беластоцкая дачка Марыся, але ў дзень выпіскі ніхто не прыйшоў, і бабуля, распытаўшы людзей, дзе вакзал, памаленьку патэпала да аўтобуса. У дарозе крыху трасло, балела ў баку, але веснавое сонейка свяціла лагодна праз шыбу на бабіну галаву ў квяцістай хустцы, і яна задрамала, не заўважыла, як аўтобус падкаціў амаль пад яе мураванку.

У гэтай мураванцы, што будавалі з сынам і нябожчыкам Зюткам на дзве сем'і, бо для сына і старых, займае баба Зулька цяпер адзін вялікі пакой. Калісьці старыя жылі за сцяноўкай, якая штодзень грэлася ад кухні, і зімой было там вельмі цёпла, а

летам — то хоць спячыся. Цяпер бабе выдзелілі асобны пакой, паставілі электрычную плітку, зляпілі кафлёвую печ: вары, баба, сабе, што хочаш, за рэнту купляй, што хочаш, дровы сабе загатаўляй, плаці, колькі трэба, і за тое, што табе наколюць. Грошы маеш свае. Адпачывай, за жыццё нарабілася.

— Ад тае ляноты здурэць можна, — уздыхае баба Зулька, зусім не лянівая. — Кавалачак агарода маю, але колькі тае з ім работы! Хочацца зачапіць за штолень рукі. Выйшла было з граблямі, думаю, паварочаю сынава сена, праветруся, пагрэю на сонцы плечы. А сынавая бяжыць: "Вы, кідайце граблі, ідзіце дахаты! Не рабеце! Хто вас просіць!? Нічога вашага не хочам, і не чакайце ад нас помачы. Маеце рэнту, то жывеце, як вам падабаецца, і нам таксама дайце!"

Добра, што Зульчын Пеця ажаніўся, дзеўку знайшоў на гаспадарку. І працуе Аня, і дзяцей нарадзіла. Чыстая, гжэчная, у царкву ходзіць. У хаце, як у шклянцы. Суседзі таксама хваляць. І Зулька не наракае — дбае нявестка пра Пецю, пра дзяцей. І дзеткі харошыя, добра вучацца. "Дзень добры" бабе скажуць. Толькі што да бабы бацькі іх не пускаюць, а старой хочацца прытуліць малое, даць які гасцінец...

— Каб малыя не заміналі мне, кажуць. І каб я з імі па-просту не гаварыла, каб мовы ім не памяшаліся. А я ж і па-польску ўмею, калі трэба. Няўжо баяцца, што я "змарную" ўласных унукаў, і ў школе з іх смяяцца будуць? У вясковай школе "простая" мова такая ўжо смешная стала?..

І сядзіць баба Зулька ў сваёй хаце. Халодныя тынкаваныя сцены абвешала макаткамі, маляванымі і тканымі дыванамі, падлогу пазасцілала палавікамі, цёплымі, каляровымі, што сама выткала са шматкоў адзення, яшчэ калі больш дужая была. Каб толькі ў хаце цяплей, больш утульна было. І, праўда, чысценька ў яе, прыемна. Спакойна. І тэлевізар каляровы купіў ёй ольштынскі сын. Не выходзячы з

хаты, бачыш увесь свет: рэвалюцыі, войны, моры, землятрусы паказваюць — вось людзі бяду маюць! Канец свету, здаецца, блізкі ўжо стаў. З голаду мруць людзі, ад куляў!

— Абы ў нас мір быў. А жыць у нас якасьці можна. Во да чаго людзі ў вёсцы дажыліся...

## Хата

Стаяла хата Соньчына пустая. Як памерлая. Адно кветкі паверыць не хацелі, што гаспадыня пакінула дабытак, лезлі ў вокны з гародчыка — чырвоныя, жоўтыя, ліловыя, сінія, белыя, распіхаліся сярод лебяды і малачаю. Вядома, — быліны, украніліся тут ад пару дзесяткаў гадоў, а касачы цвёрдым валам каранёў аплялі падмурак ад самага пачатку, як ставілі хату. А Сонька з'ехала да ўнучкі ў горад. Добра, што мае пры кім свой век дажываць — то ж ёй чуць не дзевяноста! Праўнукі, праўда, ужо вялікія, адзін нават у ліцэі, не трэба памагаць іх гадаваць, але свой куток знайшоўся. Бо ў дачок Соньчыных — адны беды: хваробы, мужыкі нядобрыя, старая ім замінае; пабыла ў Зіны, зяць вось на кухню не пускае, калі сам есці сядзе. Сварацца зяці, а і Сонька на тое язык у роце мае, каб сваё сказаць. Адбрэшацца, як трэба. Увогуле ў Вёсцы кабеты таленавітыя на слова.

Ну, калі нават і былі калі якія сваркі між кабетамі ў Вёсцы, то ўсё забыта, даравана. Развіталіся былі ўдавіцы з сяброўкай, адправілі ў Беласток, паціху зайздросцячы. Бо тут і крамы, вось, няма, і да лекара ўзімку пакуль у гміну даедзеш! Стары ж сам чалавек, ледзь ногі валачэш. Ганулля во кончылася, не дачакаўшы "хуткай" дапамогі: дыспетчарка ў Беластоку палічыла, што не варта машыну гнаць

такую дарогу да старэчы. Калі на жыццё — то выжыве. А хату пакінула Сонька пад добры нагляд жывучым суседкам. Ды што там і сцягнеш, такое багацце!

Але вось паявілася ў хаце гаспадыня! Маладая, з дзіцяткам — наняла Соньчыну хату сям'я з далёкае пушчанскае вёскі; мужу бліжай на працу ў мястэчка. Прыехала ў гэтае лета Сонька пабачыць, што там у сяле робіцца, магілкі наведаць, а суседка найбліжэйшая бокам яе абыходзіць, не азываецца.

— Ты што, Любо, на мяне бочышся? — падсела да яе на лавачку госця.

— Ты нашто хату сваю наняла?! — злосна глянула на Соньку Люба Паўліха.

— А што мела пуставаць... І грош невялікі будзе, пійсят злотаў у месяц. І зімою апаляць, не будзе стыла. А то грыб вылез у кухні на сцяне... Добра, што яны якраз маю хатку ўпадабалі, ды яшчэ з дзіцяткам... Як добра! Не мела яна, мая хатка, ужо надзеі няньчыць малое.... А ты чаму злосная на мяне? Здаецца, суседзі з іх добрыя, дый з маладымі весялей...

— А не лепш было маю Ірку зноў на лета туды ўпусціць?

Змаўчала Сонька. Крыўдна, бачыш, суседцы: дарам дагэтуль пускалі, нічога не казалі на паламаныя кусты парэчак, паабіваныя яблыні, засыпаную смеццем студню, загаджаны чужымі гусьмі падворак... А тут на яшчэ раптам: пяцьдзесят злотых кожны месяц, і за святло заплацяць... Куды ёй, Соньцы, гэты грош патрэбен? То ж нават ужо помнік сабе пры жыцці паставіла на местачковых могліцах, з партрэтам. Колькі да шчасця ёй яшчэ трэба?!

Паедуць Любіны мястовыя ўнукі пад восень дадому. Апусцее ўся Вёска, змоўкне. А ў Соньчынай старой хаце расце яшчэ адзін малы.

# Сасанна

Баба Сасанна ўжо гадоў пятнаццаць сядзіць у блёку. Дастала двухпакаёўку за работу ў будаўнічакватэрным кааператыве. Бо раней жыла, гаспадарыла на хутары пад Гадышэвам. Пасля, кінуўшы ўсё, бо дзеці пайшлі вучыцца, перасялілася ў Беласток. Рабіць, каб дарабіць да пенсіі. А на вёсцы... О-го, якая ў яе была гаспадарка! Коні, як лялькі, кароўкі малочныя, свіней поўны хлеў. Ды як жыць з такім мужыком — зусім як парабак у гаспадарцы: скажаш падмяці ток, то падмяце, ідзі паары — то выарэ як пападзе... Ніякага дагляду не меў Антоні да тае гаспадаркі, ано бег бы пад склеп. Выцягне з каморы кумпяк, паляндвіцу, урэжа добры кавал, або і цэлае забярэ, прэ пад краму, там ужо адзін мае вішнёўку, іншы віно, трэці які буталь "экспартнага" спірту, Антоні — тую закусь, і маюць баль. А ты, кабета, рабі! А дапусціш яго да каня ці каровы — жывёла шарахаецца, вішчыць, не слухае гаспадара — то ж б'е таго канягу, як у мех, за тое, што не слухаецца. Жарэбчыка так напалохаў, збіўшы, што той пайшоў па падворках, па агародах чужых — не дагнаць, не ўпрасіць, каб вярнуўся. Конь — жывёла далікатная, крыўдлівая. Выйшла Сасанка, клікнула: "Бобік, Бобічак... Хадзі да мяне..." Падбег конік да гаспадыні, заіржаў. "Як ты, Сасанка, будзеш яго браць, без уздэчкі, без кантара?.." Жанчына ўшчыкнула ў руку пару валосін з конскай грывы, і павяла радага Бобіка дахаты. А ўпусціць таго яе Антоняга ў хлеў! Пару тыдняў Сасанка хворая была, то ў той хлеў не было як улезці. Гною не разгроб, стаяць каровы пысамі ўніз, зады на горбах адходаў, а дзверы дык ледзь адчыніла — так той гной іх аброс. А то ж трэба дагледзець, добра ўсё разгарнуць, падаслаць каровіне...

У Сасанчынай гаспадарцы ўсім было добра. Хіба толькі мышам не — тры тлустыя, укормленыя свежым малаком коткі спраўляліся з імі аж надта: кожны ранак за гумном ляжала горба падушаных грызуноў. Бо звер умее аддзячыць. Звер — пад Божай апекай. І грэх такому брыду рабіць, бо не дасць Тварэц пакрыўдзіць бездапаможнага. Так як і сама Сасанка, — ёй жа, калі слепла, перад аперацыяй, Маці Божая паказалася, у Сасанчынай кватэры ў Беластоку. Вось тут, над парэнчай фатэля з'явілася, паміж выявай Сына і Яе, Гадышэўскай, што на блёкавай сцяне павешаны, і голасам далікатным, цененькім, прамовіла да Сасанкі: "Не бойся, усё добра будзе!" І пайшла Сасанка без страху, і аперацыя ўдалася, і бачыць вось добра. А тады, калі Хрыстафора нараджала, таксама Маці Ласкавая яе ўратавала. Бо ніц, казалі дахтары, і з яе не было б, і з малога. Махнулі на іх рукамі. Дзіцяня шчыпцамі вывалакалі з лона. А і яна жывая, і ў сына ўжо сваіх дзяцей трое. А ўбачыла медсястра тады ў шпітальнай пасцелі медалік з Багародзіцай, і са слязамі прамовіла: "Пані Сасанна, сына свайго Маці Божай ахвяруйце, і калі вырасце, няхай заручыцца адпаведную ахвяру дасць, і на каленях вакол алтар у гэтым святым месцы абыдзе". Так з Хрыстафорам яшчэ раз было, як то яго машыну збілі. І тады Сасанка паручыла яго апецы Ласкавай Маці, і ахвяраваўся сам, і занёс дар, і абышоў гадышэўскі алтар, праўда, не на каленях, бо не мог, і адразу паправіўся, хоць дахтары ўжо невялікую давалі яму надзею, каб выжыў...

А Сасанка... Праўда, стараецца жыць без граху, каб злым словам ні чынам каго не пакрыўдзіць. І ўсё жыццё так. У Сібір яе прыехалі, маладую, забраць, дык тыдзень у канаплях сядзела, не піўшы, не еўшы. Немцы ўвайшлі, дык выйсці адтуль магла. Пытаюцца: "Хто вас, сям'ю гаёвага, вывезці хацеў, хто спіскі састаўляў на вывозку, хто даносіў?.." Ды Сасанка

нічога не сказала, хоць пасля дастала добра ў скуру. Бо як жа выдасць свайго суседа, у яго ж чацвёра малых дзяцей! Ні немцы, ні хто іншы не пастаўлены Богам, каб караць. Ён адпомсціць, Ён адплаціць! І не адчувае Сасанка на сябе граху за тое, што хтосьці праз яе загінуў.Але хоць стараецца не грашыць, ды кожны тыдзень спавядацца ідзе, прычасце прымае. Ніколі невядома, калі што з чалавекам здарыцца можа. Бачыць з акна свайго блёку, з балкона, што павісае над цэнтральнымі вуліцамі Беластока, над патройным скрыжаваннем, як штодзень штосьці страшнае дзеецца. Ну, у людзей бы д'ябал уступіў! Не азіраюцца, пруць на сваю бяду, як сляпыя, на сваіх машынах (і п'яных колькі!), пешаходы лезуць, бы нічога не бачаць... У кожнага ў галаве муць, страх, прага нажывы... А іншы думае, адкуль узяць на кавалак хлеба, каб дзеткам даць. А бываюць такія гаўнаеды, як у яе ў былой вёсцы, што за страву б'юцца пры сямейнай місцы, скрабуць гаршкі, замест тых пару бульбін больш укінуць, жменю крупы, каб і хатнім хапіла, і коціку, і сабаку каб не палову са свіной бульбай ляпнуць, а ўкінуць таго, што і сам ясі... Тую бульбу ці лыжку кашы акрасіць і ім малаком ці скваркай... Пакінула была Сасанка, адыходзячы з вёскі, свайго Бурку, гладкага і разумнага аўчара, у суседа. Загадала карміць добра, бо такі з яго памочнік у гаспадарцы — і коней дапільнуе, і кароў, і чалавека з паганай думкай вычуе! Словам, можна ўсю гаспадарку на Бурыка пакінуць, і не прападзе нават яечка. Прыехала — не пазнала. Гаспадароў сама не было дома. Бурык на кароткім ланцузе ўзвіваўся ад смагі. На старой патэльні ляжала жменя сухое свіное стравы. Кінуўся сабака да Сасанкі, абняў паўпол сваю былую гаспадыню, заплакаў. І сама плачучы ад крыўды і злосці старая Сасанка дастала са свае торбы прыпасы, што ўзяла на дарогу, дала сабаку, а тую патэльню — як размахнулася, дык і шуганула за

гумно! І да гаспадаровага сына зайшла, і да солтыса. Пасля той солтыс на найбліжэйшым сходзе пра людскае трактаванне жывёл казаў. Прысаромеў пры грамадзе тых людзей, што і з-пад сябе салому жэрлі б, калі б маглі, абы ўсё прадаць. Дадуць есці — карове, свінні, бо малако, бо мяса... А з такога сабакі — што за карысць... Аж дзіўна, што пасля таго сходу сталі тыя людзі лепш Бурыка карміць...

Бабуля Сасанка дома адна сядзіць. Родныя далекавата. Наведваюць яе суседзі, лекар, што яе вочы лячыў. Кажа той дохтар: “Гэта ваша вера вас вылечыла”. Ага, і птушкі да яе на балкон прылятаюць. І пасёлкавыя хатнія і бяздомныя звяры заходзяць. І яны таксама ў гэтым горадзе адчуваюць сябе недарэчна.

# 2. МОЦНЫ ЯНАК

## Яська з-пад бору

Дом пад сасновым борам. Стройныя карабельныя сосны на пагорку, на падворак уваходзяць каржакаватыя, шырокакроныя самасейкі гадоў па 60-70. Пад соснамі расце пажухлая тонкасцёблая рэдкая трава, у цёплым пяску грабуцца і грэюцца старыя куры з даўгалыгім пеўнем з трыма пёркамі ў хвасце. Баявіты, хоць абдзерты, певень ускочыў на пянёк, залапатаў крыллем, уздымаючы пілавінне і пачаў злосна дапытвацца: “Куды то ты? Куды?!”

Я сёння ў госці да гаспадара гэтай грамадкі курэй, няполатага агародчыка, у якім лебяда і чарнобыль выбуялі да паўвакна дома з сівых бярвенняў, што яшчэ дзед ставіў зараз пасля вайны... Да ўнука сёння іду ў госці таго дзеда Міхайлы, якога ведаю з пажоўклага здымка, што заўсёды насіў з сабою Яська.

Унук сам бы мог ужо быць дзедам, калі б так, як Міхайла, сына меў у дзевятнаццаць гадоў. А так Яську толькі трыццаць восем, а, можа, лепш сказаць “ужо” аж столькі, і сына ў яго няма, ні дачкі, ні жонкі, а тым больш унука. Нядаўна гаспадарку ў свае рукі ўзяў — бацька паспеў перад смерцю (“закурыўся насмерць”, казала Яськава маці, Люба) перадаць яе Яську.

Не думаў Яська, што давядзецца вярнуцца яму ў сваю вёску. Не мог уседзець на адным месцы. Ужо да арміі кавалак свету пабачыў, за свой грош жыў. За мяжу збіраўся з'ехаць, ды граніцы пазачынялі, а яму, ужо ў вайсковым адзенні, дзеўка-студэнтка ў твар наплявала, калі ў восемдзесят другім спакойна ішоў па варшаўскай вуліцы, з польскім арлом на шапцы.

— Плюй, дурная, на свайго арла, ён не мой! — адказаў Яська дзяўчыне.

— Ludzie, ruskie w naszych mundurach! — збегся да Яські раз'юшаны натоўп.

Яська не хоча ўспамінаць таго часу. За службу ў Ярузэльскага прапанавалі яму вучобу ва універсітэце без экзаменаў. Чаму адмовіцца — "матуру" меў, ненайгорш вучыўся ў сваім тэхнікуме, варта было б пабыць "вольным студэнтам". Выбраў гістарычны факультэт. Думаў узяцца салідна за навуку, а піў увесь першы семестр. На занятках адчуваў сябе страшна — не ведаў так многа, саромеўся, і зноў піў, каб не думаць пра тое, што ён — горшы. Мелі яго за блазна і студэнты, і выкладчыкі, якім патрапіў сказаць: "Ты, Мецё, пачакай, зараз свой пенал знайду..." Спачатку здаваўся ім збунтаваным героем з лесу, нейкім Робінам з пушчы, што ваюе з нячыстай сілай таталітарызму ў думках, але замала было ягонай здаровай кемлівасці вясковага разумніка, каб адолець праграму гуманітарных студыяў. Тым больш, што алкаголь з Яськавай галавы не выветрываўся, не даваў ніякіх шанцаў запоўніць прабелы ў адукацыі. Спакаваў свой рукзачок Яська зараз пасля Новага года і паехаў да сябра з арміі, які меў сваю кватэру недалёка інтэрната. Паўгода бадзяўся ў горадзе, з хаты браў харчы і грошы, якія крадком хавала для яго маці за прададзеныя яйкі і смятану. Дзяўчына з польскай філалогіі, Ёлька, адна з найлепшых студэнтак на аддзяленні, з якой "круціў" ад кастрычніка, заходзіла да яго ў госці штораз радзей, і

аднойчы, лежачы ў пасцелі, выдзьмухваючы дым таннай “карткавай” цыгарэты, сказала Яську:

— Янак, у мяне ёсць іншы сябар. Мы разумеем адзін аднаго выдатна. Канчае палітэхніку. Ведаеш, секс гэта не ўсё, хоць не адмаўляюся час-часом да цябе завітаць. Але перастань гаварыць глупствы пра нашу супольную будучыню. Сам добра ведаеш, чаго ты варты, Ясю. Не прыходзь да мяне больш у інтэрнат, збірайся ў свае Путрыкі, чаго тут час марнуеш, з бацькоў апошні грош цягнеш.

Вярнуўся Яська да бацькоў. Тры сястры былі ўжо замужам. Малодшы брат вучыўся ў майстра на “глазурніка”; той ужо меціў яго ўзяць зяцем — надта ж спадабаўся Багдан майстравай дачцэ. Бацькі яшчэ дужыя былі, рабілі ў гаспадарцы ўсё самі. Яська зачапіўся на чыгунцы. Калі пайшлі групавыя звальненні, пачаў ездзіць у Гродна з кантрабандай. Панашываў спецкашулек і падштанікаў з адмысловымі трубкамі-кішэнямі, куды напіхваў пачкі цыгарэт. Удавалася. Заробак, усё ж, рабіўся ўсё меншы. Абрыдла Яську хаваць тавар пад падлогамі вагонаў, мытнікі раз-пораз пачалі дамацвацца пачак, што теравозіліся на целе. Што за жыццё — ні сну, ні адпачынку — ездзіў жа Яська не адзін раз у Гродна, штодзённа. Кінуў. За тое, што зарабіў, адрамантаваў унутры бацькоўскую хату, купіў матацыкл маркі “Хонда” і бульбакапалку. Рэшту прапіў з сябрамі.

Калі не хапіла грошай на “Раял”, паставіў Яська ў склепе на падворку, крытым дзёрнам, адмысловую апаратуру. Дым выходзіў у бор. “Мелі нос” на дымнагоркія пахі сябры з акалічных вёсак. Нават Яська і не ведаў, што ў яго столькі сяброў!

Усе сябры балююць за Яськавым старым сталом на моцных, кручаных чорных нагах. Кавалеры старыя і маладыя, — перш за ўсё яны, але на першачок часценька заглядае і нестарая ўдавіца Насцечка, і распусная бяззубая саракагадовая Гэлька, што

вярнулася на бацькоўскае, пакінуўшы сваіх траіх мужоў-не мужоў, што “ніколі мужчынамі не былі”, як сама кажа (за кожным з іх асталася ў Гэлькі памятка — жменя ейных зубоў)... Хто зваліцца з ног, то і заначуе. Так у Яські асталася за гаспадыню Гандзя, старэйшая за яго роўна на дзесяць гадоў. П’е нараўні з мужыкамі, але ў хаце нейкі парадак трымае, карову доіць, калі зможа, у агародзе тое-сёе пасадзіць. Найбольш працівілася маці, каб Гандзя тут гаспадарыла, але не змагла пераканаць сына ды ўцякла да найстарэйшай дачкі ў Беласток.

Спачатку з Яські шмат хто смяяўся, што ўзяў такую, якую ніхто не паквапіўся ў жонкі браць, але ён толькі ўсміхаўся. Хай будзе хоць такая, худзюшчая як дрот, з рабым носам-дзюбаком, але нашто яму, Яську, бегаць па чужых? І ў хаце больш-менш парадак. Дзяцей ужо ў Яські надзеі мець няма. А калі б трапілася якое, то і яно забярэцца ды пойдзе ў свет. Дарога кожнаму адкрыта — рабі што хочаш, едзь куды хочаш, жыві як хочаш. Вяртаюцца толькі такія неўдалоты, як сам Яська...

Гэта ўсё раскажа мне Яська пасля. Цяпер стаю перад брамкай, азіраюся на сабаку, які, выгнуўшы ў дугу сваю рабрыстую спіну, заядла, да сіпаты цяўкае на ланцугу. Яська павінен мяне памятаць — жыў жа ў інтэрнаце па-суседску, шмат мы размаўлялі... Але, як жа ж не пазнаць — бярэ мяне аброслы рудой барадой гаспадар за белыя рукі, вядзе ў свае харомы. За сталом спіць, апёршыся няголенай шчакой на бліскучую цырату, малады вельмі прыгожы хлопец. Русая доўгая чупрына мокне ў мутнай калюжынцы. Падсоўваюся да яго на столку. Гаспадыня нясе міску з густой цёплай капустай, Яська — бабах! — на стол зялёны буталь. Не, у ім не шампанскае! Нюхаю: свежанькі першачок.

— Частуйся! У інтэрнаце горшае свінства даводзілася піць, якое самагонкай не назавеш. А вось

гэта — проста *цымэс*! — цмокае Яська і налівае мне ў шклянку мутнаваты напой. — Ну, пытаешся, як нам жывецца... Жывем, як можам, — найлепш.

## Моцны Янак

Янак Барысюк быў мацак ад малога. Як нейкі казачны волат, рос ён не па днях, а па гадзінах. У тры свае месяцы утоптваў бульбу, пальцамі напіхаў таўканіцу ў бяззубы роцік, а ў паўгода хапаўся за каўбасу. Пры матчынай цыццы вісеў да двух гадоў, сам падыходзіў, адкладваў набок малаткі і гайкі, што былі ўжо яму за забаўку, падцягваў матчыну кашулю, і, насмактаўшыся ўволю, ішоў дапамагаць бацьку на падворак. Гаварыць пачаў позна, яшчэ ў два з паловай гады мог сказаць толькі "мама", "тата", "дай", "баба" і "не". Загаварыў раптам у чатыры, але не меў з кім размаўляць, апроч Жучка і Мурзіка, бо старэйшыя сёстры паехалі вучыцца ў горад, тыднямі іх у хаце не было, бацькі і дзед у полі, бабуля ў старэчай бяспамяці калыхалася на сваім услончыку і прыгаварвала Яначку "ну-ну!", калі ён, набегаўшыся на падворку і вуліцы, убягаў у кухню, зачэрпваў кубкам ваду ў вядры і піў нагбом, расчырванелы і мокры.

Янак ад малога меў сіплы, нейкі старэчы хрыпаты голас. Пэўна, ад вечнай прастуды. І саромеўся свайго пеўнікава-басавітага галаска, і найчасцей маўчаў, найбольш на ўроках, чакаючы выбуху дружнага смеху аднакласнікаў і настаўніцы (якая праз сілу ратавала свой педагагічны ўзорны твар за насоўкай) на яго хрыпаткое гугненне-адказ. Ведаў шмат, асабліва пра прыроду, някепскі быў па матэматыцы, але рэдка яго пыталі на ўроках. Сам руку не падымаў, не прасіўся

адказваць. Добрыя ацэнкі з кантрольных настаўнікі лічылі вынікам спісвання ад лепшых вучняў.

Вучыцца далей пасля пачатковай школы Янак не збіраўся (прынамсі, нікому пра гэта не казаў), хоць закончыў яе ў час і без двоек. Меў жа быць гаспадаром! — так рашылі бацькі. Нарадзіўся ж ён Сашку і Марусі ў іх познія гады якраз на суцеху, каб было каму пакінуць бацькаўшчыну... Татку ў яго 56 гадоў "адбіла" нешта, рушыў шукаць новага шчасця — развёўся з Марусяй, прыстаў у другой гміне да ўдавы-аднагодкі, з добрай гаспадаркай (казалі людзі, было ў Сашка з Нюрай каханне яшчэ ў партызанцы, і зноў дарогі іх звялі на базары ў Гародні). Маруся памерла на сынавых руках — апускала вядро ў студню, пакаўзнулася на мокрым каменні, стукнула яе ў скронь ручка калаўротка. Пакуль прыехала "пагатове" (роварам сусед пёр без духу на пошту званіць па хуткую дапамогу), Маруся знерухомела на радзюжцы пад яблыняй.

Янак астаўся адзін у хаце ў тры вялізныя пакоі з кухняй у цені 150-гадовай ліпы і старых яблынь, яшчэ пладавітых, што садзіў у 1912 годзе дзед Анісім сабе на славу, унукам на скаштаванне, як паўтарала баба Аўдося. Пахаваў Янак і бабулю. У апошнія свае хвіліны называла яго Якімам, найпрыгажэйшым, найлепшым сынам, ад якога апошні ліст прыйшоў з Магілёва ў 1943 годзе; усё пра той ліст шаптала Аўдося, дапытвалася: "А чом ты, Якімку, трыма крыжыкамі распісаўсе, ты ж пісаці вучаны?.. Чы на цябэ крыжык паклалі бальшавікі, чы хто інакшы? Дзецятко, то ж так добрэ, што ты во вэрнуўсе..." Стаялі ціха суседзі,ківалі галовамі, праводзячы бабу за вёску ў апошнюю яе дарогу. Янак маўчаў, каўтаў слёзы. Вярнуўся дадому, памыў падлогі. Сядзеў доўга ля печы, пускаў дым у дзверкі, хаця ў хаце не было ўжо нікога, каму мог бы шкодзіць тытунёвы дым.

"Моцным" называлі Янака яшчэ з пачатковых

класаў — клаў вобзем намнога, здавалася б, дужэйшых за сябе, і хоць невялікі ростам, паўметра бульбы ўскідаў над галавою адным рыўком. Калі яму пасыпаўся вус, качаўся, барукаўся Янак на выгане з кавалерамі. Клаў усіх. Можа быць, і таму, што яны, перажэртыя самагонкай, падалі, як снапы, на голы выган пад напорам буйнога пружыністага цела. Янак пляваў быў тады на гарэлку, кінуў курыць, ласаваўся цукеркамі, плаваў у Нарве з Юр'я амаль да зазімкаў, а зранку, перад даеннем кароў, нават фіззарадку рабіў, пасвістваючы, быццам мала было маху рукам у гаспадарцы за цалюткі дзень!

Гаспадарыў Янак як умеў на сваіх васьмі гектарах. За тое, што прадаў, плаціў а то страхоўку, а то за паслугі, а то купляў угнаенні... Калоў свінчо два разы ў год, дзяліўся з сёстрамі, якія тады якраз з сем'ямі з'язджаліся да брата ў госці, пабедаваць над яго гаротнай самотай. Спачатку хлеб сам пёк, але калі пачалі прывозіць штодзень у *склеп* белыя круглыя булкі, кінуў. Добра радзіў яму агарод — сеяў Янак капусту: і звычайную, і брусельку, і кальрабі, і чырвоную, і каляровую, саліў гуркі, марынаваў зялёныя і чырвоныя памідоры, цукіню, дыню. У асаблівай пашане былі ягоныя марынаваныя яблыкі. Каму найбольш смакавалі жоўтыя кавалкі антонавак, каму цэлыя чырвоныя райскія яблычкі ў кісла-віннай заліве. Каму? Сябрам, знаёмым, усім.

З суму вялікага, казалі, з адзіноты Янак піць пачаў. Спачатку не так многа. Ды і сёння рэдка ўбачыш, каб напіўшыся, як бонак, валокся дахаты, а пад плотам жа ж яго не ўбачыш паўмёртвага, як шмат з кім бывае. Хутчэй у яго доме спыняцца сасмаглыя сябрукі, кавалеры і нават сямейнікі. Бо жанчыны тут у ваколіцы няма, якая б узяла дзяркач ды паганяла гэтую кампанію! Хоць Янак дужы і яшчэ прыгожы, ды і неблагі з яго чалавек, і гаспадар старанлівы, не знайсці яму гаспадынькі. Не сумеў прыдбаць яе ў

дваццаць ды трыццаць, тым больш з гэтым цяжка ў сорак сем, калі ўжо сівее цемя, калі зубы парадзелі. Ды і куды запрашаць кабету — дома ж нічога асаблівага няма, адно той каляровы "рускі" тэлевізар ды матацыкл "Ява", на якім Янак праехаў тысячы вёрст ад забавы да забавы!

Цюцька ды коцік, адзіныя істоты, якія ведаюць, што мроіцца ў глухую ноч іхняму гаспадару, Моцнаму Янаку, ды нічога пра гэта нікому не скажуць.

## Ёзік

У майго знаёмага маладога гаспадара ў вёсцы К. было досыць многа жывіны. Дзве каровы, два падсвінкі, сем курак ды певень і тры сабакі. Малако кароў утрымлівала пры жыцці гаспадара і самую гаспадарку, з парасят Ёзік чакаў мяса і сала, яйкі служылі за закусь, а сабакі пільнавалі ўсяго маёнтку і таго, каб Ёзіка, калі ўпадзе пад плотам ад алкагольнае знямогі, разам з дабыткам не панеслі зладзеі. Праўда, па падворку і па-за ім мог бегаць толькі рабрысты чорны Ас, а сівая Аза з касцістым азадкам і рабы куцы Рэкс яхкалі на ланцугах — Аза пад курнікам (начавала ў старой бочцы без донца), а Рэкс — у кутку дрывотні (спаў на пілавінні ды стружках, счарнелых ужо ад дажджоў і снегу; нябожчык Ёзікаў бацька — Колечка калісьці займаўся сталяркай). Ас, бывала, зловіць якога звярка ў полі ці ляску, адбярэ мыш у ката, хлебане вады з рова ці памыяў у кухні, калі яны ёсць, папросіць есці ў суседкі, а Аза і Рэкс цудам трымаліся пры жыцці. У найгоршую спёку не даў ім гаспадар ні кроплі вады, а елі яны тое, што траплялася на дне свінога вядра, калі гаспадар не забыў ім яго кінуць. Я дзіву даваўся кожны раз, калі заязджаў у

вёску К. — Ёзікавы сабакі ўсё існавалі, як вечныя статуі на нацягнутых ланцугах. Усё мянялася ў вёсцы, уміралі людзі, валіліся хаты, а Аза і Рэкс усё дыхалі.

Ас хадзіў жаліцца да суседзяў, найчасцей да цёткі Надзеі, якая шкадуе ўсё жывое, усякае Божае стварэнне. На жаль, не магла запрасіць Аса жыць да сябе — у яе ёсць свой сабака, стары Бурка-пенсіянер. Раз Асаў гаспадар, убачыўшы, што сабака есць костку за цётчынай брамкай, усчаў скандал на ўсю вёску: па якому праву бабуля падкрадае чужога сабаку!? Цётка Надзея загаласіла, уся ў слязах: "Дай, чалавеча, есці жывіне, ён жа сторож, пільнуе твае бацькаўшчыны! І жыцця свайго не марнуй, не пі! Хто ж гэта бачыў такое, такі малады, харошы хлопец!.." Накінуўся Ёзік на бабулю, схапіў яе за каўнер: "Не твая справа, бабо, што раблю я і мае сабакі! П'ю за сваё. Маё жыццё — не ваша справа! Хай і згіну, то не вы пойдзеце ў магілу! А маё хай прападае, але з мае рукі!"

Апошні раз я быў у верасні ў вёсцы К. Ас ужо не бегаў па вуліцы. Казалі, пераехаў яму трактар лапы, трэба было дабіць. Даканаў яго гаспадар калком па галаве. Рэкса забрала Ёзікава сястра ў мястэчка, там у яе свой дом, дзеці — будзе малым забаўка, Рэкс лагодны, ласкавы, толькі лякаецца крыку, і тады кідаецца кусаць. А Аза павесілася — з бочкі ўскочыла на сліўку, што расце ля курніка; там вісела на галінках пару слівак, хацела дастаць іх, бо ўсе, што пападалі на зямлю, з'ела разам з костачкамі. Ланцуг перавесіўся цераз галіну, сучка пакаўзнулася, так і закончыла сваё невясёлае жыццё. Праз тыдзень заўважыў яе сусед, зняў ды пахаваў.

Ёзіка доўга не было. Перад тым прадаў кароў і свіней, парэзаў птушак. Казалі, за мяжою быў, на Захадзе думаў шчасця шукаць, у Нямеччыне.

— А каму там такія трэба! — махае рукою дзед Аноп. — То ж па-нямецку ні гу-гу, ні рабіць каб што ўмеў. Каб пастараўся, то і ў нас якась жыў бы. Каб

быў на якую бабу добрую нарваўся, то быў бы з яго чалавек...

— І пільнаваць гыньдзе няма чаго. Што тут украсці! Колечка ў магіле бакі сабе намуляў, варочаючыся — так сыночак змарнаваў гаспадарку і сваё жыццё! — уздыхае цётка Надзея.

З'ехаў кудысьці наш знаёмы трыццацігадовы Ёзік, Мікалаеў сын, з вёскі К. Знік, не дае знаку жыцця. Што ён цяпер робіць, з чаго жыве?.. Можа, бачылі вы яго недзе? З хаты нічога цёплага не ўзяў, а зіма ж не за гарамі...

## Машка і Золька

Жылі Машка ды Золька ў адной вёсцы, што доўгімі кіламетрамі цягнецца хутарамі ды прысёлкамі, з цэнтрам з дзвюма вуліцамі-брукаванкамі накрыж. Былі ў вельмі далёкім сваяцтве, недзе ў сёмым ці восьмым калене, але з маленства вадзіліся як родныя сёстры. Маленькую Зольку мучыла лушчыца-залатуха, усе дзеці брыдзіліся ёю, і толькі Машка, дачка бедняка Івана Клімюка, не пакідала сваю хворую суседку-аднакласніцу ў бядзе і ў радасці.

Абедзве нарадзіліся ў канцы верасня 1939 года. З ваеннага часу Золька памятае клуню, з якой феерверкамі вылятаюць дымна-чырвоныя снапы і бухаюць снарады, сабраныя для партызанаў дзедам Вікентам. Машцы цьмяна прыгадваецца сырая зямлянка ў цёмным лесе і забінтаваная чырвонай анучай галава партызана, якога стогны і енкі страшна яе палохалі. На папялішча вёскі, парослае палыном і чарнобылем, жыхары вярнуліся ў сорак чацвёртым. Хаты ставілі ўжо большыя, з дубальтовымі вокнамі, дахі крылі драніцай. З амаль гатовага дома,

завяршаючы шчыт бярозкай, зваліўся Зольчын бацька, Сцяпан Зубрынскі, паламаў абедзве нагі. Крыва яны яму зрасліся, і потым чыкілдаў ён па хаце ды панадворку, не прыносячы вялікай карысці ў гаспадарцы. От, парады толькі даваў ды распараджаўся, стругаў нешта сцізорыкам у драўніне, бульбу перабіраў навесну... Ад пояса — Сцяпан мужык як мужык, плячысты, дужы, а ногі — як асінавыя калочкі. З часам і плечы моц страцілі. Добра, што ўдалося атрымаць яму пасаду "дыспазітара" — каператыўнага дыспетчара машын. Праўда, гэта было ўжо пры Гамулцы, а тады, пасля таго выпадку, забралі былі Сцяпана ў турму — тры гады прысудзілі яму за крадзеныя бэлькі. Не ён краў, а брат ягоны Васіль; той сабе накраў на цэлы дом, Сцяпану даў шэсць бэлек. Узяў на сябе віну калека. Выйшаў не чалавек, а цень. Малая Золька з маткай падалі з сіл, аралі, сеялі, збіралі, не азіраючыся на іншых. Праўда, Васіль адчуваў сябе ў даўгу, дапамагаў братавай. Людзям Ганна адрабляла за дапамогу, Золечка таксама бегала па суседзях, працавала — то серпікам жала, то палола, то снапкі вязала, пакуль бацька не вярнуўся...

Людзі з іхняй вёскі не падаліся ў калгас, як у суседняй, і з нейкай зайздрасцю пазіралі то на жняярку, то на трактар з плугамі, але больш было ўсмешак: вось паглядзіце, колькі ўсяго марнуецца, колькі каласоў паламаных, колькі зерня асыпалася, колькі агрэхаў у жыце!.. Праз гадоў дзесяць сарганізавалі ў сябе кааператыў — "ральнічае кулка"; пабыло яно ў іхніх руках, і стала фірмай дзяржаўнай. Сцяпана выбралі загадваць машынамі. Так, самі выбралі яго, дбайнага гаспадара, хоць "парція" выказалася ясна: "вораг народа", сын "ворага народа" — багацея-крамніка, злодзей народнай маёмасці! Найбольш працівіўся Іван Клімюк — ён-та і данёс быў на пастарунак міліцыі, што бэлькі ў доме Зубрынскіх — з пушчы, нецэхаваныя. Сам Клімюк і

цяпер, хоць надзяліла яго народная ўлада ладным кавалкам урадлівае зямлі, голы сядзеў, перабіваўся з бульбы на квас. Ну, не наракаў і не плакаў, што чамусьці не так яму ўсё расце, — жыў ды напяваў, са “спортай” вечна прыклеенай да вуснаў, і толькі дзеці ў яго не зводзіліся, жонка ў трэску высахла. Ну і што, што бедны Іван, але на дзяцей проста не наглядзецца! А гляньце на Зольку Сцяпанаву — адно лушпінне з яе лезе, каравая такая, а кормяць яе адно жаўткамі, малаком і мёдам, каб паправілася, а ўсё такая нягеглая! І адна ў бацькоў, і з багатай сям’і, а хто возьме такую брыдоту, хоць і з пасагам?..

Праўда, гідзіліся школьнікі Золькі. На перапынках стараліся нават не дакрануцца, хоць частавала бутэрбродамі з мясам ці каўбаскаю, а ў іх быў толькі часам хлеб з салам ці соллю. Неахвотна сядалі вучні з Золькай за партай, але дзяўчынка вучылася добра і давала спісваць на кантрольных; было выгадна мець яе за суседку. Колькі паперак і пражаваных прамакатак ды гумак ляцела ў яе кучаравую галаву! Колькі непрыемных слоў яна пачула! “Золька-сролька-кабадолька! Лупіна! Цыбуліна! Рак!” Не дапамагалі нават папрокі настаўнікаў. Але і пані Гражына, якая правярала, ці няма вошай у галовах вучняў, разгортвала Зольчыны валасы, трымаючы ў пальцах прымочкі-бібулкі і хутка пасля бегла ў калідор, памыць рукі ў “куточку чысціні”. Толькі Машка Клімючанка старалася не рабіць прыкрасцяў сяброўцы. Дзеці і дарослыя меркавалі, што, пэўна, таму, каб бываць у Сцяпанавых ды добра наесціся. Але ж Машчын бацька, Іван Клімюк, усім і ўсюды даказваў, што Сцяпан Зубрынскі, паганы “кулак” з караня (ад Клімюка да самай смерці ў 1981 годзе не адчапілася “рэвалюцыйная” фразеалогія), а як “дыспазітар” кулковых машын ён “абсалютна не на месцы”, хто з ім вып’е, казаў Іван, да таго трактар ці жняярку Сцяпан вышле. Найлепш, браткове, значыць,

касіць касою і не лезці да Сцяпана ў кішэню.

Калі Золька пайшла вучыцца ў ліцэй, пацягнулася за ёю ў горад і Машка. Клімюк грошай шкадаваў на адукацыю дачцэ, бо іх у яго і не было, а хоць “навука дармовая”, усё ж каштуе. “Хочаш вучыцца — вучыся за сваё”, — сказаў бацька Машцы. Дзяўчына працавала, вучылася ў вячэрнім тэхнікуме, жыла разам з Золькай у пакойчыку, нанятым у хатцы на прадмесці. Золька пасля ліцэя пайшла ў сталічны універсітэт, Машка асталася ў Гайнаўцы...

Спачатку часта адна другой пісалі, сустракаліся. Праз пару гадоў сяброўства “разлілося”.

Сустрэліся ў чэрвені 1995 года ў Беластоку. Абедзве ўжо на пенсіі — былая настаўніца пані Зося і рэнтыстка з прычыны хваробы вачэй пані Марыся, выдатная краўчыха. Так іх завуць цяпер. У Золькі двое дзяцей: сын Адам і дачка Ганя, абое за мяжой у бацькі; кажа, добра жывуць. Дачка Машчына, Зоська, у Італіі, выйшла замуж за пажылога ювеліра, разводніка, выхоўвае яго сына. Сын Машчын Зютак працуе інжынерам, толькі нядаўна паканчаў школы, дактарат рабіў па пабудове дарог і мастоў, думае з’ехаць за мяжу, бо тут няма за што хату купіць, і зарабіць трэба, каб сям’ю ўтрымаць і жыць палюдску.

Сустрэліся на аўтобусным вакзале ў Беластоку. Ехалі ў сваю вёску, на возера. Там у кожнае з іх — бацькаўшчына. У Машкі — хатка пустуе, бацькі памерлі. Думала ўсё ўзяць і прадаць, але дзеці пераканалі, што не варта, зямля ж не згарыць, не скісне, не папсуецца. Можа, уздумае Зютак вярнуцца з заграніцы?.. Усе Машчыны браты і сёстры — колькі іх было? васьмёра? — разбегліся па свеце і знаку жыцця амаль не даюць. Зольчын бацька Сцяпан таксама памёр, кажуць, з нуды — пасля смерці Ганны ў 1986 годзе моцна расхварэўся на сэрца. Хацела Золька забраць яго да сябе, але Сцяпан і не думаў

пакідаць свой дом. Прыходзіла да яго медсястра з грамадскай апекі, рабіла ўсё ў хаце. Меў неблагую пенсію, шмат прысылала дачка, хапала, каб добра і спакойна жыць. Памёр Сцяпан ціха, як і жыў у апошнія гады.

Паехалі разам Золька з Машкай у сваю вёску. Зайшлі ў пусты Сцяпанаў дом. З добрага дрэва ён пастаўлены, моцны, стаіць, як стаяў.

— То што, Машка, давай тут пажывем? Нарэшце, пагаворым уволю. Варшава і Беласток не ўцякуць.

## Панас

— Ой, які ты брыдкі-брыдкі! Цьфу на цябе! — глянула было на румяны тварык Панаса суседка. — А назвалі цябе, хай на іх! — Панас!

Гэта, каб не сурочыць — падміргнула матцы немаўляці, але ж сапраўды скаланулася: Панасік не быў прыгожы, нават як на толькі што народжанае стварэнне людскога роду.

Але ўсё ж замова Макарчыхі падзейнічала, ці што, бо вырас Панас на хлопца харошага і разумнага. Шкада, што не перадасць свае красы і розуму ў наступнае пакаленне гэты зусім талковы хлопец, абдораны бацькамі непапулярным імем, выклікаючым усмешку ў паненак. Ды што яму:

— Па нас хоць бы патоп! — махае рукой Панас, невядома, ці з адчаем, ці абыякава, папіваючы сабе піва пад вясковай крамай.

... Гэта ўсё, каб угаварыць і загаварыць лёс. Калі нават не слухае ён цябе, то ў рэшце рэшт абрыднеш яму, як тая назойлівая муха. Калі не прыхлабушчыць мухабойкай, то мо выжане ручніком, а кыш! — ляці, паскуда, сваёю дарогай!

Не выгаварвай лёсу тое, што прыносіць, лепш адразу дагаварыся з ім адносна ўмоў і варункаў.

Варункова нішто не пойдзе ў залік, няма паўторных экзаменаў з веснавое маладосці, перанесеных на асеннюю сесію. Запісалі ўсё ў тваёй заліковай кнізе, у індэксе.

На індэксе будзеш і ты, і твая чэкавая кніжка з фальшывымі подпісамі, не спаляць і змарнаваных лісткоў з пячаткай "Анулявана", адкуль ні возьмуцца вырваныя хвіліны і тыдні, пра якія даўно забыўся і ты, і твае дзённікі, якія ты пакінуў, каб іншыя параўналі свой лёс з тваім і палічылі цябе... за... Альбо і кінуў ты іх весці, а яны ўсё пішуцца, пішуцца...

І ты, сам не свой, яшчэ і яшчэ раз будзеш хацець выцягнуць свой фант-лёс у латарэі, але ці выйграеш нешта вартае старання?

Панас, што па нас? Загавораная брыдота ці краса ў прах абернуцца? Добра, што на спажыву больш нас вечным дрэвам або хоць чарвячкам, якім адзін дзень — век.

## Горкая вада

Разахвочаны Зютак урэзаў: "Расьцветалі яблыні і грушы!". Коля тузануў яго за рукаў святочнага пінжака: "Сціхні! То ж варшавякі!.." Аднак пан з міністэрства пляснуў Зютка па плячы, аж хлопец угнуўся: "Śpiewaj pan po rusku!"

Увечары ўсе паселі ля вогнішча. Зютак ізноў тоўкся каля гасцей: заўсёды трапяцца кропля якая гарэлкі, і то не найгоршай, і каўбаска на закуску. Зютку Мікалаюку жылося нудна, як кончыў сорак. Казаў, пайшла жытка на спад, з горачкі, і хоць павесся сёння, ці памры праз сорак гадоў, то "адна польза". Калі б

дзіцё якое гадавалася ў хаце, то хоць бы ты сам прыгінаўся з цягам гадоў, то яно расло б, было б каму багацце якое збіраць. А тут усё валіцца, і ты разам з ім. Аж жыць не хочацца, нават “po kielichu”, але тая кропля крыху суцешыць чалавека хоць на пару хвілін, нальe яму агнём жылы. Тады і заспяваеш, закрычыш, чаго табе хочацца ці хацелася, аж азавецца рэха ад пушчы.

Кавалераў шмат у С. Калісь Зютку здавалася, калі яшчэ быў маладзейшы, што чалавек, якому за сорак, ужо старэча: бачыў жа свайго хваравекага, хоць учэпістага да працы бацьку, а раней і дзеда Івана, які ў свае сорак быў белы, як галубок, перажыўшы шмат чаго ў сваім жыцці. Цяпер і ў Зютка, як у казцы: чорны волас—срэбны волас. “Гэта ад сівухі так пасівеў”, — мяркуе Коля. Але, толькі тае сівухі не заўсёды стае, бо ўсё грош каштуе. Ну, папраўдзе, і Зютак піў або і не піў, калі не было за што. Бо які ж алкаголік, калі гаспадарку маеш. А калі, вось, зарэзаў быў бычка, то і піць, і есці было: на свежанінку збегліся з паўгміны аматары мець добрую закусь, кожны са сваёй бутэлькай. Пілі датуль, пакуль не з’елі нават бычковы вушы: пачалі ад сцягнутай з вяселля “чыстай”, кончылі на вынаходстве Ізыдара з Б. (доўга меркавалі, хто яшчэ мог, што за пачастунак прывалок Ізыдар). Кончылі бычка і папляліся кожны ў сваю хату, а Зютак астаўся з рожкамі і капыткамі ды сваімі трыма метрамі бульбы на зіму.

Адзінай “разрыўкай” былі турысты. Можна было крыху падзарабіць, упусціць на начлег у хату, павадзіць іх па лесе, паказаць месцы, дзе ходзяць рысі, дзе завяліся бабры... Ну і тыя вогнішчы на беразе! Прывалачэш галля, ламачча, чагосьці на распалку — грош маеш, і запросяць цябе ў кампанію. А калі і чарачка пойдзе ў рух! Не абмінуць жа чалавека!

— Занадта Зютак пачаў выдурняцца! — кажа Сця-

пан Бярыцкі, шасцідзесяцігадовы гаспадар. — Хай ты голы і розум у цябе не першы, чаго з сябе рабіць блазна перад чужымі? Вядома, выпіць чалавеку хочацца, але і гонар мець якісь трэба. А то барукацца з кожным хоча, то збіраецца скакаць у вір, у Супрунчыкаву яму... А як завядзецца, то не супыніш: "Што, я-я-я?!! Я — не магу!? Ты ведаеш, з кім гаворыш?! То ж я ўсіх вас адным пальцам!.." І ад якоесь злосці такі страшны, моцны зробіцца, то хоць яго вяжы, путай, то вяроўку парве! Раз крыху сам супакоіўся, то падышоў да сасны і давай біць у камель галавою! Лупіў так, што мала чэрап не раструшчыў. А потым праспаўся ў карчах, і то на мокрым, ніякая халера яго не ўзяла. Рана нават не памятаў, адкуль у яго мазгаўня паабдзіраная, у крыві. Сядзе, бывала, плача, войска ўспамінае, дзяўчат, усе свае крыўды, а зараз ірвецца помсту рабіць, вядома, на тых, хто найбліжэй сядзіць.

У той вечар Зютак быў апрануты акуратна — надзеў да джынсаў свой чысты, выхадны шэры пінжак, абуў белыя адыдасы. Пагаліўся. Варшаўскія госці прыехалі, сярод якіх быў нейкі чалавек з міністэрства, ці што. Зютак рабіў быў крыху ў лесе, займаўся насякомымі. Свае заўвагі штомесяц адпраўляў у Варшаву, за гэта прысылалі яму невялікі грош. Цяпер, у рамках ашчаднасці, міністэрства адмовілася ад яго паслуг...

— Здаецца, што яму, на п'яную галаву, думалася, што яго возьмуць у Варшаву, калі ён такі спецыяліст па караедах! — смяецца Ваня Скакоўскі. — Ну, у такім стане розныя думкі чалавеку прыходзяць у мазгавешку. Я яму сказаў, што гэта глупства: школы ж не мае па тых караедах і іншай заразе, а мала то вучоных у Варшаве сядзіць?! Ну, дурань, і ўсё. Але марыць-то можна, ну не? Каб хоць вырвацца ў свет. А куды невучонага хочуць!..

— Цяпер то і я, каб быў маладзейшы, — дадае

Адам Засімюк, — то сам пайшоў бы вучыцца. А калісь нават мае бацькі пыталіся: “Нашто рольніку школа? Хопіць ведаць тое, што дзяды ведалі, каб зямля радзіла. Тады з голаду не памрэш, абы табе *панства* жыць давала...”

Заспяваў Зютак “Кацюшу” і пад хвальбу кампаніі ўзбег на кручу.

— Я заўважыў толькі, як ён узмахнуў рукамі, бы збіраўся паляцець, — кажа Коля Падлескі. — Так і паляцеў! Пакуль мы ачомаліся, узабраліся на высокі бераг, Зютка ўжо не было. Спачатку думалі, што зноў выпендрываецца, што схаваўся пад берагам, а тут.. Варшавякі змыліся, і следу не засталося, толькі іхнія каўбаскі і гарэлка на беразе асталіся...

Хлопцы вярнуліся піць да вогнішча. Коля ўзабраўся на ровар і хістка памчаўся па лясной сцежцы ў вёску, да солтыса, каб той пазваніў у паліцыю.

Пасля таго дружбакі закідалі Колю Падлескаму, што патрывожыў іх святы спакой, калі качаліся ў попеле ля выгаслага вогнішча.

Не трэба было шукаць доўга — Зютка знайшлі пад карчамі за Супрунчыкавай ямай — заблытаўся ў карэнне і водарасці шнуроўкамі ад ботаў.

— Ну, напіўся Зютак, то напіўся! — чорны гумар не пакідае ўчарнелага з твару Сярожу Катловіча. — Але ж, рачная вада, — гэта ж не гарэлачка! Паганая смерць. Лепш ужо сканаць ад перапою.

## На злосць павешуся!

У вёсцы Лазова, кажуць людзі, зусім як у фільме: чатыры пахаванні і адно вяселле. Гэта так, для добрага пачатку тэксту. Бо, напэўна, статыстыка намнога горшая, калі справа ў шлюбах.

А і тое сужонства, у каго на вяселлі нагулялася ўволю ўся аколіца, бо і дармовае disco polo было ў святліцы, не прынесла ніякага выніку. Бо плод сямейнага кахання — дзеці, наступнікі ў гаспадарцы, новае пакаленне, падтрымка на старасць.

Міхал Брук меў шчасце. Нарадзіўся здаровы і прыгожы, у прыстойнай, працавітай ды багатай сям'і. І розуму яму хапала — у школе не быў апошні, закончыў сярэднюю. Бацькі намовілі яго вярнуцца на гаспадарку, бо і каму мелі яе пакінуць, як не адзінаму сыну?

І дзяўчыну ўдалося яму знайсці, праўда, не з вёскі, а з мястэчка, але не пабаялася ісці на гаспадарку. Спадабалася Галіне і Міхалава сям'я, і гаспадарка, і вёска, згодная і акуратная. Міхалава гаспадарка была ўся механізаваная, то і не было так шмат рабіць, а грошай хапала. І свякруха нявестку любіла, а тая плаціла ёй узаемнасцю.

Вяселле згулялі чатыры няпоўныя гады таму.

— Яшчэ памятаю, — кажа Малянея Сіманюк, — як я, старэча, нагулялася! Кавалераў хоць гаць гаці, а я танцаваць люблю, ой, люблю! А падарункаў надавалі! Калі ў грашах, то менш мільёна цяпер устыдна даваць. Калісь, то дасі палок палатна ці абрус, вядома, усё ж рукамі рабілі, дый хопіць. Цяпер жа, калі падарунак, то толькі купны. І кветкі куплёныя, не з гародчыка. Я ведаю, што ўсё праз тую гартэнзію, што Тарэска ім прынесла. Толькі нікому не кажэце, што гэта я вам гаварыла. Чом? Каб мяне пакруціла?! Ці яна чараўніца? Напэўна, трохі *ведае*. Я — старая, не адно бачыла за сваё жыццё. Яна вось ім прынесла толькі гартэнзію ў падарунку. Вялізная, кветкі буйныя, ружаватыя. Разраслася на ўсё акно, перасадзілі яе ў агарод. Людзі глядзелі, як на дзіва нейкае, на тую кветку-велікана. У царкве мне аж у сэрцы кальнула, як убачыла, што Тарэска стаіць з тым вазонам, бо аж туды яго спачатку завалакла. Я думала, што яна

гартэнзію для аздобы царквы прынесла, ці што. А як убачыла, што Мішава свечка гасне, то прадчула благое. Ой, не, не будуць яны жыць доўга разам... Не будзе ім шчасця. Бяда, дый годзе.

Пра тую бяду ў Лазове некаторыя распавядаюць з неахвотай, адмоўчваюцца, убачыўшы мяне, раптам зварочваюць у свае веснічкі. Іншыя ахвотна, нават з нейкай яхіднасцю цешацца апісваннем таго, што бачылі і чулі. Але такіх няшмат. Вёска Лазова славіцца тым, што жывуць тут людзі спакойныя, памяркоўныя, самавітыя, проста людскія.

— Вы, пісакі, ходзіце па белым свеце ды ўсё вынюхваеце, дзе трапіцца якая кроў ды няшчасце! — крычыць на мяне дзед Мікалай Гапунік і пастуквае палачкай аб тратуар. — Такі добры хлопец быў!

— Некаторыя кажуць, што вінавата ў яго смерці жонка Галіна... — не паддаюся, хоць самой крыўдна і непрыемна трывожыць усхваляванага старэнькага суседа Мішы Брука.

— А ў чым тут яе віна? Што запіска была: “На злосць павешуся”?! Якую ён мог мець злосць да жонкі? Добрая, рупная. Нідзе не валачылася, глядзела на яго, як на абразок...

— Вы, дзеду, мала ведаеце, бо з кулясачкай толькі па падворку топчацеся. А яна ж маладая. Толькі глянь, зноў замуж пойдзе, я сам яе ахвотна ўзяў бы хоць сёння, — смяецца стары кавалер Здзісек, выразна на лёгкім “цыку”, увесь у бруднаватым джынсе.

— Мог мець нейкую злосць і да маці... — заўважаю няўпэўненым голасам.

У дзеда ўсяляецца фурыя. Аж замахваецца сваёй кульбай на мяне.

— Маўчы! Такое маці, як Гандзя, ніхто ніколі не меў! Усім умела дагадзіць. За іншымі свету ўсё жыццё не бачыла! Усё ў подбежках, усё то сваім бацькам, то свекрам, то дзецям гадзіла. Адзін яе грэх, што таксама сябе не глядзела. Як такой маці Міша мог такое

зрабіць! Такі сын!..

Дзядуля дрыготкімі рукамі бярэцца за кульбу, з крэктам падымаецца і памаленьку ідзе да свае брамкі. У чырвоных вачах слёзы.

Здзісек з кішэні джынсаў выцягае “Maestro”, частуе мяне.

— Калі не хочаш закурыць, мне больш будзе. Не куры, здаравейшы памрэш. Мішка не смаліў. Праўду кажучы, зусім без дайпрычыны павесіўся. Я б на яго месцы Богу ногі цалаваў за такое шчасце, што яму дасталася. У хаце, як у шклянцы, машына, баба такая ў ложку! Мне якую дзеўку там у Беластоку пашукайце.

— Дурань, і ўсё, хоць вучоны! — плюецца солтыс. — Замест жыць, як трэба, то сабе пятлю на дурную шыю закінуў! А мне тут у вёсцы стытыстыку папсаваў, хай яго ліха! Хто ж мог спадзявацца, што такое яму стрэліць? Зусім жа нармальны хлопец быў.

Галіна сядзіць у хаце. З Міхалавай маці прасуюць свежавысушаную бялізну. Прыгожая, стройная брунетка, падстрыжаная пад хлопчыка.

Я мнуся няўпэўнена на парозе.

— Заходзьце. Дзякуй Богу, што не з паліцыі. Ужо нам усё гэта абрыдла, — уздыхае маці, досыць яшчэ маладая, сіваватая мажная жанчына.

— Калі я выходзіла замуж, ведала, што ў Мішы бываюць прыступы дэпрэсіі. Яго ў армію ўзялі, то зараз дамоў адправілі. Находзіла на яго нейкая туга. Усё гаварыў, што так перажывае бяссэнсавасць існавання, войны на свеце, гвалт і голад на зямлі.

— Ведаеце, сядзім за абедам. Есць катлету, адсуне талерку, маўчыць, і потым кажа: “Гляньце, мама, мы забілі звера, ямо яго мяса, а ў Афрыцы дзеткі з голаду пухнуць, нават адной бульбіны не маюць. Жывецца мне так добра, а ўсё здаецца, бы грашу. За што мне Бог даў такое шчасце?”

— Лячыўся ад дэпрэсіі?

— Ездзіў у амбулаторыю, прымаў таблеткі. Так папраўдзе то хіба ніхто і не ведаў пра яго нямогласць. — Галіна зачыняе камоду. — Я пакахала яго за яго ўражлівасць. Быў зусім непадобны да іншых мужчын, якіх я ведала раней. І цудоўна з ім жылося. Быццам хто зачараваў...

— Адна бабулька казала пра прадказанне ў царкве, і пра тую кветку, што вам на шлюбе падарылі.

— Так, баба Маланея была ў нас заўчора. Вырвалі мы тую гартэнзію і спалілі. Не веру я ні ў чары, ні ў забабоны, але мама ўперліся. І тая свечка... Здавалася, што халодны вецер прабег па царкве...

Пад плотам ляжыць горбачка попелу і паморшчанае, карычневае недагарэлае лісце. Гэта рэшткі тае злашчаснае кветкі, якую падарыла шчаслівым маладым суседка.

— Яна сябравала з Міхасём, — кажа паціху Ганна Брук. — Умела з ім размаўляць, мелі свае сакрэты. Мне здаецца, што, хаця старэйшая ад майго Мішы на пятнаццаць гадоў, штосьці там у іх было. Але што, мала ёй кавалераў? І старых, і маладых! Нябрыдкая, можа знайсці сабе аматара! Чаго да Мішы прычапілася? Але, вось, бачыце, нашага Мішу ўсе людзі так любілі, паважалі... Не кажу гэта толькі таму, што ён мае дзіцё. Нават чужыя сабакі, каты за ім проста ўлягалі, хадзілі за ім, як прывязаныя. Якую ж злосць ён мог мець на жыццё?..

## Цуд над Семяноўскім возерам

Над Семяноўскім вадасховішчам хлопцы сустрэлі цуд. Кажуць, *мусі* русалка гэта была, бо як жа іначай назавеш такую істоту — надзвычай прыгожую бландзінку з доўгімі да пояса распушчанымі валасамі,

бледную з твару ды зеленавокую?.. Па чым тутэйшыя следапыты Юзаф З. і Мікалай Б. распазналі, што тая дзеўка — незямная? Мала такіх можа паявіцца тут, у такім цяпер людным месцы? Магла ж тая паненка быць хоць бы турысткай, калі не з Гайнаўкі ці Беластока, то нават і з нейкай Варшавы. Тутэйшых дзевак, маладзіц, цётак і бабуль усіх як адну могуць нам пералічыць Зютак З. і Колік Б. з заплюшчанымі вачыма — няма такое ні ў Нараўчанскай, ні ў Міхалоўскай гміне. Думалі ўжо нават, што гэта была якая ўцякачка з-пад Ваўкавыска ці Свіслачы. Ну, бо калі б гэта была турыстка, то мела б з сабою нейкі багаж, так ці не, — рукзак, спальны мяшок, а то нават і сваю палатку, а тая красуня была ў адной сукенцы, і то слабенькай, выцвілай, пашытай па старой модзе. Да таго і зусім босая. І яшчэ ж, што адразу звочыў Коля, не мела станіка, і хоць кавалеру, нават старому, не ўсмак такія грудачкі, што тырчэлі ў паненкі ў тым месцы, дзе павінны быць *цыцкі*, на густ Міколы, *як гарбузэ*, то і так закіпела ў ім кроў, бо зблізку такое пекнае дзеўкі даўно не бачыў.

А яна падышла да вогнішча, на якім Коля з Зюткам пяклі сала на палачках, нахілілася да Колі і, хаваючы ад полымя за яго плечуком бледны твар, прашаптала хлопцу ў вуха, быццам ветрык павеяў:

— Мікола , гэта ж я цябэ так шукала...

— Ігы, мане, кажэш?! А скуоль ты сама ўзяласэ? Пэўно, хочэш, каб я табе тое-сёе паказаў? Дзе ў нас страшыт у Марушцы або на Падкапуоўскум? Ты, пэўно, якая з газэты, чы навуковэц? Па-пашаму, чую, уміеш. Седай, бары палачку з салом. Ты, як цябэ там звацi, пэўно, Алеся Баршчэўского прафэсара віедаеш? Можэ, вуон цябэ прыслаў?..

— Ага, даўно віедаю. Ужэ з трыццэць ліет будзе, як па падрэчках уначэ яго вадзіла. Думала, звэду ды ўтаплю ў Нарві, забэру ў свуой сьвіет, бо файны хлопэц, а вашых мужыкоў лёгко ў багну звэсьці,

закамзытаці, зацалаваці на сьмэрць і ўтапіці. Ано на такого пальчыком кіўні. Іду, пальчыком клічу Баршчэўского, сьпэваю ему тоненько, а вуон ідзе, подбегом за мною скачэ па купах, і ніяк ні топіццэ, а як да мане дарваўсэ, пачаў складно вэршыком гаварыці, то зарэз і заранка выйшла, пієўні засьпівалі, і мніе прыйшлосэ расою рассыпаццэ... Ты, Мікола, так мане ні цісьні, я хачу з табою, як з чалавіеком пагаварыць, як чалавіекаві прыглядзеццэ, бо вэльмі ж ты добры і харошы...

— Ну, як табіе там будзе, Русалка чы Расінка, чы ешчэ інакш... — расчуліўся Коля, прыхінуў дзеўку да сябе.

— Як ты да его, як да чалавіека, то і вуон да цябэ, як да бабы: сьцягвай майткі! — хруснуў скварачкай Зютак.

— Уой, я ж такого ні нашу! — сарамліва стуліла каленкі Русалка. — І з сукенкаю астаруожно, мніе ее ў дваццэць сёмум дала Прузына з Таніцы. Як я посьлей пакажусе людзям?!

Дзеўка была хударлявая, дробная, ну, амаль у жменю няма чаго ўзяць, але ўсё ж зусім матэрыяльная, бо хоць Колік з Зюткам былі выпіўшы, ведаюць, што мелі ў руках.

— Не быў я ж такі п’яны, каб ні памэтаць! — злуецца Зютак на маю заўвагу пра “Раял”, якім і сёння мяне частуюць. — Я ж сам ее асабісьце цалаваў! Во тут мане ўкусіла, кале вуха! Напраўду, майток ні мела, а якая ж баба бэз трусоў ходзіт?! Станіка якая і ні носіт, але каб бэз іх?! Забі мане, усё добрэ памэтаю! Выпілі ж толькі тры паўлітры на траіх, і то за ўсю ноч. Колькі ж гэто е! Ну, калі б вана была русалка, то чы піла б сьпірт? Але, ваны — духі, і сьпірытус — тожэ дух, і вана посьле ж чы вадою, чы расою расплыласэ, ано рукі ў мане мокры засталісэ. А калі вана — баба, то чы зранку гола пабіегла б? Тут бабы ў ваколіцы нармальные, навэць калі екая п’е, то гола ні бегае па

лесі!

Ніхто ж, апрача Міколы Б. і Юзафа З. не бачыў згаданай істоты — даўгавалосай прыгажуні, тым больш распранутай дагала і босай, пасля іхняй прыгоды за ўрочышчам Марушка.

Я мяркую, што ўсё ж гэта была русалка. Толькі навошта было ёй есці саланіну ды каштаваць “Раял”! Пра шкоднасць алкаголю, у прыватнасці “Раялу”, пісалі і гаварылі шмат, вядома, але адкуль гэта ведаць “вадзяной панне”? Пэўна, праз тую заразу і страціла бедная Русалка падарунак таніцкай Прузыны. А як жа цяпер пакажацца людзям наша, можа быць, апошняя беларуская русалка ў туманныя ночы над Семяноўскім возерам?

Калі здарыцца вам сустрэць тую істоту, дайце, беднай, якое адзенне — міні-спаднічку, джынсы ці нават і фуфайку (толькі не частуйце яе гарэлкай, нават калі будзе вельмі прасіць!). Файная ж дзеўка, і панашаму гаворыць. Можа, з якім нашым хлопцам застанецца, расой не расплывецца?..

## Федзік

Школы ў горадзе не кончыў, плакаў па начах у інтэрнаце і падчас практыкі на фабрыцы, а пілавінкі са станка вінаваты былі ў тым, што яго вочы чырванелі. Федзікава сэрца трапятала, калі даходзіў пах мокрае мяты на далёкім ветры з-над Нарвы, пах сытага торфу, сітніку і трысця на падрэчках. Хутка бег са станцыі ў бок, дзе ў цемнаце, над даляглядам, над якім удзень сінеў зубчаты бераг Белавежскай пушчы, глыбока пабрэхвалі сабакі. Пазнаваў голас сваіх, якія нудна адклікаліся да суседскіх, ці сумна падвывалі на полі, прывязаныя да слупка, пільнуючы

жыта ці рэпу ад дзікоў.

Федзікавы рукі патрэбны ў гаспадарцы. Старэйшыя сёстры пайшлі вучыцца, брат у арміі. Дзе тут пхацца ў вялікія паны, хай вучацца больш здольныя ды крутыя. Чаго мучыць сваю душу, скавытаць па начах, як гэты Рэкс пад месяцам на рэпіску?..

Прыехаў дахаты пад Вялікдзень і не вярнуўся больш у школу. Завялікі ўжо быў, каб яго біць. Маці накрычала, пабурчэў бацька, а Федзік пайшоў даць каровам, спакойна, упэўнена, што ён тут цяпер гаспадар, і ніхто не будзе гнаць яго ў Гайнаўку. Заўтра пойдзе ў пушчу, у шосты квартал, паглядзіць, што там робіцца...

Коля п’е, Збышак п’е... Старыя кавалеры, якім жонак тут не знайсці... Поле палыны зарастаюць і чартапалох, аблогі цягнуцца аж за Рабінку... У Рабінцы крыж калісь стаяў, змуршэў, і няма яго, зваліўся. Федзік яшчэ яго памятае, але хто там пад крыжам ляжаў — хто яго ведае!.. Дата на ім раней выразана была, дзед казаў, 1842 год. За Федзікава жыццё шмат тут змянілася: і асфальт паклалі, і аўтобусы ходзяць, і людзей многа чужых наехала. Але ўсё, аднак, па-старому... Сумна: вясна — араць, сеяць, садзіць; лета — сенакосы, жніво; восень — капанне... Зімой снег ляжыць амаль пад самую страху. Кажуць, што ёсць ваўкі ў пушчы, зноў развяліся. Ласёў бачыў, сарны, дзікі падходзяць амаль што пад клуні і бухтуюць. Сабакі да ўпаду брэшуць, сцерагуць палеткі сваіх гаспадароў, з надзеяй, што тыя не забудуць і прынясуць што цёплае ў місцы...

Федзік знайшоў адрас дзяўчыны ў часопісе. З-пад Варшавы. Пісалі часта, амаль штодзень ездзіў на пошту ў Зяўровачку. Іза вучылася ў ліцэі. Сяброў у яе не было многа, а для сэрца — нікога. Не змагла знайсці сабе братняй душы і дала свой адрас у каляровы часопіс, які выдаецца для вёскі, але які чытаюць не толькі тут. У такім выпадку ніколі не

ведаеш, хто табе адкажа на ліст, але будзе гэта, напэўна, чалавек у нечым падобны да цябе, які шукае кантакту з іншым самотным чалавекам.

Дзяўчына пісала пра ўсё. Аб сваіх праблемах і маленькіх радасцях. Найцяжэй ёй жылося з тым, што была вельмі тоўстай. З такой поўнай дзяўчынай хто пойдзе на дыскатэку, хто пакажацца на вуліцы? Федзік суцяшаў, гаварыў аб іншых каштоўнасцях чалавечай душы. Хлопец стаў дарослым, дзякуючы гэтым лістам і думкам, якія ў ім даспявалі. Так прайшло тры гады. Адзін з лістоў прыйшоў з Аўстраліі. Іза паехала туды да сваёй цёткі. Напісала, каб Федзік не думаў аб ёй сур’ёзна (думак аб магчымай жаніцьбе ў лістах не было, хоць былі яны ўсё цяплейшыя), таму што Іза можа выйсці добра замуж за больш адпаведнага чалавека і ў больш адпаведную для яе краіну.

Федзік бадзяўся па пушчы некалькі дзён, сам галодны і з прагаладнелым сабакам, а пасля адправіў ліст, у якім пісаў аб вялікім сяброўстве, якое намнога мацнейшае ад розных каханняў, бо можа быць вечнае.

Іза вярнулася ў сваё мястэчка. Карэспандэнцыя працягвалася.

Федзік паслаў Ізе радасны ліст — бяруць яго ў армію, у Варшаву, ад якой у мястэчка Ізы — паўгадзіны язды на электрычцы. Запрашае Ізу на ваенную прысягу — урэшце сустрэнуцца! Няхай толькі Іза не баіцца гэтай сустрэчы!

На прысягу дзяўчына не прыехала. Патэлефанаваў, паехаў да яе адразу пасля прысягі (далі яму водпуск на два дні).

Не спалохаўся, калі дзверы адчыніла яму паненка кілаграмаў найменш сто дваццаць. Не бачыў у яе вачах чагосьці, што нагадвае іронію. Пазнаёміла Федзіка з бацькамі і цёцяй, правяла праз мяшчанскія пакоі да сябе, пасадзіла ў крэсла.

— Чаго ты сюды прыехаў! Я табе гаварыла, каб ты

не думаў сур'ёзна! — і дадала брыдкае слова, якое пачуць можна пад піўной будкай, а якое цяжка перакласці нейтральна.

Федзіку заняло дух. Потым доўга гаварыў аб тым, чым было для яго іх сяброўства. Іза мусіла зрабіць гарбату і прынесці кавалак цётчынага пірага (цётцы ўсё ж хацелася дагадзіць госцю, хоць бацькі Ізы бурчэлі на яе, каб не дагаджала гэтаму галадранцу, што хацеў пасягнуць на іх адзіную дачушку і маёнтак).

Пад вечар, калі Федзіку здавалася, што пераканаў Ізу ў тым, што грэх было б разарваць усе ніткі, якія іх вязалі столькі гадоў, у пакой уварваліся Ізіны сябры — тры п'яныя хлопцы і не больш прытомная дзяўчына. Іза нават іх з Федзікам не пазнаёміла. З'явіліся на стале бутэрброды, бацька прынёс віно. Іза не звяртала ўвагу на Федзіка, які заціх у сваім куточку. Уціснулася на калені аднаму са сваіх добрых сяброў, ледзь не прыдушыўшы яго сваімі багатымі грудзьмі. Бацька данёс каньяк. Федзік не піў, думаў, не азываўся на п'яныя зачэпкі.

Іза правяла Федзіка да таксі. Па дарозе на чыгуначны вакзал маўчалі.

Тэлефанаваў потым Ізе некалькі разоў, але яе бацька казаў, што дачкі няма дома. Хлопец раз нават заехаў у Прушкаў і пакінуў на тэлевізары ў Ізіным пакоі запіску, каб чакала пісьма.

Хацеў адаслаць ёй усе лісты і здымкі ў пасылцы, перавязанай чырвонай стужкай, але ж было б гэта як жэст істэрычнай паненкі. Ліст пісаў доўга, амаль тыдзень. Ліст быў доўгі, пісаны густа, клетка ў клетачку, без абзацаў. Укінуў яго ў паштовую скрынку, па дарозе на суботнюю забаву ў Зяўровачцы.

Танцаваў цэлы вечар з дзяўчынай, якую прыкмеціў пад сцяной. Ніхто яе не браў у танцы, пэўна таму, што не была апранутая ва уніформу моладзі — "цюхі" з рынку па вуліцы Кавалерыйскай у Беластоку ці

“Пэвэксу”. Крыся збянтэжана слухала, што каштоўнасць душы чалавечай не ў тым, што ён носіць на спіне...

Федзік правёў гаманлівую грамадку дзяўчат на цягнік у Гайнаўку, а сам памалу пайшоў дахаты, у бок пушчы, што сінім берагам урэзвалася ў ружавеючае ўсходняе неба.

# 3. НАШ ЧАЛАВЕК

## Агледзіны

І не ведала б Нюра, што ў недалёкай гміне жыве Сенік, які ён, колькі ў яго ўсяго ёсць, калі б не стала ўдавою. Яшчэ папраўдзе не нажыліся добра з Жорам, а ўжо ўсяго хапіла. Дзяцей пагадавалі, дзядамі сталі. Лягчэй ужо быццам стала Нюры — стары як бы супакоіўся, пасталеў, кінуў дурэць і п'янстваваць, але ўзяў ды кіпнуў. Адпіў за сваё жыццё вантробы, развярэдзіў сваё сэрца ды нервы ўсёй радзіне. Найбольш зведала ўсяго, вядома, Нюра. Колькі слёз праліла, колькі прастагнала-праенчала, чакаючы з дзіцяткам ля грудзей, калі Жора вернецца з вясёлай кампаніі, або шукаючы яго па ўсёй ваколіцы, цягнучы мужа з-пад платоў... Працаваў, не скажаш, Жора рабіў усё шчыра, і ўмеў колькі — і дом паставіць, і печ зляпіць, і каня падкаваць, вылечыць ад ахваткі, і свінчо закалоць, асвяжыць, як сапраўдны мяснік. Расло яму ў полі і хляве. Але што з таго, калі ўсё праліваў на гарэлку! Вядома, пачало ўсё сыпацца, валіцца тое, што сабе паставіў, поле аддзячвала мізэрным плёнам. Якраз дзеці пайшлі вучыцца ў горад. Нюра, не шукаючы нідзе дапамогі, не плачучы па камітэтах, давяла іх да выхаду ў дарослае жыццё — Юрка скончыў *завадоўку*, пайшоў на працу слесарам,

Міхась, працуючы, закончыў вячэрні тэхнікум, Ганя ліцэй выдатніцай пакінула, на студыі дасталася, паехала вучыцца за мяжу. Жора не пытаўся, адкуль жонка бярэ грошы. А яна бегла амаль з кожным яйкам у краму (сама месяцамі не каштавала яечні), збірала смятану, біла масла, цадзіла сыры, вазіла прадаваць. Ні грыба, ні ягадкі не ўпусціла, ні лекавай раслінкі. У вёсцы ніхто кепскага слова пра Нюру сказаць не мог, можа толькі мужыкі, калі лаяла дзінатуршчыкаў, а найбольш гандляроў гарэлкай і "рускім спіртам", выпівохі найбольшыя, рагаталі: "Дзяўгай, дзяўгай, цюцька, заробіш ад Жоржыка зноў фанар пад вокам!" На мужа таксама рэдка хто калі злое слова сказаў: піў ён жа сваё, жонку на вуліцы за кудлы не цягаў, з нікім не судзіўся, не біўся за мяжу, хіба што часам з-за палітыкі яго жылаватая магутная рука ламатнула ў стол або ў чэрап ідэалагічна іншага субяседніка, паясняючы Жораву дыялектыку.

Не ў час абое, Жора і Нюра, пасівелі, але глядзеліся молада — ён поўны, румяны, яна хударлявая з твару, але не маршчыністая, тоненькая ў стане, грудастая, як маладзіца.

Жорж памёр у шпіталі, раптоўна. Аслаб у Гайнаўцы на вуліцы. Толькі кропельніцу падключылі, як сэрца спынілася. Аджыў сваё, адпіў. Паглядзелі лекары ў Жорава нутро — а там і не было б чаго ратаваць. А ўсім раней гаварыў, што нікацін ды гарэлка кансервуюць чалавека! На пахаванні суседкі лічылі кожную ўдавіную слязу, каментавалі зараз за парогам, пасля мярлін, што Нюра плакала не зашмат. Калісьці на пахаванні было на што дзівіцца — удовы кідаліся ўдол на труну, рвалі на сабе адзенне, валасы з галавы, млелі, дзеці галасілі не сваім голасам. "Жыў-жыў-і-няма!!!" — лямантаваў звон над царквою, калаціў сваім сэрцам паветра, біў у свае бяздушна-металёвыя бакі, шкадаваў Жору, як усіх, якіх штораз часцей праводзіў у апошнюю дарогу. Анюта глядзела на

званіцу, на цёмнае цела звана, што хістаўся ў прасветах вежы, і думала: “Во, хто вечны, прынамсі, больш гадоў пабомкае, чым чалавек. Бо з металу ён. А дай яму лёс зваліцца з вежы, і разваліцца і ён таксама. Не назвонішся, калі лёс не дасць...”

Не паспела Нюра звыкнуцца з удовіным лёсам, як на яе ціхі падворак у засені разгалістых клёнаў пачалі з’язджацца сваты. З такіх вёсак, прасёлкаў, хутароў, пра існаванне якіх нават не падазравала, а назвы якіх у чужой гаворцы гучалі неяк смешна і незвычайна. Думала ўжо жыццё ў самоце закончыць. Вядома, бабуль столькі па вёсках адзінокіх жыве, адзін старэча на пяць-шэсць удавіц, а бабуля, бывае, нават і сотню на сваіх нагах перакрочыць. Трапляліся Нюры нават досыць цікавыя залётнікі, дзядулі непітушчыя, як самі казалі, з добрай рэнтай, да таго з садком, з пчоламі сваімі, з хатай, з вадой, з тэлефонам. Найбольш прыглядзеўся Нюры Сенік. Быў ён у нечым нават падобны на пакойнага Жору — каржакаваты, мяккацелы, румяны, з густым рудаватым чубам над пукатым лобам. Яшчэ гаспадарыў, бо і нестары, а пахаваў ужо другую жонку. Дзяцей у Сеніка не было — дай Божа, да Нюрчыных будзе добры. І той тэлефон у яго хаце ёсць, і ўсё ў хаце, як у горадзе. Цераз вёску аўтобус ездзіць, а ў Сеніка і свая *таксоўка* (праўда, “Трабант”, але ўсё ж — аўто...)

Паехала Нюра ў агляды, узяла з сабою суседку Марысю, каб людзі не гаварылі. Марыся была ў захапленні — вось дык трапляецца Нюры партыя! Расчырванеўся Сенік, забегаў па падворку, выскачыў з хаты ў святочным адзенні, завёў свой “Трабант”, што стаяў ля студні ў траве да паўкола, і папёр у краму за пачастункам, хаця ў халадзільніку было ўсё, каб па-людску прыняць гасцей. Кабеты селі за сталом у кухні, пазіралі праз акно — на вуліцу вылегла ці не ўся вёска, каб паглядзець на Сенікаву нарачоную. А яго штосьці даўгавата не было, пашпарыў, пэўна, у

Гайнаўку, быццам у мясцовай краме не было таго, чым мог бы кабет пачаставаць.

Нарэзалі сабе Нюра з Марысяй хлеба ды шынкі, закіпяцілі ў электрычным чайніку ваду на гарбату, уключылі відэа (Нюра разбіралася досыць добра ў гарадской тэхніцы, бо ейны Юрка меў відзік), ды ахнулі — на экране клубавала голая пара — чорны, як смала, негр ды хударлявая дзеўка ў чорных пантофлях. Плюнула Нюра, шчоўкнула выключальнікам.

— Алё, то пані Анна? — прагучаў у трубцы шэрага тэлефона з дыскам без лічбаў жаночы голас.

— Ага.

— Пані, уцікайтэ з сіетого дому!

— Чаго вам ад мане трэбо?

— Нас тут штыры звоніт до вас! Утікай, як нэ хочэш быті трэтёю ёго офярою!

Нюра войкнула, схапілася за сэрца.

— Марысё, гэты Сенік то забойца, кажут суседкі! Божа мой!

Марыся прыткнула трубку да свайго глухаватага вуха.

— А як жэ вуон іх усіх пазабіваў?..

— Ох, коб вы бачылі, што вуон з бабамі вычворае! Баба раком по хаті ходіт, а то і в город зажанэ іе, ночамі спаті людям нэ дае! У біелы дэнь посэрэд лонкі в копіцю тягнэ!..

— Алё! Ад рака яго жанкі памэрлі? Так кажэце? Я кепско чую...

Дрыжачаю рукою Нюра выхапіла трубку ў Марысі.

— Вуон тут нам каждуй обіцяв жэнітісе, але мы, о, зобралісе і постановілі, што што як што, але жыті побожому трэба. Ратуйтэсе і вы, пані Аню. Мы чулі, што вы такая веруюча. Плюньтэ на того старого чорта!

Пакуль Сенік вярнуўся з поўным багажнікам ласункаў, якіх хапіла б, каб прыняць з тузін гасцей, бабуль ужо і след прастыў. Не чакалі яны аўтобуса,

пайшлі ў другую вёску. Сенікаў “Трабант” бачылі — схаваліся ў кусты ля дарогі.

— Ой, як добрэ, што так *успулчэсно* цяпэр па нашых вёсках, — прашаптала Марыся. — Каб ні той тэлефон у хаці, то трапіла б ты, Нюрачка, у пазурыэ забойцы і *збачэнца*! Такіе зычлівые, сумленные тут кабеты!

— Але ж і бабска салідарнасць мае ўсё ж свае межы, — заўважыла Нюра, вылазячы з кустоў на шашу.

## Антон

Антон Аліфярук не думаў у той вечар выбірацца ў госці. Ідучы ад аўтобуса з работы марыў добра памыцца, ухапіць што ў рот на хуткую руку, пакуль зварыцца бульба ды падсмажацца дзве катлеты, якія купіў на паўфабрыкатах, адкінуць ногі на тапчане... Уключыць тэлевізар, пагартаць “Зоркі кажуць” — паглядзець гараскоп на другі тыдзень: што цікавага можа яго спаткаць.

А што можа яго чакаць! Дзень-штодзённы — работа, фільм і сон. Цыгаркі. Падарожжа да бацькоў у вёску. І нічога больш асаблівага. На танцы ўжо не хадзіў — на маладзёжныя дыскатэкі лічыў сябе Антон застарым, на “дансінгі” ў рэстаранах не меў такое пары, каб варта было на яе выдаваць такія грошы. Трыццаць пяць гадоў — мяжа маладосці, так лічылі ўсе знаёмыя Антона. А якую цяпер кампанію яму, “утылізаванаму кавалеру” шукаць — ці маладую, “неаперанную” дзеўку, якой мела быць ягоная Магда? Думаў, яна нявінны і наіўны падлётак ледзь пасля “матуры”, а яна не была ні нявіннай, ні тым больш наіўнай. Пра такіх гавораць, што “не з адной печы хлеб ела”. Калі ўжо было запозна — нарадзіўся

Вітак — убачыў Антон голым вокам, што сабе знайшоў палову не да пары. Жонка, лянівая ды бяздарная, не падавала нават віду, што хоча быць гаспадыняй, маткай і жонкай.

На разводнай справе было шмат істэрыкі, віску ды плачу. Але развод практычна мала што змяніў у жыцці Аліферукоў. Амаль два гады жылі ў кватэры Антона. Магдзе суд пакінуў дзіцё, як найчасцей рашае суд у такой справе, але малым і далей займаўся бацька. Шукаў сабе кватэру — дом меў астацца пры жонцы, разам з дзіцём, а Антонаву частку мела яна выплаціць. Не хапала, што хату сплаціў са сваіх ашчаднасцяў, грошай, зробленых у Іраку, з дапамогай бацькоў! Вядома, адкуль было ўзяць Магдзе тыя мільёны, калі нават не плаціла за кватэру? Не працавала, жыла за Антонавы аліменты для малога... Назбіралася таго каля дваццаці мільёнаў. Грошы ў касу жыллёвага кааператыва заплаціў Антон пасля заявы адміністрацыі, што пададуць на Аліферукоў у суд і зоймуць кватэру.

Пасля года пачалі паяўляцца ў Магды немалыя грошы, але, відна, працавала яна ноччу, бо выходзіла па вечарах. Антон забіраў малога з садка, карміў, мыў, укладваў яго спаць, вечарамі глядзеў фільмы на сваім маленькім тэлевізарыку ў малым пакойчыку, а былая жонка вярталася на досвітку (прывозілі яе на машыне), валілася спаць, нават не змыўшы “марафет”. Раніцай Антон рыхтаваў сабе і сыну сняданак, адводзіў яго ў садок, сам падаваўся на будоўлю...

Аж урэшце навіна — у Магды зноў будзе дзіця. Зусім як адмянілася, пачала раней класціся спаць, выязджаць на выхадныя. Урэшце знікла на тры месяцы. Прывёз яе малады мужчына з крыклівым немаўляткам. Занялі два пакоі. Вітак прытуліўся да бацькі — у свой пакойчык Антон перанёс ложак малога, ужо нармальны, вялікі, без штыкецінак; Вітак адчуваў сябе дарослым, стараўся зразумець — у яго

цяпер два таты.

Януш, той маўклівы Магдзін партнёр, які трактаваў гаспадара як паветра, здабыў на сплату тыя мільёны; меў магчымасці, займаўся гандлем. Антон забраў свае манаткі і трохі мэблі (свае выбітыя два зубы схаваў у пушачку ад запалак, як калісьці ў дзяцінстве “для мышкі”). Тыя зубы панёс у паліцыю: вось пабіў мяне жончын муж. Дзе? У нашай кватэры, там, дзе прапісаны. Але ж там і Януш Дарманскі прапісаны, як муж Магдалены. А ён сведчыць, што Антон Аліфярук прыставаў да былое жонкі, дамагаецца яшчэ больш грошай, да таго ж хоча ўкрасці сына, якога пад апеку аддаў матцы суд! Ці ёсць сведкі? Могуць гэта пасведчыць сама Магдалена Дарманская і яе госць Стэфан К., пры якім грубіяніў і нішчыў рэчы грамадзянін Аліфярук, да таго ж яўна абяцаў помсту сужонству Дарманскіх!

Прыйшлося без агаворак шукаць Антону новае прытулішча. Наняў пакойчык у самотнай пенсіянеркі — прасіла яго толькі ціха быць і не брудзіць, да таго ж “nie sprowadzać”. Не прыводзіў паненак нанач, выпіваў зрэдку ў кампаніі сяброў у іх сем’ях, курыў няшмат, а дым выпускаў за акно, а акуратнасці магла б Антону пазайздросціць не адна чысцюля-дама — бабуля была рада мець такога кватаранта. Антон цешыўся спакойным жыццём, адно яго толькі турбавала — з сынам мог бачыцца толькі ў школе, Магда не хацела, каб заходзіў у іхнюю хату, на святы не пускала Вітка ні да бацькі, ні да дзядоў у вёску. Вітак скардзіўся бацьку, што няма цяпер для яго месца ў хаце, што найважнейшая — малая Каміля, а “тата Януш” бярэцца за рэмень...

У госці не думаў Антон выходзіць у той дзень, калі пастукаў у дзверы яго дваюрадны брат Яўген.

— Чаго ты, Антось, зваліўся, як сноп? Распусціў нюні, што табе свет нямілы? Збірай старыя косці, пойдзем пагуляць у госці! — густы Яўгенаў барытон

падарваў Антона на ногі.

Пабег бы адразу, але ж трэба пераапрануцца, пагаліцца... Раздушыў Антон цыгарэту ў попельніцы, доўга глядзеў у раскрытую шафу, урэшце выцягнуў швэдар і джынсы.

— Ну ты што, апраніся як след! Касцюм, гальштук, белая кашуля... Не, лепш начапі муху! — Яўген прымерыў да Антонавай майкі аксамітную мушку. — Ну, файна!

— Ты што, у сваты мяне вядзеш, так ці не?

— А хто нас возьме, Антось, калі мы самі не захочам? Ну, яшчэ шкарпэткі, пантофлі... Ну, цуд, не *фацэт*!

Адзяваючыся ў новы касцюм,Антон весялеў. На вуліцы зусім акрыяў.

Паненак было дзве — белая і чорная. Значыць, дзеўка была адна — тая фіялетава-чорная фарбаваная поўненькая весялушка, новы Яўгенаў "улоў", а стройная бландзінка з вострым носікам, удава — прапанавалася Антону. Усё ж — сваты, інакш не скажаш.

Глянулі Антон і Марыся ў вочы адно аднаму, і ведалі ўсё.

Сустракаліся паўгода. Планавалі пасяліцца разам, узяць шлюб. Яшчэ вясной бачылі іх разам. На свята незалежнасці сустрэла я Антона аднаго. А дзе ж Марыся?

— Не для мяне яна. Ведаеш, што яна зрабіла?! Гэта страшны чалавек! Я думаў, што такое, як яна, няма ў свеце, а яна так!..

Што зрабіла Марыся?

Нервавалі яе галубы, што як апантаныя лёталі каля балкона, мецілі пасяліцца ў кветніках, сядалі на парэнчы, вуркаталі, тупалі, брудзілі!.. Пачаставала іх Марыся атручаным зернем. Не прылятаюць ужо крылатыя госці на велізарны, чысты, уквечаны Марысін балкон, не наведвае яе і Антон.

# Як дзве бабе

Колькі жанчын у нашай краіне, а колькі “брыдчэйшага”, хоць быцццам бы мацнейшага полу? Статыстыкі кажуць, што кабет трошкі болей.

— О, не, — скажуць па нашых вёсках, — у нас-то якраз мужчын больш. Колькі кавалераў страціла ўжо надзею...

А не, няпраўда. Польскія статыстыкі сцвярджаюць, што ў вёсках болей кабет!! Таксама “вольных”, але ўдоваў. А чаму ж гэта бабы даўжэй жывуць? Можа, не так яны спрацаваліся, як мужчыны? О не, сённяшнія ўдовіцы ўставалі і клаліся зацямна, гнулі, бывала, спіны яшчэ і за сярпом, за матычкай. І дзяціскаў у іх было столькі, што школы ў швах трашчалі! А што чалавекаў, апроч працы, столькі звяло ў магілу? Махорка і гара. Калі яна печані не спаліла, то замарозіла пад плотам ці ўвалакла пад машыну. А то за нажы браліся, рэзаліся. І маладыя, і сталыя па ўзросту, а розуму як не мелі, так і не маюць. Цяпер кажуць, што ад роспачы п’юць. А маткам і жанкам глядзець на гэта толькі і хаваць іх аднаго за адным. За жыццё наплачуцца, нашкадуюць. Жывёла здохне, і то шкада, а што ўласны чалавек!

І ўдоваў таму столькі цяпер па нашых вёсках. Статыстыку набіваюць.

Значыць, мужыкі сёння ў цане, тыя старэйшыя. Як цуд прыроды яны нейкі. Такі, пэўна, і памяркоўны быў з чаркай, і з курэннем у час адумаўся. Ну, еў усё жыццё “здаровую ежу”, не толькі было на продаж ці дзецям тое яйка, сыр ці кумпячок. Такому дзядзьку цяпер — во! якая цана! Бо хоць нашы бабы ўсё ў гаспадарцы ўмеюць зрабіць, то што мужчынская рука, то яно вядома. А калі хоць нават абы-які мужчынка паявіцца на вуліцы, то аж жыць хочацца, весялей робіцца, — жартуе Верка, хоць у яе самое ёсць свой

уласны чалавек, не такі ўжо і стары і досыць яшчэ дужы. Ён жа зранку і з вечара пампуе малако з кароў, Верка не мусіць амаль да нічога ў гаспадарцы дакранацца. Маглі б, дарэчы, абое на пенсію ісці, зямлю здаць дзяржаве. Але сэрца баліць, як зямля быльнягом зарасце, бо ні свае, ні чужыя яе не хочуць. А зямля ў Веркі і Жоры добрая, тарфяністая, дбала выробленая. Ім добра, сыны прыедуць з Беластока, памогуць, то жартаваць можна. Гумар старых не пакідае, бо не каб той смех, то гатоў жывым лезці ў магілу. Ёсць аб чым пагаварыць на лавачках пад хатамі.

— Ужо перамылі костачкі кума куме, то абгаворым усю гміну. А што тут рабіць, ано серыялы, тыя “Моды на сукцэс” усё глядзець, і чакаць абвознае крамы. Час ад часу — “пагатове”, хуткая, значыцца, дапамога. Звыкліся. Сваіх адводзім да крыжыка ў канцы вёскі, хіба што сям’я залатвіць аўтобус на могілкі. Такі вось серыял у нас штодзень — устаў, дзівішся, жывы яшчэ, то і добра, — кажа баба Стэпа.

А часам “серыял” свой, вясковы людзі маюць. З уласнымі вядомымі акцёрамі.

— З “прыключэннямі”, — кажа дзед Ясько. — З гэтымі самымі, трукамі, як ім там. Такое можна і найграць і пусціць у тэлевізары ў праграме “Смеху варта”, то ці не выйграў бы?

Бо ці не смешна, як старая (якая гэта старасць у 63 гады?) баба ўзлазіць на суседчыну лавачку і амаль прылюдна кладзе на ёй сваю пракуду? За такое паведаміць адразу як не пракуратуру, то хоць ваяводскую санэпідэмстанцыю!

— Гэта злачынства ў афекце, то засудзіць павінны менш, — дзед Ясько робіць сур’ёзную міну; сын ягоны працуе ў судзе, то знаецца на такіх вось справах. — А тут такія страсці! Так бывае ў гарачым каханні, гэ-гэ-гэ. З любоўю няма жартаў.

— Ды якое тут каханне! — махае рукой абдораная

суседчынай кучай васьмідзесяцігадовая Агата. — Ці мне, старой, над магілкай, углядацца ў чужога мужчыну? То ж яму мала больш, як майму сыну! Учапілася Гэлька, што яе чалавек да мяне ходзіць! Жыць не дае! Як мяне яна ўжо ні абзывала! Хай Тодар вязе яе ў псіхушку ў Харошчу, бо як не, то паеду ў пракуратуру ў Беласток!

— Здаецца, Гэлька зусім нармальная баба, ведаю ж яе ад малое, — ківае галавою Яська. — Праходу Агаце не дае. Абазве ад найгоршых, біцца кідаецца. А сама ж такая хароша, як пончык, румяная; я, стары, на яе наглядзецца не магу. Не то, што тая тычка Агата, яе толькі на полі, як пудзіла, паставіць. Эй, дурнота, каб Тодар хацеў, меў бы бабулек паўвёскі, і малых, і вялікіх, і тлусцейшых, і танчэйшых, ано выбірай. Дай, Божа, дайсці Гэльцы да розуму!

І дадае, гледзячы на мяне ацэньваючым вокам:

— Вы толькі не ідзіце да Макаркавых. А то Гэлька палічыць вас наступнай у чарзе, не будзе глядзець на вашы рэдактарскія паперы, а добра ўлупіць!

## Блудная дачка

Варку Віпшу з-пад Саколкі чамусьці бацькі не любілі. Гэта яна заўсёды адчувала, і быўшы дзяўчынкай, і дзеўкай, і ўсё сталае жыццё. Здавалася, што асабліва недалюблівае яе матуля, бо для меншай дачкі, Іркі, заўсёды мела яна пяшчоту, ласунак і добрае слова, а Варку быццам і не бачыла, калі не біла. Таксама і бацька.

— Можа, не была я ягоным дзіцём? — гэта турбуе і сёння пані Варвару, ужо шасцідзесяцігадовую пенсіянерку. — А, можа, мама мусіла праз мяне замуж выходзіць? Бо хіба таты не кахала яна. Быў ён

гаспадар дбайлівы, добры, але і сям'ю, і рэчы, і жывіну трактаваў аднолькава, — дбаў, каб было ўсё накормлена, напоена, каб было ўсё на сваім месцы і не замінала. Хто робіць, той патрэбны. Дарам не есць, карысць дае. Я, як толькі кончыла сёмы клас, папрасіла ў бацькоў, каб пусцілі мяне далей вучыцца. Бо навука мне надта добра давалася. А тата тады сказаў, што пара мне ісці на свой хлеб, бо дарам аддаваць грошай не будзе. Прыходзілі да нас дадому і настаўнік, і дырэктар школы, але тата быў няўмольны. Спакавала я сваю сукенку, паліто, падушачку ды паехала ў Беласток.

Варцы пашанцавала — узялі яе на працу ў краму, спачатку прыбіральшчыцай. Наняла пакойчык у маленькай хатачцы на Баярах, за дапамогу ў апецы. Запісалася ў вечаровы ліцэй. Праз год перавялі яе на прадаўшчыцу, бо добра кеміла ў матэматыцы ды сумленная была. У ліцэі мела адны пяцёркі. Ды гэта, на жаль, не цешыла бацькоў. У чэрвені, пасля першага класа Варка паявілася на родным падворку, у новай сукенцы, з выдатным школьным пасведчаннем у кішэні. Бацька выйшаў на ганак. "Ты чаго прыехала, дармаедка?! Нажэрціся?!" — гыркнуў. Дзяўчына павярнула назад.

Слала пісьмы дадому, але не чакала ўжо адказу. Паведамляла маці, як ідуць справы. Сястра наведала яе пару разоў у Беластоку, купляла сабе новую вопратку, хвалілася заляцанкамі кавалераў і тым, што бацькі выпраўляюць яе вучыцца на краўчыху. Але доўга Ірка не пабыла ў тэхнікуме, праз паўгода справілі ёй вяселле з багатым хлопцам.

Варка знайшла сабе кавалера ўжо на студыуме. Тады ўжо працавала бухгалтаркай. Хлопец быў таксіст з "Фіатам", прыгажун, нічога, што католік, бо гатовы быў браць шлюб нават у царкве. Але Варка пайшла за ім у касцёл, бо ж гэта Юркавы бацькі зрабілі ім вяселле. Ні сястра (бо якраз нарадзіла), ні

бацькі не прыехалі, ано цёця Зося з Сухаволі пабыла гадзіну на банкеце.

Павезла Варка сваіх двух сыноў у вёску, пахваліцца. Раз. Дзеткам было крыўдна — баба Надзя дала цётчынай Алі вялікі шакалад, а ім батончык на дваіх! Нават не прытуліла, не пагладзіла па галоўках. А дзед Адам песціў Алечку, гушкаў, а да ўнукаў словам не азваўся. Не падабаўся Надзі і зяць, хоць у яе з ім размова больш клеілася, чым з дачкою. Калі Варка з ім развялася, Надзя паківала галавою: "А хто ж з табою вытрымаў бы, бэмба ты! Не ўмела яму дагадзіць, то знайшоў сабе іншую!"

Юрка на працягу семнаццаці гадоў не мог ніяк справіцца з аліментамі. За той час паспеў дарабіцца яшчэ чацвёркі малечаў з рознымі панямі.

— І што яны ў ім бачылі? — дзівіцца сёння пані Варвара. — Ну, у свой час быў ён відны хлопец, гжэчны. Было на што прынамсі паглядзець, абы толькі рот не раскрыў. Але, папраўдзе, то неахайны, нудны ён бамбіза. Каб я з ім была, то нічога не дарабілася б. А так у хаце хоць спакой быў. А наймалодшай вось Юркавай каханцы дваццаць пяць гадоў, сына яму нарадзіла. Жыць з ім не хоча, ано каб грошы ёй плаціў...

Нічога Варка са свае хаты не ўзяла за ўсё жыццё. Толькі родную матку. Перадала была Надзя пасля смерці Адама малодшай дачцэ гаспадарку, а тая адправіла яе ў "дом старцаў". З плачам паявілася маці ў Варчынай кватэры, да таго ж пад руку са сваёй сястрой Зосяй, таксама бяздомнай. Давялося Варцы ўзяць іх пад свой дах. Цяпер жа жыла адна, з сабачкам толькі — аднаго сына адправіла ў Амерыку, другога ажаніла. Ужо пенсіянерка, але ўсё пры рабоце — дасведчаная бухгалтарка з камп'ютэрам заўсёды мае цану. Ні слова не сказала Варка маці пра былое.

Першая памерла ціхая бабулька Зося. Суседзі заўважылі, што сабачку выгульвае цяпер адна

маўклівая сухенькая, сутулая старая. А пасля і яна перастала выходзіць з блёка. Адмовілася есці. “Атруціць ты мяне хочаш, Варка. Я ведаю. Ты мяне ненавідзіш, хоць нічога не кажаш! Не буду я есці нічога!”, — упіралася. Бегала да суседзяў, каб купілі ёй рыцынавы алей, апаражніцца ад атруты. Пасля сашчаміла бяззубы рот і не брала ні кроплі, ні крышынкі. Стагнала: “Ты мяне не любіш, Варка! Я гэта ведаю!” У Харошчы спрабавалі карміць яе цераз кропельніцу. Пахавала Варка маці побач ейнае сястры, паставіла ім помнікі на магілках.

Цяпер Варка купіла новую кватэру. У старую пасяліла сына. Мела за што. Спадчыну атрымала па Ірцы, па адзінай сваёй сястры. Ірчын муж з дачкою і зяцем разбіліся пад Кузніцай. У Алі дзяцей не было, з мужам была развялася. І ўсё — і змеханізаваная гаспадарка, і заходні аўтамабіль, і дом мураваны са ўсімі стадоламі-хлявамі Варцы засталіся. Прадала яна ўсё хутка, каб і не глядзець на гэта.

А цяпер ізноў муж былы, Юрка, дахаты да яе просіцца. Пастарэў, прыхварэў. Няма куды яму дзецца. Сыны за тое, каб маці дала шанц старому, каб даравала. Хай хоць унукі маюць дзеда!

## Чалавечыя словы

Бурык быў калісьці сабачыска харошы, бліскучы, круглабокі. Ну, вядома, старасць нікому не ў радасць, хоць, кажуць людзі, бачылі істот “пагоднай восені”, прынамсі, так іх называюць... Зусім як і з ягоным гаспадаром, Анісам. Здаецца, хоць стары, паліняны, а ўсё ж удавіцы з чатырох навакольных вёсак, будзе з два тузіны, на Аніса пазіраюць і ў самоце ўздыхаюць: хоць жыве адзін (з Бурыкам), то і сыны яго

наведаюць, і хоць нагу яму адымае, дае сабе раду ў хаце, нават гадуе курэй, індыкаў, свінчо, трымае кароўку, а пенсію мае за гаспадарку і за працу ў міліцыі. Чэпае сабе паціху па свеце, уголас не плача, міласці не просіць.

Адно ў Анісы і ў Бурыка асталося з маладых гадоў у непарушным стане: нюх! Нос, вялікі і мясісты, у Анісы чулы да смачнай ежы. Добра корміць сябе стары, на такое не шкадуе, бо ўдосталь пояс заціскаў у галоднае і босае маленства і безбацькоўскае юнацтва. І Бурыку не шкадуе цёплага тлустага супу, салідных костак, заскваранай кашы. На хутарах смяюцца, што хоць Бурык есць не менш, чым свіння, ды сваімі рэбрамі толькі кепскую славу прыносіць гаспадару. Не морыць сябе і сабаку голадам дбайны гаспадар, але і сам кашчэй, і цюцька ў яго худы.

Вылезе Бурык з будкі, скаланецца сваім цяжкім целам, лусне зубамі па сваіх баках, пачухае задняй лапай за вухам, падыме нагу для палёгкі, акіне падслепаватым вокам маёнтак, і акунаецца ў мора пахаў. Вось цяплом дыхае гной з Фросінага хляўчука, то ад пярэстай курыцы нясецца пах чыстага пер'я і запэцканага яйка, то ў Бурыкаў нос востра заходзіць маразок ад бяроз на пагорку... Гарачыя бульбяныя лупіны, тоўчаныя з восыпкай, каровіны добры пот, змешаны з малаком і сенам. Гаспадаровы злежалы тытунь і едкі дым, ад якога Бурыку робіцца нудна ў сярэдзіне і млявы пах "гумафільцаў" каля самога Бурыкавага носа. Замерзлы хлеб, крупінкі кашы на костцы...

Дзед Аніса сёння пах ялінай і смалой. З-пад шопкі даносілася кахаканне — глухі кашаль з перакураных бронхаў — і цюканне сякеры, — стары сек дровы. Бурык нервова заклубаваў на свежым сене ў будцы, спачатку стараўся ямчэй улегчыся абаранкам, то зноў вылазіў на холад, бразгатаў ланцугом, цягаў яго па снезе, пераступаў з лапы на лапу, варочаў міску.

Бляшанка клацала то донцам, то берагамі аб цвёрды стаптаны брудны снег. Не, Бурык не быў галодны, і нічога яму не балела. Праўда, карціла крыху пабегаць па лесе, абнюхаць знаёмыя куткі; у апошні час дзед Аніса баяўся спускаць сабаку з ланцуга нават ноччу — ляснічы Давідовіч страляў як апантаны "дзікіх" катоў і сабак, што адышліся за сто метраў ад гаспадаркі. Сто метраў ад іхняй хаты стаяў лес — спачатку шчыльны маладняк, далей бор, густа падшыты маладым лістовым гаем і кустамі, а затым пачыналася пушча. Туды, бывала, у маладосці, сарваўшыся, бегаў Бурык з сябрамі, лавіў зайцоў. Ужо пад старасць сцягваў ашыйнік з намуленай, лысай шыі, бег куды вочы глядзяць, слухаючы як свішча ў вушах вецер, распасціраючы лапы на ўсю моц, а цяпер нават і бегаць не хацелася. Ламаў раматус нядужыя ўжо лапы, асабліва дранцвела задняя правая, ад пят да самага азадка, — пачаставаў яго ляснічы жменяй шроту... Не мог сёння супакоіцца Бурык, пазіраў то на дым, які цёмнай пасмай віўся з коміна, то на старога, які няскладна калдыбаў па падворку.

Дзед падышоў да будкі, засадзіў кароткі тапор пад фуфайку, расшпіліў ашыйнік на Бурыкавай шыі.

— Ну, пабегай. Свята і ты маеш. Не бойся ляснічага, зрэшты, другой смерці ніхто яшчэ не дачакаўся. Ідзем па ялінку. І мяне за гэта не павесяць. Калі нават *заштрахуюць*, то не будуць мець што з нас браць...

Бурык то забягаў наперад, то пятляў наўкол старога, качаўся ў снезе як шчанюк, уздымаючы веер сыпучага пылу. Раптам знік.

Даходзілі да шашы, па якой нядаўна праехаў аўтобус (нават Аніса ўхапіў у ноздры далёкі пах бензіну). На дарозе, засыпанай пакрышанымі коламі снежнымі косткамі, нікога не было. Аніса спусціўся з насыпу за прыпынак, увайшоў у гушчар малінніку, прарослы гнуткімі бярозкамі, але сабака астаўся на

шашы, забегаў каля будкі прыпынка. Заяхкаў, быццам учуў звера. Аніса пабрыў далей у лес. Сабака скаціўся з насыпу, прадзёрся цераз маліннік, схапіў гаспадара за лямцавую халяўку чобата.

— Ты чаго! — тузануў да сябе нагу Аніса. — Ты што там знайшоў? Пайшоў прэч! — але сабака не адступаў, гурчаў усхваляваны і злосны, што гаспадар не разумее ў чым справа. Адбегся, зацяўкаў тоненька як шчанюк, вярнуўся, брахнуў басам. Аніса рушыў назад.

Пад лаўкай на прыпынку стаяў доўгі лазовы кошык з клетчатым пледам пад самую дужку. З кошыка прабіўся тоненькі, як камарыны, піск. Сабака ўжо ўхапіў ражок пледа, засунуў нецярплівую пысу ў сярэдзіну. Дзед здранцвелымі пальцамі разгарнуў знаходку. Зірнулі адтуль на яго цёмна-сінія, запухлыя ад плачу вочкі.

— Яй-ёй! А то тут... на табе... тое... Ат, ёпіхума, б... не маці цябе тут пакінула, ах дзіцятачка ты, сіротка... — схапіўся дзед за сэрца.

У вёску першы ўбег Бурык, абвяшчаючы навіну сабакам і людзям. За ім, амаль на кожным кроку спатыкаючыся, калдыбаў дзед Аніса з цяжкай ношай то на баку, то перад сабою. Да солтыса нёс знаходку, да Сяргея Бароўскага, адзінага маладога гаспадара (таму і выбранага солтысам дэмакратычнай пенсіянерскай большасцю), у якога ў хаце быў тэлефон.

Збегліся бабы. Дзіцятка яшчэ не прастыла, акутанае ў каптанікі, швэдрыкі і тры пары паўзункоў на пялюшцы "пампэрс". Добра, прыгожа быў адзеты малы, з пасагам — тры замежныя пялюшкі, дзве бутэлькі з малаком. Старая Юлішча, умела адклеіўшы пялюшку, сцвердзіла, што нечаканы госць гэта кавалер. Заохалі, заўздыхалі, зацмокалі бабулькі — даўно не бачылі немаўлятка ў іхняй вёсцы, яшчэ, здаецца, нядаўна такой люднай. Пакуль прыехаў

доктар і паліцыянты, у пакоі стала быццам цяплей ад гэтых ахаў і охаў. Бурык таксама ўдзельнічаў у агульным захапленні і цудзе, тоўкся пад нагамі, уставаў на заднія лапы, каб агледзець дзіва.

— А пайшоў ты, скаціна! — махнула яму па носе баба Насцечка, пахучая часнаком, хлебным цестам і авечай воўнай. — Хто цябе сюды прасіў, заразу!

— Гэта ж ён знайшоў малое, — пагладзіў Бурыка па гарачай лабэсіне гаспадар. — Малайчына! За такое трэба медаль даць!

Ужо ўзыходзіла першая зорка, як пад хатай забурчэлі машыны. У хаце стала яшчэ цясней, і Бурык падсунуў сваё старое стомленае цела бліжэй да печкі-сцяноўкі. Брала яго дрымота, уздыхалася, разнімаліся пашчэнкі, плюшчыліся вочы. Пахла добрым, дарагім, пяшчотным. Людзі тапталіся, шапталі, крычалі, пыталіся, малое кугакала, а сон нахлынаў на сабаку як магутны лес. Але ўспомніў: сёння ж Вілея! У такі вечар можна прамовіць жывёле чалавечымі словамі!

— Ну, памаўчалі б крыху! — азваўся Бурык з-пад печкі.

Ніхто гэтага ці не пачуў, ці не зразумеў. Толькі немаўлятка замоўкла, вытарашчыла вочкі, павярнула чырвоны тварык ад трасучай яго на сваіх вялікіх грудзях бабы Ганны Бароўскай у бок старога сабакі.

Яно першы раз зразумела чалавечыя словы.

## Найму хату добрым людзям

— Найму хату добрым людзям, найлепш нашым, — вырашыў Іван Ванякоўскі. Вярнуўся пад старасць у вёску, сваю трохпакаёвую кватэру ў цэнтры Беластока хацеў пакінуць наймалодшаму ўнуку, які студыяваў у сталіцы. Утрымаць такую хату за пенсію цяжка

аднаму, нават калі яна, тая пенсія, немалая, бо ваеннага ветэрана. Абы людзі хоць чынш аплацілі і крышку больш далі, каб які рамонт час ад часу зрабіць — вядома, людзі, як і рэчы — псуюцца.

Узяў Іван на кватэру маладое сужонства Агату і Янка Суркоўскіх. Занялі яны два пакоі. Трэці хацеў гаспадар зачыніць на ключ, для сябе. Прыедзе раз у месяц, пенсію ўзяць ды аплаціць хату... "Не зачыняйце пакоя на ключ! — параіла Агата. — А што будзе, калі, напрыклад, батарэя лопне ў гэтым пакоі? Мы ім карыстацца не будзем. А і кніжачку пакіньце, самі ўсё ўплацім". — "Ну, добра, але не заглядайце сюды. Тут мае рэчы хай ляжаць. Тут усяго няшмат, але ўсё ж... Калі буду прыязджаць па пенсію, пазваню раней".

Кватаранты паводзілі сябе беззаганна. Суседзі не наракалі. Праўда, час ад часу гучала там музыка, але не нашмат гучнейшая ад дэцыбелаў, што даляталі з цэнтральнай вуліцы Беластока. Гаспадар прыязджаў раз у месяц, чакаў пісьманосца з пенсіяй, аглядаў хату, ці дзе што не патрабуе рамонту. Было досыць чыста. Праўда, у Агаты з Янкам надта ж рэчаў многа з'явілася — ну, вядома, маладыя, нажываюцца.

Аднойчы прыехаў Іван, не пазваніўшы. Трэба было лекара яму наведаць. З кухні даляталі прыемныя пахі. Іван скінуў куртку, з цяжкасцю знайшоў свае шлёпанцы, пайшоў у ванную памыць рукі. Зайшоў на кухню. Там завіхалася нейкая чарнявая цётка ў халаце.

— Я — Гаяна, — прадставілася жанчына. — Ты сюды? А колькі табе прыходзіцца на дзень?

Ванякоўскі пачухаў патыліцу, усеўся за сталом.

— Ну, хопіць мне 30 злоты на дзень, каб аднаму пражыць. Не раскашэлішся. Усё купіць трэба. У вёсцы танней выходзіць, не тое, што ў горадзе.

— Нам прыходзіцца па 20 злотых ад чалавека. Галоўнае, добрае месца.

— Гэта, як лічыць. У Беласток з мае вёскі даезд добры, — падзівіўся Іван, як Гаяна спраўна рэжа хлеб на бутэрброды.

— Іван, частуйся. Хочаш супу? Наварыла на дзесяць чалавек, то і яшчэ аднаму хопіць. На свежай баранінцы, еш.

— А што, вы ў госці прыехалі?

— Э, тут мы ў Беластоку ўжо свае! Курсіруем амаль два гады, роўненька, як "Чэленджэр"! З гандлем горш цяпер ідзе, не тое, што раней. З базараў нашых ганяюць. Добра, што маем дзе жыць, спакойна тут. Але ж дзяруць з нас гаспадары! Уяві сабе — 20 злотых ад асобы! За суткі! Але бяспечна сябе адчуваем, зусім як у роднай хаце. Нас цяпер тут дзесяцёра.

Іван утаропіўся ў Гаяну:

— Вы што, вы тут жывяце?!

— Месца пастаяннае, добры даезд. Нават ключы маю. Толькі ў адзін дзень нам загадалі Агата з Янкам хату пакідаць. Чаму? Мы сумленныя, плацім ад рукі. Але пашпарты спісваюць. І маюць рацыю — так павінан быць: не вядома ж, каго ўпускаеш дадому. Але маглі б ужо зрабіць крыху рамонту, тараканы бегаюць. За апошні месяц зарабілі ж на сваім гатэлі амаль 60 тысяч! Падаткаў жа ж не плацяць. Маглі б крыху спусціць цану...

— А дзе ж яны жывуць самі?

— Купілі сваю кватэру. Пэўна, за заробак на гатэлі, бо, здаецца, самі нідзе не працуюць. Янак круціцца пры рынку, але што там робіць — не наша справа.

Івану бутэрброд стаў у горле колам.

— А ты што, брат, робіш? — зазірнула яму какетліва ў вочы нестарая армянка.

— А от, на пенсіі. Ветэран.

— О, як на вэтэрана, зусім добра трымаешся. Мо, удавец?

— Ага. А што, маеш для мяне нейкую дзеўку?

Люблю смуглявых.

— Ну, Іван, то можам зрабіць інтарэс. Возьмеш фіктыўны шлюб са мной, добра табе заплачу. Праўда, я яшчэ не развялася, але гэта ў нас хутка. І хутка магу з табою развесціся, не бойся.

— Фіктыўны?! Ты мне падабаешся.

— Неразумны ты, Іван. Калі можна зрабіць інтарэс, там няма сентыментаў.

— Кажаш, Гаяна, плаціш заўсёды рэгулярна?

— У мяне, Іван, як у банку. І парадак трымаю, чысціню люблю.

— Ну, добра. Тады ўсе рахункі рэгулюй са мною, бо я тут гаспадар. Вось мой пашпарт, ордэр на кватэру. Зараз іду змяніць замкі. А ў разліку пагаворым яшчэ мы з табою, Гаяна, як сівы беларус з чарняваю армянкай.

Давялося Івану пасядзець у сваёй хаце да раніцы, чакаючы, калі паявяцца "гаспадары" па грошы. Было весела і прыемна — кампанія частавала яго арыгінальным каньяком. Кампанія не абы-якая: трое медыкаў, два шафёры (адзін — Гамлет!), былая акцёрка, два былыя студэнты — адзін філолаг, другі матэматык, прадаўшчыца, ну, і Гаяна, бухгалтарка. Культурныя людзі, якіх бяда і патрэба загнала ў далёкі край. Нагаварыліся, наспяваліся. Раніцай, пакуль рушылі на рынак, завітала Агата.

— Гаяна, давай грошы! — крыкнула яна ад парога і войкнула, убачыўшы гаспадара: — А... гэта вы?! Адкуль вы сёння тут?!.

— Замкі зменены. Сядай, мілая, будзем разлічвацца. Гамлет, Рафік, вытрасайце з гэтай сукі даўгі.

На жаль, не ўдалося разлічыцца Івану Ванякоўскаму з "маладой спакойнай сям'ёй нашых людзей". Кватэру ж уступіў ім Іван без прапіскі. Грошы, зробленыя на "гатэлі", паспелі ўкласці яны ў сваю хату ў сучасным квартале горада.

Гаяна Івану зусім даспадобы. І варта мець

знаёмую – добрую, сумленную, паўнагрудую бухгалтарку, якая разбіраецца ў справах.

## Да апошняе крыві

Цудам не страціла жыцця на падворку суседзяў Ганна Канцавая. А Насця Карацінская лечыцца ў Беластоку ад нерваў. Гэта апошняя кропка старое вайны ў Нарожках.

У вёсцы Нарожкі гаспадароў ужо няшмат, такіх, каб мелі свае абробленыя гектары, хлявы, поўныя паршукоў ды з тузін кароў у аборах. Але калі нават маеш тую адну фросю ды рагулю, ды акрайчык агарода і жывеш з пенсіі — ты і так пан-гаспадар, бо на сваім робіш.

— Як хто рабіў добра, трымаўся зямлі, то яму сёння сэрца баліць, калі твая зямля ляжыць аблогай, нікому непатрэбная, — матае галавою ў цёплай хустцы баба Насця Карацінская, удава ад пятнаццаці гадоў. — Калісь усе за тую зямлю біліся, з горла выдзіралі сябе апошні кавалак, каб аплаціць адвакатаў, бо за мяжу судзіліся па дваццаць гадоў!

Баба Насця жыве адна з коцікам, цюцькам і каровай зіму, вясну і восень. Летам да яе прыязджаюць унучка Веся і праўнук Радак. На канікулах у вёсцы дзяцей шмат — унучанят, меншых і большых. Шум і віск, кажа бабка, глухі і то пачуе, але і радасці колькі. А і крыўды...

— Прыехала Весечка да мяне. Толькі Юрка ад’ехаў, хапіла малая сваю торбачку з ласункамі і просіць: “Бабку, я пабягу да Канцавых, там да іх прыехалі Юлітка, Паўлінка і Роберт”. Я ёй кажу: “Адпачынь, не бяжы туды, там іх столькі, што не вытрымаць. Заўтра пойдзеш...” Да Гандзі Канцавое летам звальваецца

капа народу, дзеці чатырох сыноў, унукі. Так занадзіліся, што ў кожнае свята пруць да старых. З іх усіх, каб якая дапамога ў хаце была, у гаспадарцы, то не вельмі. Толькі Коля, не прасі яго нават, бярэцца за ўсё — як вылезе з аўтобуса (у астатніх усіх ёсць *таксоўкі*, а ён не дарабіўся, ці то мецъ яе не хоча), скідае гарадскі касцюм, чаравікі, адзявае цікавы “выхадны” касцюм ды чобаты, і адразу ў поле. Павел Канцавы, вядома, цешыцца, што сам яшчэ сілу мае, і сям’я так разраслася, што прыязджаюць, але пройдуць дзень-два, то стары за галаву хапаецца — куды ні стань у хаце, усюды пасцель ляжыць, на пліце ўсё варыцца для тае плоймы, поўна віску, шарпаніны, вядома, як з дзецьмі. Яшчэ адно дзіця туды не ўціснуць, нават на падворак. Але, вядома, Весечцы хочацца паґуляць, пацешыцца, пахваліцца. “Бабу, у мяне ёсць шакаладкі, пачастую іх, не з пустымі рукамі пайду. Даўно іх не бачыла...” І пабегла да Канцавых...

Канцавыя і Карацінскія былі перасвараныя яшчэ з таго часу, як з бежанства вярнуліся. Можа, нават і даўжэй, мяркуе сусед Антон Хадак, старажыл, але памяць яму служыць. Хвядось Канцавы і Сёма Карацінскі яшчэ перад першаю вайною да крыві біліся за дзеўку, ды яна трэцяга выбрала. Сварыліся то за сабак, то за свіней, то за абкошаную палоску... Канцавыя вельмі ж натуры прыдзірыстыя былі, скажы слова, не даслухае канца сказу, кідаецца ў злосць, бы ты яму найгоршы вораг. Кажуць, у каго хата з краю, той і ціха сядзіць, нічога не бачыць. Дом Канцавых доўгі час з краю вёскі стаяў, пакуль Нарожкі не рассыпаліся хутарамі, але Канцавыя, якім і прозвішча такое запісалі ў пашпартах, усюды былі першыя — і на воку ў людзей, і кожнаму ўмелі пад скуру залезці. Ды што тут памятаць пра тыя справы, калі чалавеку да шчасця патрэбны сажань зямлі — так мяркуе цяпер дзед Антон, пераўжыўшы пару войнаў, бунтаў і мардабояў — ад міжнародных, міжнацыянальных да

міжсуседскіх, а жыць чалавеку хоць на старасць спакайней хочацца. Вядома, боль у людзей нейкі астаўся, бо найдаўжэй памятаеш крыўду.

Вось пасля апошняе вайны ў Карацінскіх жаль у сэрцах запёкся, бо быццам бы з-за Міколы Канцавога іхні Пеця ў Сібір паехаў. Гэтая справа ніколі не была высветлена, хоць пасля вайны доўгі час выгаварвалася пры кожнай нагодзе. Часам хто з суседзяў быццам спецыяльна наводзіў кампанію на тую тэму, каб мець відовішча з раз'ятраных мужыкоў. Другі голас вялі бабы — таксама заўсёды знайшлася нагода, каб наляскатацца хоць бы за яйка, згубленае сваёй курыцай у чужой крапіве, ці за гузак на галаве дзіцяці. Калі маладыя павыбіраліся ў горад, страсці быццам бы прыціхлі.

У 1973 годзе Карацінскія з Канцавымі пабіліся былі ў апошні раз; Павел Канцавы пачаставаў Сашу Карацінскага штыкетай па галаве, іржавым цвіком распароў шыю. Іван Джала і Восіп Мядзьвецкі спрачаюцца пры мне між сабою, хто ў сапраўднасці быў тады вінаваты. Пачаў Саша, кажа дзядзька Восіп, бо чаго ж было разумнаму чалавеку лезці да падхмеленага Паўла, калі вядома, што будзе біцца да крыві? Саша быў стаў у абарону Толіка Зырэцкага, і за тое праляжаў месяц у бальніцы. Ледзь размінуўся са смерцю, кажа дзед Іван, той цвік прабіў цела міліметр ад аорты. Міліцыя і суд палічылі гэта агульнай бойкай. Усе бомкалі, што Канцавыя замазалі справу, Паўла нават не арыштоўвалі, сваяк адразу дахаты прывёз, той, што ў павятовай міліцыі тады працаваў. Дарэчы, што пра такое праз чвэрць веку ўспамінаць! Сёння судзіцца, здаецца, няма за што — Насцю-ўдаву Канцавыя не чапалі, а дзеці, калі спаткаюцца, маюць іншыя тэмы да гаворкі. Пра зямлю ніхто нават не ўспомніць, бо глядзелі б як на дзівака ці дурня, не то што за яе судзіцца! Каму яна патрэбная, хіба што ім, старэчам, пару сажняў у

вечнае ўладанне, пакуль не рассыплецца цела і памяць у порах. Цяпер маладыя і юнакі, што ў Нарожкі прыязджаюць на лета, да позняй ночы слухаюць магнітафон з ангельскімі песнямі, да дзядоў па-польску азываюцца, як і тыя да іх. Весечцы Насцінай вось дванаццаць гадоў, яшчэ не дзеўка, а ўжо пазірае на шаснаццацігадовага Гандзінага ўнука, Роберта, але ўсё ж большы ў яе інтарэс да малых, бо ж дзіця яшчэ. Што ёй разумець у нарожскай даўнечы...

Вось тады схапіла яна сваю торбачку з цукеркамі і апельсінамі і пабегла па тратуары, мінаючы каровіныя бліны (наражчанскія каровы на выган чамусьці любяць ісці не па вуліцы-брукоўцы).

— Праз мінут дваццаць прыбегла да мяне Гандзя, ледзь аддыхалася. Схапілася за сэрца і крычыць ад парога: “Ты хоць яе спутай, хоць прывяжы да дзвярэй, тую сваю Веську, хоць пярэвяслам сперазай! Хай толькі яна да нас не прыходзіць! Хай сядзіць тут у цябе ў хаце, раз да цябе прыехала!” — баба Насця пурпуравее маршычністым худым тварам. — Кажу ёй: “Гандзечко, гэта ж дзіця, як яе ўтрымаеш у хаце? Ёй жа да дзяцей хочацца! Будзь чалавекам, не праганяй Весі ад сваіх...” — “Павел заб’е яе хіба, як толькі яшчэ ў нас пакажацца! Мала свае навалачы!” Я спачатку ў слёзы кінулася, але пасля злосць мяне ўзяла: “Ну нелюдзі вы, Канцавыя! Нелюдзі! Усё да людзей нешта маеце, фашысты вы! Праз вас наш Пецяі загінуў! А ваш Мікола то ўсім с... лізаў, у каго ружжо было, то Сталіну, то Гітлеру!! Каб ён і ўсе вы на гарэ стаялі і сонца не бачылі! Учапіліся, бач, цяпер да нявіннага дзіцяці!” Ну і пабіліся мы тады з Гандзяю, дурныя бабы.

Пра тое, што дакладна здарылася на падворку Карацінскае, ахвотна расказваюць суседкі. Вядома, прыдаюць колераў бітве бабулек, якія на вачах людзей шчыра счапіліся, пазрывалі сабе з галоў хусткі, павыдзіралі сабе пару жмутоў сівых валос.

Тузаліся яны тады добрых пару хвілін, а крыку было больш, чым бойкі. Суседкі смяюцца, успамінаючы гісторыю, седзячы на лавачцы пад плотам.

— От, дурасць, і ўсё! — кажа Тэкля Пякарская. — Чаго ім было сварыцца? Адзін смех, ну, камедыя чыстая, дый годзе.

— Ну, папраўдзе гэта і неганарова ў такім узросце за чубы брацца. І яшчэ моладзі поўна, гарадскіх паноў. Вось учора мой Ірэк пачаў дапытвацца, як з тым "фашыстам" было, — уздыхае Сонька Салавейкава. — Вазьмі растлумач дзіцяці, як гэта бывала, чаму брат пайшоў на брата... Успомніш брудныя справы, зачэпіш незагоеныя раны...

Не толькі "чыстая камедыя" атрымалася. Гандзя, падаючы на каменныя прыступкі ля Насцінага парога, мела сатрасенне мозгу. Цудам не паламала сабе падставу чэрапа (падала на патыліцу), а тады была б горшая бяда.

— Я бяру таблеткі на нервы, і на сон, бо заснуць не магу, — каўтае слязу Насця Карацінская. — Усё находзяць на мяне думкі пра канчыну. Мусіць, і я хутка пайду "на горку пад лесам", да майго Сашыка. Думала, што да смерці спакойна дажыву, а цяпер страх на вуліцу выходзіць...

Ды і няма чаго з хаты нос высоўваць. Кончылася капанне. Трэція суткі бубніць дождж. Маладыя паехалі ў горад. У вёсцы ціха, толькі дзе-нідзе азываецца злосны галодны сабака.

## На Паторцы

На Паторцы каля Н. жыў Жорка. Хату, прасторную, шчытом да вуліцы, паставілі яшчэ ягоны бацька Іванко з дзедам Міхалём амаль паўстагоддзя таму.

Іванко славіўся аж у трох гмінах сваімі печкамі і мураванкамі, але сабе хату змайстраваў драўляную, здаровую. Ды прыйшлося яе нядаўна абкладваць цэглай, паднялі яе за вуглы і падрубы на новы, умацаваны вялікімі камянямі цэментавы падмурак. Выбілі новыя вокны, большыя, у дзве паловы, з фортачкамі. Гэтак завяла маладая Жоркава жонка, Ганусся.

Цудам называлі Ганусю ў вёсцы, так як і тое, што рашыла ісці на Паторку. Чаго тут ёй шукаць, дзеўцы з сярэдняй адукацыяй, толькі што па школе, тут во, і з Жоркам, якому добра пад сорак! Што з таго, што гаспадарка ў яго някепская, і машыны амаль усе мае, калі тых кароў ды свіней не злічыць? То ж рукі сабе да локця адрабіць можна! А харошая Ганусся, як карцінка! Праўда, і Жорка, як маляваны, высокі, чарнявы, і дзеўкі за ім шалелі, асабліва калі яшчэ ў гурце “Імператар” на бас-гітары іграў ды спяваў пра нешчаслівае каханне (*ты мне пожуціла, длячэго то зробіла, не зрозуме нік, о-о-о, о дзевчыно...*). Не заўважыў Жорка, як яго аднагодкі, хто зараз па арміі, а хто і раней абзавяліся сем’ямі, пачалі ўжо збірацца сваіх дзяцей жаніць ды замуж выдаваць. Ездзіў яшчэ па забавах, але ўжо ўсё меншае ўражанне рабіў на дзяўчат (ды і менш усё іх было па вёсках) — над пасачак над нагавіцамі вылазіў яму ўсё круглейшы жывоцік, паявіліся залысіны ў кучаравым чорным чубе і голас страціў гучную прывабнасць, якая калісьці даводзіла слухачак да дрыжыкаў і слёз. Новы вакаліст “Імператара II” не меў пад апекай кароў ды свіней (аддаў яго бацька гаспадарку *пад жонд*), меў час ездзіць па забавах, і нават не запрапанавалі Жорку запісацца на касету *Disco-Polo*, якую накруцілі ў новым складзе, хаця раней абяцалі. Пакрыўдзіўся вельмі Жорка, бразнуў сястрой-гітарай (так яе пяшчотна называў) аб падлогу і сабраўся дадому.

Ганусю выпісаў Жорка з газеты. Напісалі адно другому пару лістоў, абмяняліся фотаздымкамі.

Прыехала на Паторку, агледзела, што і як. Файна тут, сказала, ёсць кантакт з прыродай. Але неабходна ў хаце ванну мець, хто ж у балеі будзе купацца, і каб гарачая вада не з парніка, а з бойлера, і цэнтральнае ацяпленне, і, каб зусім было па-людску, пліткай выкласці і кухню, і ванную (зрабілі яе ў каморцы)... Ага, і каб падлогі не з дошак, а паркет. Можа быць дубовы, але хай бы і ясеневы, абы ўзор прыгожы. Ну і, вядома, срачык каб у хаце быў, не бегаць жа ў будку за клуняй...

Прадалі Ляўшуны шмат што, зрабілі хату рыхтык як хацела Ганука. Праўда, за такія штукі стары Іванко ўжо не браўся, — тут іншы майстар патрэбен. Хатку вырыхтавалі такую, што як у шклянцы стала — суседзі палюбавацца прыходзілі. Ганука сустракала ўсіх ветліва, частавала, і сама не была супраць бліжэй пазнаёміцца з суседкамі. Хутка яны заўважылі, што Ляўшуноў у хаце будзе больш.

Толькі неяк зарана Ганука нарадзіла. Можа, надарвалася, адно што не было чым, бо муж не даваў ёй да нічога дакрануцца. Хлопчык, як на няпорнага, надта ж вялікі быў, больш за чатыры кіло. Прывёз Жоржык малога дахаты непрытомны ад радасці, хваліўся сынам як родным, але ж сляпы не быў. Ну, як там сабе ладзілі ў хаце Ляўшуны, не наша і не суседзяў справа, — не на вачах — не ў сэрцы. Пра сваркі ніхто не чуў. Адась рос здаровы, Ганука сядзела ў хаце, і хоць часу ў яе не было на нуду, відна, сумавала, і быццам зачахла — гасла на вачах яе асляпляльная краса.

Калі маломму споўнілася тры гады, здала яго маці ў садок, пайшла працаваць "скляповай"-прадаўшчыцай.

Аднойчы ў спажывецкую краму з дастаўкай прыехаў новы шафёр.

— Ганука, ты тут? Век не бачыліся! А што ж цябе сюды прыгнала? Запрашай у госці, пакажы, як абжылася!

Ежы Срока прыехаў да Ляўшуноў у наступную нядзелю з вялікай торбай — з гарэлкай і падарункамі малому. І Жорка паставіўся — пілі ды елі доўга за поўнач, успаміналі Жорка з Ежым нядаўнія, здавалася б, гады, у той час, як Ганусся яшчэ пісяла ў майткі, седзячы ў пясочніцы, ужо буянілі на забавах і скубалі дзевак.

Раніцай стары Іванко нарабіў віску на ўвесь дом. Звалок нявестку з ложка, пацягнуў яе ў "вялікую хату", цяпер званую "салёнам", дзе маладыя ноччу балявалі. На дыване, аплёўшыся нагамі, спалі галюткія Жорка і Ежы. Іванко аж калаціўся, хапаўся за сэрца:

— Гэта хто такое бачыў?! Што яны, кнуры гэтыя, тут рабілі?! А людочкі... — і старэча пахіснуўся, падаючы ўдарыў сівою галавой аб стол.

— Гэта так, Ежык?! То я тваё дзіцё гадую, а ты з маім мужам?! — пачала Ганусся тузаць непрытомных мужчын, якія не з меншым жахам пазіралі на сябе ледзьве прадзертымі вачыма.

Жоржык сарваўся на роўныя ногі. Ужо не на кавалера глядзеў, не на раз'юшаную Ганусю, а на старога бацьку, што непрытомны скурчыўся пад сталом.

Чым гэтая гісторыя скончылася? Што думаюць пра "такую камедыю" ў вёсцы ? Паедзьце, запытайце. Бабы кажуць, Еўропа прыйшла да нас, то і цікавей жывецца, чуючы пра такія "штукі". Толькі шкада, што цяпер пустуе толькі што абноўленая хата Ляўшуноў на Паторцы. Іванка пахавалі, Ганусся з малым з'ехала ў Беласток, а Жорка, кажуць, у Бельгіі сядзіць, шукае сабе занятку. Быццам не было працы тут, у нас.

# Скарб

Дарафей Мацюкевіч перад смерцю сказаў Мірону, свайму ўнуку, каб скарб шукаў, што ягоны дзед Аніська закапаў, едучы ў Сібір, у агародзе пад бэзам. Той стары пакручаны куст рос калісьці каля хаты, каля самое сцяны, і няма даўно ўжо таго дому, стаіць новы, ужо трэці пасля таго, які пакінулі, ідучы ў *паняверку*. Згарэла тады ўся вёска, і вярнуліся ў дваццаць трэцім на парослыя буйным зеллем і маладымі дрэўцамі руіны. Яшчэ цяпер на градках, нават неглыбока капаючы, знойдзеш паламаныя цэглы, абломкі паліванай кафлі, завесы, пераедзеныя іржой да тоненькай сэрцавіны цвікі, счарнелыя лыжачкі, медныя грошыкі. Але сярод гэтага ёсць і рэшткі хаты, спаленай фашыстамі, калі пацыфікавалі вёску, як усе прыпушчанскія падбелавежскія пасяленні.

Калі дзед Дарафей ціха і спакойна паміраў, Мірон хадзіў у другі клас. Дзед, аслаблы і бледны, як тыя падушкі, узбітыя высока бабай Маланеяй, паўсядзеў, беспамылкова перабіраючы жоўтую бліскучую нітку ў пакручаных доўгіх пальцах — сплятаў сетку кломлі і “плёў кашалі”, як пра аповеды мужа гаварыла Маланея. Баба адразу адрэзала, гледзячы на разяўлены рот найстарэйшага ўнука і нашыя вырачаныя вочы, утаропленыя ў дзедаў бяззубы рот, з якога гучалі незвычайныя словы:

— Ты, Дарафей, не вучы ўнука лухты, а то і з яго вырасце цудак, як усе Мацюкевічы. Скарбы, скарбы! Вам адно ў галаве: ганяцца па свеце за невядома чым, а з таго хлеба есці не будзеш!

— Маланея, гэта не лухта і не глупствы. Гэта — гісторыя! Ты, маці — баба, а бабскае дзела — печы пільнаваць. Не сунь носа ў такія справы. Ужо Ева давяла да таго, што *нас* выгналі з раю!

Дзед Дарафей быў у гэтым упэўнены — ва ўсім віна кабет. І войны праз тое, гаварыў (а мне, адзінай дзяўчынцы ў кампаніі яго слухачоў, было вельмі прыкра, і мне хацелася быць хлопчыкам), што бабы хочуць кіраваць светам: давай ім аздобы, давай ім футры звяроў, давай грошы! Біблію чытаў дзед Дарафей, з якой мы мала разумелі, з распевам, а белая доўгая барада лагодна клалася на пажаўцелыя, набухлыя старонкі з растрэпанымі берагамі. З гэтай Кнігай сям'я ў бежанстве была, перажыла яна разам з Мацюкевічамі ўсе войны і ўлады...

Калі дзед Дарафей памёр, Міронаў бацька Васіль хацеў нават тую кнігу ў труну яму даць, бо з яе чытаць не ўмеў, але баба Маланея запярэчыла: досыць нябожчык на гэтым свеце начытаўся, хопіць яму "папера" ад бацюшкі, а такая кніга рэч каштоўная, да таго ж святая, хай будзе памятка па старым. І тая Біблія, разам са згадкай пра закапаны ў агародзе скарб і няяснымі прароцтвамі Сібіліі, якія мы слухалі як казкі, асталася ў памяці і Мірона, і нашай, суседскіх дзяцей.

Я была старэйшая за Мірона на год. Быў гэта той час, калі я была мацнейшая за яго, клала яго на лапаткі і абганяла ў мяч, даказваючы, што і я магу быць хлопцам. І Мірон тады слухаў мяне, і, пераможаны ў вялікай бітве на выгане, выконваў мае загады і прыслухоўваўся да маіх прапаноў. І я рашыла ў адзін жнівеньскі вечар, калі мы сядзелі з Міронам, яго малой сястрой Крысцінкай, Юзікам і Шурам пад ліпай, з вялікімі галушкамі таўканіцы ў пакусаных камарамі руках: будзем шукаць той дзедаў скарб!

Канікулы канчаліся ў момант, калі мы ўжо засумавалі па школе, настаўніках і сябрах. У школу хадзілі мы тры кіламетры і хапала нам часу на планаванне раскопак. Але як капаць, калі ў агародзе Мацюкевічаў на градках растуць яшчэ буракі, цыбуля, капуста?.. Узяліся мы ўсе дапамагаць збіраць увесь

плён, каб пакуль замаразкі, пачаць свае пошукі. За ганачкам паставілі рыдлёўкі і матычкі. Меркавалі, калі пачаць работу — можа, ноччу? Лепш, усё ж, пачынаць справу легальна.

— Цёця Каця, ці можна будзе вам скапаць агарод? Нам трэба "залічыць" практыку ў школе, маем такую "акцыю", — запрапанавала я аднойчы ў палове кастрычніка матулі Мірона.

Стаялі мы як салдацікі, затаіўшы дыханне — дазволіць, ці прыйдзецца нам капаць ноччу, у таямніцы? Агарод вялікі, куст бэзу разрослы — работы шмат будзе...

— А не лепш брацца вам за свае агароды?.. Ну, калі хочаце, калі трэба вам, то працуйце. Павыбірайце ўсе кавалкі цэглы, што вам трапяцца, складвайце ля куратніка...

Мірон меў сон. Так сказаў нам назаўтра: "Я меў сон", быццам цікавы каляровы фільм пра незвычайнае бачыў. Слухалі мы з разяўленымі ратамі, як Мірон пераканаўча апісвае з'яўленне ў сне дзеда Дарафея.

— Дзед у белым плашчы, у шапцы сіняй, кнігу трымаў пад пахай. Вывеў мяне з дому, завёў у агарод, сказаў капаць крок ад бэзу. Вось тут. Пальцам мне паказаў.

— Адкуль жа ведае на тым свеце дзед, у якім месцы капаць? — усміхнулася я скептычна. — Калі б ведаў тады, калі жыў, то сам пачаў бы раскопваць.

— Я думаю, што ў небе сустрэў дзеда Аніську, ад яго і даведаўся! — Мірон у гэтым быў упэўнены.

— Баба Маланея, як злавалася на дзеда, казала, што ў пекла яго возьмуць, а там і згарыць саўсім! — узгадаў Шурычак, якому таксама часта пагражалі пякельным агнём за збыткі.

— А дзе тое пекла! Мой дзед быў добры, пайшоў, напэўна, у неба! У Бібліі так напісана! — Мірона ўгнявіла такая дзедава перспектыва.

Вярнуліся мы са школы раней, узяліся за свае

прылады. Капалі памаленьку, варочалі чорную ўрадлівую зямлю, выбіралі абломкі і смецце. Павячэраўшы, быццам бы пайшлі спаць, а ў змрок узяліся капаць пад бэзам, у добра пазначаным месцы, тым разам углыб.

Я першая палезла ва ўсё больш глыбокую яму. Працавалі мы заўзята, і дол быў на здзіў глыбокі, як на малечыя сілы. Мая рыдлёўка стукнула ў нешта глуха. Скінулі мне зверху матычку. Зубы матычкі зачапіліся ў штосьці калмата-доўгае і цяжкое. Я стаіла дыханне, у скронях малацілa кроў. Над ямай, над маёю галавой у вузкім прасвеце мігцелі зоркі. Мае сябры цяжка дыхалі, саплі, хтосьці шморгаў носам, на мае валасы і за каўнер сыпаўся пясок.

— Ёсць скарб! — закрычала я не сваім голасам. — Ёсць! Мірон, чаму батарэйка не свеціць?!

Мірон пабег па ліхтар у хлеў, але ніяк мы не маглі разгледзець у тую ноч тое, на што натрапілі.

Раніцай збеглася ўся вёска. Дзядзька Вася з маім татам і дзядзькам Стасем, бацькам Шурычка, вывалаклі з ямы скрыню, загорнутую ў збуцвелыя мяшкі, разбілі века.

— Э, тут якоесь г..., толькі старыя кнігі, звіткі, мапы, усё сыплецца! — абтрос свае нагавіцы і выцер рукі Міронаў татка. — Ніякага скарбу тут няма. Хто вам дазволіў агарод марнаваць?! — схапіў мяне за каўнер, а з другога боку ўчапіўся за белую Міронаву чупрыну.

І зноў увалілі куфар у яму і засыпалі жоўтым пяском.

Мне ўдалося ўварваць кавалачак старонкі. Было там напісана алоўкам па-руску — я ведала ўжо “рускія” літары з урокаў беларускай мовы — нешта пра Бельск. Я тады яшчэ ніколі ў Бельску не была.

Сёння, калі заязджаю ў гэты горад, ходзяць за мною думкі пра дзеда Дарафея і ягонага, дзедавага, дзеда Аніську, зруйнаваныя і спаленыя хаты, схаваныя кнігі

і думкі, узброеных у лапаты людзей, што, паплёўваючы ў далоні, зямлёй завалілі наш скарб.

## Стражнік старое сцежкі

Выкапалі з Буяўкі чорны мораны дуб. Гэта тады было, як яе засыпалі, яе, калісьці небяспечны ў час веснавых разводдзяў прыток Нарвы. І падрэчкі Чарнушка і Пчолка зніклі ўжо пад роўняддзю возера. З Буяўкі месцамі дзе толькі роў застаўся, з жабу-рыннем і раскай на ўстаялай пеністай вадзе, а дзе зарослы сітнягом сухі паплавок. Хто яшчэ ведае, дзе была Буяўка, дзе ў гэтых месцах страшыла да вайны і пасля, дзе стаяў жыдаў шынок, што потым згарэў, а хто не ведае — то і нашто такому пра гэта даведвацца, пытацца?.. Мораны дуб, якога не ўзяла ні сякера, ні піла, падцягнулі пад Марушку, дзе ўжо ляжалі тыркачы вывернутых соснаў з задзертым карэннем з кавалкамі зямлі, жоўтыя звалы адсунутага з раўнянай дарогі пяску, суглінкаў, што параслі ўжо зеллем — лесам горкага драсёну і лебяды, жалязякі і ўчарнелыя рэшткі будынін з паламанымі ваконнымі рамамі, пакінутыя будаўнічымі вала і станцыі помпаў на дамбе.

Паўз гэту дарогу ўрочышча Марушка беляхцела анемонамі, з кожнай вясною драбнейшымі. Люцынка доўга шукала вядомых ёй сонечных палянак, дзе з іржавае травы першымі вылузваліся валахатыя званочкі сончыкаў. Дзяўчынка заўважыла, што з кожным годам, з таго часу, як сама ўжо прыязджае да дзеда Ляксандра і пачалі раптам цямнець яе белыя дагэтуль валасы, аколіца стала зусім іншая, не тая, што раней, з вяковымі дарогамі, якія пільнавалі мяжы Княства, з кшталтам рэчкі, што пасля разводдзя

вярталася ў свой бераг, дрэвамі, якія самотна вызначалі межы палеткаў... Цяпер, нават калі Люцынцы споўнілася дзесяць гадоў, дзед неахвотна дазваляў ёй адной выбірацца на вал над штучным возерам, якое ўпадабалі ўжо водныя птушкі — рух на дарогах пабольшаў, хаця перасталі з'яўляцца вялізныя грузавыя машыны з прычэпамі з гурбамі пяску і экскаватары. Люцынка цяпер не заўсёды казала дзеду, што возьме ровар і паедзе кудысьці; не меў замнога дзед Ляксандар ужо для яе часу, калі ў ягоным доме паявілася новая бабка, такая маладая, як Люцынчын татка. Пані Ганначка павыкідала за куратнік старыя бабуліны крэслы з мяккімі падушачкамі, дыван у макі — што вісеў у спальні — закінула на бэльку на падстрэшку... Прывезла з сабою прыгожы абедзенны набор (схавала ў шафу шлюбны бабчын посуд, маляваны ў лясныя званочкі, з якога шмат філіжанак пабілася), прыгожыя сукенкі і многа кніжак. Дзед Ляксандар, прыгожы, сівавалосы, значна памаладзеў пры пані Ганначцы. Новая бабка ўсё нешта пісала, стукала начамі на машынцы ў сваім пакоі на паверсе, але Люцынка не змагла даведацца, над чым яна так працуе. Калі запыталася, ці будзе гэта кніга з казкамі, пані Ганначка толькі ўсміхнулася і сказала:

— Гэта не твая справа. І будзь ласкавая ніколі больш не заходзь у мой пакой.

"Яе пакой" быў калісьці бабчыным, улюбёным Люцынкай, з камінам, шырокай канапай, з дываном на ўсю падлогу, дзе дзяўчынка любіла вылежвацца ў зімовыя вечары са старым выжлам Бобам, а бабка чытала ёй кнігі пра падарожжы. З-за гэтых вечароў Люцынка любіла прыязджаць да бабы Зіны і дзеда. Цяпер, калі не мела доступу ў гэты пакой, адчувала сябе чужой у доме, пакрыўджанай дзедкам, але найбольш балела тое, што баба Зіна ўзяла ды памерла, знікла з жыцця, а разам з ёю рэчы, што пахлі чабаром і кацялапкамі. Люцынка калісьці забірала ў горад

бабуліны шпількі да валасоў — доўгая бабіна каса мацавалася на галаве дзесяткамі шпілечак — каб мець з сабою нешта, што было б згадкай жаноцкасці і матчынага цяпла. Люцынчына мама была далёка, прысылала толькі прыгожыя і дарагія цацкі і грошы тату. Бацька адкладаў грошы на Люцынчыну кніжку. Чула, як казаў дзеду, што не хоча ні граша ад Аліны і хай яна з той Амерыкі не вяртаецца, калі выбрала такое жыццё. Люцынка ведала, што мама абавязкова прыедзе да яе, разам паедуць у вёску, усе будуць цешыцца і назаўсёды застануцца разам... Матчыны лісты прывозіла перачытваць бабулі; не было іх шмат, як хацелася б, але чулыя словы, якія паўтарала за лістом баба Зіна, гучалі так, быццам сапраўды казала іх уголас мама.

Люцынка не змагла прыехаць на пахаванне — у студзені ляжала ў бальніцы. Магла б адляжаць сваю воспу і дома, але бацьку трэба было неадкладна на два тыдні ехаць у камандзіроўку, на нейкія курсы.

У красавіку ў дзедавым доме паявілася пані Ганначка. Люцынка памятае: яна ўвайшла ў кухню (дзе малая, разжаленая здрадаю бабкі Зіны, хліпала над кубкам гарачага малака, што наліў ёй дзед Ляксандар, выцірала вочы, быццам ад пары), пахнучая чымсьці салодкім і мяккім, стала над сталом, спахмурнела і сказала памалу, выціскаючы словы з чырвоных вуснаў:

— А хто гэта такі прыехаў у мой дом?

— Гэта не твой дом! — дзяўчынка адпіхнула кубак. — Гэта дом маіх дзеда з бабай, і мой!

— Ой, прыйдзецца нам удакладняць адносіны, бачу. Алесь, хіба ты забыў прадставіць мне гэтую маладую даму, — пані Ганначка ўсміхнулася да дзеда і ўскудлачыла яго белы чуб. — Я ж табе казала — ніякіх дзяцей!

— Гэта мая ўнучка, Люцына.

— Такая вялікая? Распусціў ты яе, бачу, мой мілы!

Ці прыйдзецца мне выхоўваць чужых дзяцей? Не думала пра такое, кідаючы дзеля цябе працу ў сталіцы!

— Бачыш, жонка пакінула Адама, ён... у яго новая сям'я... а з гэтаю штосьці рабіць жа трэба... — залапатаў Ляксандар, хаваючы вочы ад унучкі. — Прыязджае сюды, на выхадныя, прынамсі да...

Люцынка кінула кубачак. Не памятала, як выбегла з дому. Ляцела па новай жоўтай дарозе, паабапал якое ў цёмным лесе нізам бялелі анемоны. Веснавы малады вечар насунуўся хутка, пацягнула сырым холадам. Дзяўчынка агледзелася ўжо амаль над возерам. Вецер пранізваў да касцей. Баялася ісці лесам, але там было цяплей. Прытаілася паміж будкамі, за растапыранымі каранямі сасны з вялікім навісам зямлі, каля чорнага дуба, якога безуладнае цела выставала з-пад руінаў. Пра гэты дуб столькі расказваў дзед Ляксандар! Як ён рос, магутны, вялікі кароль дрэваў Белавежскае пушчы, як прыходзіў пад яго адпачываць пан Белы Воўк, стражнік старое сцежкі, што абарочваўся ў лесуна, і кахала яго жанчына, што прыручала дзікіх звяроў... І як потым дуб рашыў памерці, бо бачыў смерць лесу, а перажыў ужо ўсіх, але смерць не хацела прыходзіць, бо не на яе моц была сіла дуба... І не мог дуб сам учыніць сабе смерці. І рашыў тады Пярун даць яму падмогу, і зваліўся дуб. І заліла яго вада, што падышла на Сухі груд, і на доўгія стагоддзі знямеў дуб, пачарнеў, скамянеў. І дасталі яго з ягонае магілы брудныя рабочыя, што капалі тут возера-магілу рэчкі, і зламаўся тлусты ад алею зуб пілы, і гартаваная агнём і вадою няшчадная сякера. І натужыліся і пакацілі дуб рабочыя на сметнік, бо да нічога ён не быў ім прыдатны, і засыпалі ягонае ложа зямлёю. Дзед Ляксандар ведаў усё. І казаў дзед унучцы, што не трэба дубу спачуваць, бо і ён не шкадуе нас, што жывем так мала, што не пабачым таго, што пабачыў ён, і не адпакутуем столькі, каб нам

расхацелася жыць.

— Не хачу быць вялікай. Не буду! Я памру! — заплакала Люцынка ў дзедавых абдымках.

Шукаў яе быў на ровары, задыханы; здалёк бачыла хісткае святло ліхтара, што сунулася ад хутароў. Ведала — ён прыедзе. Хацела памерці да таго моманту, пакуль ровар не наблізіцца да месца, дзе схавалася, і дзед з плачам кінецца яе ратаваць, шкадаваць, і будзе туліць яе халоднае цела да сваіх шырокіх цвёрдых грудзей, гладзіць па пацямнелых валасах, і дзедавы слёзы будуць капаць на яе мёртвы нерухомы твар...

— Дзедку, тут так холадна... Дзедку, я яшчэ не нарадзілася, мяне яшчэ няма, — прашаптала Люцынка ў глыбокай цемры, з далонькаю ў дзедавай руцэ.

Яны ішлі па старой сцежцы. Далёка азываліся сабакі. Лес маўчаў, не дыхаў, слухаў іхнія крокі і шоргат колаў. На красавіцкім небе не свяцілася аніводная зорачка.

За імі застаўся ён, дуб, — пільнаваць сваё месца. Перажыў, павалены, яшчэ адно жыццё.

## Спосаб на поспех у каханні

Фідзяль крышыў пацяруху ў жылаватых далонях. Чэрвеньскае сонца пякло ў карак, чырванелі малінаю адкрытыя рукі пад кароткімі рукавамі белай кашулі. Кароткае вудзільна ўваткнуў у руды бераг. Сачыў за паплаўком.

— Вы што, дзядзька Фідзяль, думаеце звабіць на гэта сур'ёзную рыбку?

Фідзяль павярнуўся сваім каржакаватым целам у бок голасу, туды, адкуль сляпіла амаль летняе сонца. Вывернуў кішэні, вытрас рэшту смецця.

— А ну, прычапіў штучную муху. Дурная рыбка на

такое зловіцца, як і чалавек, — прыжмурыў стары свае выцвілыя вочы на Борку, саракагадовага кавалера, мускулістага, ужо траха палыселага пуцатага бландзіна. — Маеш да мяне важную справу, ці так дзеля прыліку пытаешся пра рыбку?

Борка падышоў бліжэй, моўчкі патупаў, пачухаў патыліцу пад палатнянай кепкай, уважліва ўгледзеўся ў ваду, якая кругамі абводзіла чырвоны паплавок, плюнуў як найдалей ад берага.

— Ффу-у, машкара пачынае збівацца пад карчамі, — заўважыў, — мусі на дождж пад вечар. — Зараз будзе лепш кляваць. А ты тут не палохай мне ўлоў, адразу кажы, па што прыйшоў, Борка, — штурхнуў яго пад бок Фідзяль. — Не ўстыдайся!

— У мяне справа сур'ёзная. Сакрэтная. Не месца тут яе рашаць...

— Гавары, гавары. Тут нас ніхто не пачуе. Адчыніць які сурок табе трэба, замовіць што, ці даць якое прываротнае зелле на каханне?..

— О, во-во! Каб хоць на мяне Галенка глянула!

— То ты якую сабе дзеўку выбраў? Чыя яна сама будзе?

— То ж Анісімава Галенка.

— То ж дзіця яшчэ, толькі што ў пяску гуляла.

— Ужо матуральны дыплом у сельскагаспадарчай школе зрабіла, у тэхнікуме.

— Ну, то ў нас у вёсцы яе не затрымаеш, не! Вучоная.

— Але, дзядзечка Фідзяль, вы ж такі шпец ад чараў, ну, дайце мне якое зелле ці замову, каб мяне захацела.

— Ну, добра, Борка, дам табе такое, дам, але глядзі, як дзеўка ўкляпаецца ў цябе, то валамі яе ад сябе не адцягнеш. А ці хоць добрая гаспадынька з яе будзе? Плодная? Краса — не найважнейшая справа. Маю Параску насватаў мне мой дзядзька, не найхарошчая з твару, як на дзеўку, была, але баба добрая, анёл не чалавек, і гаспадыня дай божа, і палюбіў я яе як сваю

душу. Памерла пры родах. І так я з тае пары бабыль, дапамагаю людзям, а сам сабе ніяк не дапамог, ды і не шукаў сабе суцехі.

— Не ведаю, як там з ёю, дзеўка з выгляду сам мёд. А мне ўжо нават хай кульгавая ці лянівая, абы была. Давайце, Фідзяль, што-кольвек, абы каханне падзейнічала, як гром. Хай трава, хай напой які, нават які парашок магільны, — я чуў, што такое вы калісь давалі. Або пару слоў, што звалілі б яе з ног... Усё зраблю, як скажаце, бо самота ўжо да касці заела...

Пайшлі Фідзяль з Боркам у бок хутара на Зайчым Хвасце, дзе стаяла хата ў засені трох магутных ліп. Вудачку стары закінуў за спіну — зноў не злавіў нічога. Найчасцей трапляліся яму асцістыя плотачкі ці шчупачкі ў мезенец, тую малечу і выпускаў, шкадаваў, або Бегемоту прыносіў. Тоўсты чорны блішчасты кот выбег на сцежку, з надзеяй у жоўтых вачах пачаў церціся ля ног гаспадара, прасіць пачастунку. Фідзель тыцнуў яму пад нос вудачку: глядзі, нічога нямашака, і Бегемот злосна фыркнуў і плітануў у маладое жыта.

— Во жыву з ім адным, як і быць павінна чарадзею. Ну, ты, Борка, хочаш, каб табе даць лякарства на кампанію, і яшчэ, каб каханне было... Мне самому лепш было б чаго напіцца і прыгаварыць якую адзінокую цётачку, але якая пойдзе ў такую глуш, на такое "багацце"! Усе выгоды хочуць. Лепш ісці дагледзіць да смерці якога скручанага раматусам пенсіянерыка ў блёку, чым са мною тут у карчах сядзець, хоць я яшчэ дужы, моц маю, і не зусім лысы...

— А чаму і не, маю на воку для вас бабку як трэба, у вёсцы Янава. Аўтобусам пад яе хату даедзеце. А мне парайце, як здабыць Галенку, заплачу, не пашкадуеце...

— Добра, добра. Палічымся. Шчасцю няма цаны.

Паставіў Фідзяль на стол слоік кампоту і шклянкі,

палез у шкапчык за Кнігай. Доўга глядзеў гараскопы, чарціў нейкія лініі і колцы на лістку пажаўцелай паперы, меркаваў...

— Гэта Кніга мне асталася ад прадзеда Нічыпара. Як паміраць буду, трэба мне будзе каму яе перадаць. Веды тут шмат, не на кожную галаву...

— Я не хачу! — замахаў рукамі Борка. — Каб пасля чэрці мэнчылі?! Ну, дзядзька, сходна там што мне з Галенкай у Кнізе, так ці не?

— Ну, як сказаць... Лёс у вас інакшы. Лепш злаві ты ў Купалле жабку, зачыні яе ў гаршчочак, завяжы яго, засунь у мурашнік. З чыстага шкілеціка вазьмі з ножкі костачку загнутую ў кручок, тою косткай і прыцягні дзяўчыну да сябе. А гавары вось што паціху...

Запісаў усё дзядзька Фідзяль Борку на паперцы, бо той ніяк не мог спамятаць рэцэпт.

— А як будзеш мець дзеўкі досыць, той костачкай адпіхні яе ад сябе...

— Што адпіхаць, я хачу мець бабу ў хаце! А цяпер пішыце сабе заметку: Карная Лёнька, з Янава, хата напроціў аўтобуснага прыпынка. Ну, вельмі ж цікава, хто першы будзе піць “горкую гарэлку”!

Нядоўга збіраўся Фідзяль да цёткі Лёнькі, заехаў ранішнім аўтобусам яшчэ ў чэрвені. Цётка не спадзявалася сватаў і не думала пра жаніцьбу, але на тое “чараўнік” ведаў свае чары, каб спадабацца вясёлай удавіцы. Файная з іх пара — сцвердзілі і старыя, і маладыя: кругленькая, мілавідная жвавая бабулька і жылісты дужы дзед, разважлівы і вучоны. За Пакрову абое ўжо сядзелі ў добра напаленай хаце на Заячым Хвасце над Нарвай (нічога, што да аўтобуса адсюль далей).

Борку таксама ўдалося — на Купалле злавіў зялёную жабку, са слязамі ў вачах усадзіў бедную ў завязаны анучкай рандэлек ды загроб у мурашнік. На забаве прыцягнуў гарачую дзеўку чыстай костачкай, прыціснуў Галенку ў танцы, нашаптаў “чары-мары” ў

вушка, а тая і не была супраць. Справа пайшла хутка і з пажаданым Борку вынікам — Галенка зранку прачнулася ў Боркавым разбэрсаным ложку.

А зранку відней — сёмы месяц. Або і восьмы, калі на цвярозае вока.

Спахапіўся Борка, выцягнуў з кішэні пакамечаных нагавіц жабіну ножку, тыцнуў каханцы ў грудзі: ідзі прэч! І дзяўчына злезла з пасцелі ды пайшла дахаты.

## Вырадак

Алене Май не жылося добра ў ейнай сям'і. Усе пра гэта ведалі — і суседзі, і паліцыя, і сямейны суд. Чаму? Вядома, як гэта бывае. Чымсьці ў сужонстве "не дапасаваліся", як кажуць людзі. Выйшла Алена замуж добра, ледзь абсохла "матуральнае" пасведчанне, за багатага і нестарога яшчэ мужчыну, з кватэрай у пяць пакояў, з аўтамашынай. Мужык яе на выгляд добры чалавек — ветлівы для суседзяў, кожнаму першы "дзень добры" дасць, заўсёды ахвочы да дапамогі — нават грашыма амаль чужых людзей ратаваў. І нябрыдкі — на вуліцы яны ўтрох, з чатырохгадовым бялявым хлопчыкам вельмі прыгожа глядзеліся, — толькі прыклад з іх можна было браць. Адам Май, працуючы шмат і амаль без выхадных і канікул, не шкадаваў грошай і клопату, каб маладая жонка з дзіцём жылі добра, высылаў іх на курорты, нават за мяжу.

Алена Маіха, падгадаваўшы дзіцё з дапамогай нянькі да трох гадоў, адправіла яго ў садок. Вазіла малога на сваёй апошняй машыне, якую атрымала ад мужа на імяніны — макавым "Фіаце-чынквечэнта", пасля ехала купіць сабе "абноўку". Вярталася ў розны час, і малы, бывала, доўга заседжваўся ў садку, калі

ўжо ўсе бацькі забралі сваіх дзяцей, чакаў маму. Да трох гадоў меў шмат нянек, усе былі цёці файныя, падабаліся Фэлюсю амаль усе, толькі не ўсе маглі дагадзіць мамулі — то былі запрыгожыя, то заразумныя, то занадта іх хваліў тата... Алена не працавала, бо якія ж грошы атрымлівала б, як сакратарка нават у добрай фірме і пры добрым дырэктары; больш магла мець за тое, што сядзіць дома. На тое ўзяў Адам Май такую прыгожую дзяўчыну, каб была аздобай і цешыла вока пана дому і тых, каму хацеў яе паказаць.

Вядома, кожны чалавек заняты сваімі справамі. Хіба што толькі хворыя збыткам цікаўнасці плеткары нахабна заглядаюць бліжнім пад покрыўку гаршкоў. Бачылі людзі маладую прыстойную сям'ю, шмат хто ёй зайздросціў, і раптам пачалі прыходзіць павесткі з суда да суседзяў, як да сведкаў.

Дома ў Маеў бывалі па некалькі разоў толькі Вікторыя Супрунчыха, пенсіянерка, якая адразу пасля пасялення ў блёку наведала ўсіх суседзяў і прадставілася ім, і Януш Кавальчук, "залатая ручка", якога разы тры прыгожая суседка прасіла дапамагчы пры хатніх аварыях. Пані Вікторыя не магла нахваліцца: такая вялізная кватэра, але, на яе думку, зусім небагата абстаўлена. Пакоі ўсе пабелены, мэбля або чорная або светлая, скураныя канапы і фатэлі, процьма кніг на паліцах. Цётка Вікторыя лічыць, што багацце відно найбольш па выстаўках крышталю на сценках-рэгалах, а тут нават тыя сценкі як не сценкі, а чорт ведае што. Дыван толькі адзін, і то нейкі як канапляны, ці што, усюды на падлозе якаясь цэгла, а не гладзенькія пліткі, а на сценах багамазы ў простых рамах. Апаратаў толькі многа — то нейкія экраны, то слупы, з якіх слухаюць музыку, а як загудзяць яны, то як арган у касцёле чуеш... Рэха! Вось прастор, калі некаторыя ціснуцца ў сваіх клетках! І як чыста — тры разы ў тыдзень прыходзіць пакаёўка, прыбірае. У

малога свой пакой, і, папраўдзе, Фэлюся зусім не чуваць, тaропіцца ў камп'ютэр, ледзь яго адгоніш, вочы сабе марнуе... А Януша Кавальчука захапляла ўсё ў гэтай кватэры, а найбольш адмысловыя краны ў блакітнай лазенцы з паўкруглай ваннай і агромністай кухні-сталовай... Вось жывуць жа людзі!

Што маглі сказаць сведкі ў судзе? Не бачылі ж, што тварылася ў хаце сужонства Маяў. Не бачылі, але чулі! Як тут не ўчуць, як пані Алена просіць ратунку, вішчыць немым голасам, нясецца страшэнны ляскат і грукат, валіцца нешта на падлогу, аж сцены трасуцца!? Не ўсе чулі, бо крыкі былі паміж дзесятай і поўднем або паўгадзінкі да трэцяй. Дзякуй Богу — дзіцё не бачыць, як бацька-вырадак мардуе матку! Вызывалі паліцыю і суседзі, і спадарыня Май, але паліцыянты або не хацелі ўмешвацца ў "сямейную справу", або прыязджалі тады, калі гаспадара не было ўжо дома. Ніхто з суседзяў ніколі не прыбег на ратунак.

Разводная справа, хоць цягнулася доўга, набліжалася да фінішу. Алена Май хацела мець дом з мэбляй, дзіцё, машыну, сваю калекцыю каштоўных камянёў і аліменты, якія дазволілі б выхоўваць дзіцё на не горшым, чым цяпер, узроўні. Адам Май закідаў жонцы, што нахабна лжэ пра ягоныя паводзіны, але, вядома, доказы былі пераканаўчыя — пасведчанні суседзяў, пабітая мэбля і посуд, раны на целе жонкі, пасведчаныя лекарам. Спадар Адам наняў новую кватэру і забраў частку сваіх касцюмаў і кніжак. Але скандалы паўтараліся амаль штодзённа, цяпер і ўвечары, і ноччу.

Пачыналіся ўжо летнія канікулы, Фэлюсь паехаў у лагер. Пані Алена рашыла справу завяршыць яшчэ перад летнім роспускам суда.

Лямант, крык, амаль выццё, трэск мэблі і звон разбітых талерак паўтараліся цяпер нават тры-чатыры разы ў суткі. Паліцыя не рэагавала.

Але аднойчы не вытрымаў сусед, Рыгор Нос. Збег ён па лесвіцы ў адных кальсонах, з жахам думаючы, што той дэгенерат вось-вось заб’е няшчасную кабету. Заламатаў у дзверы. Нічога не дапамагло. Сусед разбегся і з усяе сілы грымнуўся сваім магутным целам у дзверы. На шчасце, былі яны зачынены толькі на адзін з чатырох замкоў. Дзверы бабахнулі на тэракоту ў калідоры. Задыханы Рыгор уляцеў у салон, адкуль даляталі хвалі неверагоднай бойкі — трашчалі дошкі, бразгала шкло і талеркі, енчыла жанчына...

На канапе сядзела гаспадыня, піла каву, пляла на прутках доўгі шалік. А калонкі-гукаўзмацняльнікі аж падскоквалі. Запіс быў выдатны, сыграны з некалькіх гукавых сцежак. А паганага мужа не было і духу.

## Босы Воўк і злодзей цноты

Босы Воўк жыве ў мястэчку на Беласточчыне, славутым колькасцю захворванняў СНІДам. Але мы не пра гэта. Мы пра музыку і каханне.

Босы Воўк займаўся музыкай. Фірму заснаваў калямузычную, са сваім сатанінска-мэталёвым знакам. А сам ён нармалёвы, усё бярэ на здаровы розум. Рокмузыку любіць, але звычайна, без экстазу. Бо і зарабіць на ёй крыху можна. Давялося трошкі папрацаваць над іміджам — прычоскай, адзеннем... І чэрап сабе Роберт-Босы Воўк вытатуіраваў на левым, сардэчным плячы.

З канцэртнай фірмы грошай не было зашмат, ды і тое ішло на прапой, хоць сам Босы Воўк не піў зашмат і не п’е, дбае пра здароўе. Але трэба мець кантакт з жывымі рокменамі, і трымацца рэпрэзентацыйна. На канцэртныя залы трэба, на фанатак. Паненак каля Ваўка круцілася многа, розныя, і

патлатыя, і астрыжаныя амаль дагала. Але меў Босы Воўк нармальную сястру Рэню, якая працавала ў цырульні. Не прыгажэйшую за сябе, а нават падобную. Рэня жыла спакойна на другім паверсе бацькоўскае вілы, да захапленняў брата адносілася памяркоўна, на канцэрты трапляла рэдка, бо там круціўся народ зусім неадпаведны ёй. Перагледзела ўсіх больш прыстойных хлопцаў у мястэчку, але ні адзін ёй не спадабаўся. І так у цноце захавалася да сваіх дваццаці пяці гадоў. Нават псіхадэлічная музыка не даводзіла магчымых кавалераў да таго, каб захапіцца яе прыгожымі вачыма. А татка не быў аж такі багаты, каб хто захацеў купіць "ката ў мяшку".

Але вось адзіная сястра Босага Ваўка закахалася. З узаемнасцю. У раскосага прышчатага рокмена, маладзейшага за сябе на чатыры гады. Пасяліўся кастрабаты маладзён на "горцы" разам з каханай, паабяцаўшы Старому Ваўку (як яго чулліва называлі дзеці), што возьме шлюб у касцёле. Але ўсё ж Старая Ваўчыха не магла сцярпець вечна непрытомнага нямыціка Джэксана на выпаставаных паркетах, і Рэня сабрала свае "цюхі" пад пахі, узяла Джэксана і пайшла жыць у блок да бабулі, а Ваўчыху-Бабку адправілі да сына. І так вось цнатлівая Рэня ўвайшла ў дарослае жыццё, поўнае музыкі і кахання.

Джэксан хаты не пільнаваўся, калі гарэлкі дома не было. Рэня выходзіла на працу з болем, з заўсёднай думкай, што сёння начаўпе каханы. Добра, што хоць быў ён больш-менш пад вокам ейнага брата, у клубе або на канцэрце. "Дынксуе, што зробіш, — усміхаўся Роберт сястры, — а хто гэтага не робіць. Я вось не п'ю столькі, бо ўжо не ў змозе. Хачу жыць, як чалавек. І з яго, Рэня, будуць людзі. Файны ён госць, і, было не было, швагер. Хто ж іншы ўкраў бы тваю цноту? А цяпер хай вышуміцца."

Хоць Воўк пасмейваўся з "цнатлівае" сястры, але ж любіў яе. Ад малое быў яе абаронцам. Ды і падобныя

яны, як дзве кроплі вады, ды мужчыне хопіць, каб быў крыху прыгажэйшы ад д'ябла...

Рэні на працу пазваніла ўсхваляваная суседка. Досыць мела дагэтуль цярпення: канчайце з "імпрэзамі"! У Рэнінай кватэры ў белы дзень такі скандал, такі гвалт, што вытрымаць немагчыма! Пакінула кабета кліентку з незаконачанай завіўкай на галаве і папёрла дадому. Гармідар чуўся ўжо за два блёкі ад дому.

Адчыніла ёй дзверы нейкая дзяўчына. Іх там было болей, паненак і хлапцоў, а рэй вадзіў Джэксан.

— Ты хто такая? — спыталася дзеўка, утаропіўшы ў Рэню малапрытомныя вочы.

— Я тут гаспадыня. Дзе мой Джэксан?

Абступілі яе наўкола.

— Зусім, як чэрці ў дыме, усё мне ў вачах памуцілася. З тае пары ў мяне нервы, — кажа Рэня. - Мне аж слаба стала.

Рэню падхапілі, пасадзілі на канапу. Хтосьці лінуў ёй на твар віном.

— Гэта што за жарты, Джэксан? — рагатнулі дзяўчаты. Гэтае памяло — твая любоў? А ў трыбушку пэўна ўжо маленькі рокменчык?

— Гэта мая траюрадная сястра, з Харошчы ўцякла, хацела забавіцца з вар'ятамі, то мае. Любіць вострыя сцэны. Можа, зробім ёй нейкае прадстаўленне?..

Рэня без слова выйшла ў другі пакой. Упала на тапчан, уціснула галаву ў падушку, каб не чулі, як галосіць. Плакала доўга, аж заснула. Ужо было цёмна, як прачнулася. У другім пакоі сядзелі Джэксан і брат.

— Роберт наліў мне кавы. Узяў у далоні мой твар, пытаўся, што здарылася. Я і слова не магла сказаць. Гэты паганец Джэксан толькі пасміхаўся, — расказвае Рэня. — "Ta dziwka chciała zepsuć nam zabawę". Так ён сказаў, а пасля дадаў: "Chodź, porozmawiamy".

Пайшлі ў другі пакой.

— Як можаш цягнуць у маю хату гэту навалач! І

паводзіш сябе. як свіння! Выбірай — або гэтыя свінні, або я!

— Я табе дам “свіней”! Гэта — маё жыццё! І музыка! Я люблю музыку! — узвіўся Джэксан.

— Калі ласка! Любі сваю музыку і сваіх валацужак! Але не лжы майму брату! Ён з табою палічыцца!

— Ён?! Калі б нават я цябе забіў, ён слова не скажа. Бо не мае ў тым інтарэсу. Вось я зараз цябе выкіну з балкона, а ён мне паверыць, што ты, вар’ятка, сама выкінулася! Або задушу цябе голымі рукамі.

Рэня спачатку хрыпела, пасля паплылі ёй перад вачыма чорныя кругі і страціла прытомнасць. Не памятае, колькі праляжала. Калі расплюшчыла вочы, заўважыла з-пад дзвярэй жоўтую пляму святла. Пачула братаў голас:

— Што ты ёй зрабіў? Ты яе пакрыўдзіў?!

— Ат, памяў крыху. Прытвараецца. “Ляскі” любяць, каб іх крыху паціскаць. Дарэчы, трэба яе прывесці да розуму. Хіба ж разумее, што я хачу жыць. А што я маю з ёю ў хаце? Толькі скандалы. А, даруй, пры кілішку мы, то праўду-матку рэзаць можна... То ж сам ведаеш, Рэньку то часам мусіць чалавек газетай зверху накрыць, каб за дупу ўзяцца...

Рэня дапаўзла да другіх дзвярэй.

— Роберт... Вады... Доктара...

Босы Воўк страціў у той вечар сваю памяркоўнасць і цынізм. Перабіў рукі Джэксану, паламаў ногі, калі валок са сходаў. Пакуль шукала яго паліцыя, сядзеў у Еўропе. Вярнуўся два месяцы таму. Прывёз сёе-тое сястры, купіў новую апаратуру. Мае грошы і новыя ідэі. А грошы думае ўкласці ў новы інтарэс. Будзе помнікі ставіць памерлым, даіць з граша жывых. А чэрап на ягоным плечуку падыходзіць да новай прафесіі.

# Чорт у хаце

Добры быў калісь гаспадар і муж Коля Несцер. Ды здурэў на старасць. Усюды бачыў сваю Насцю ў абдымках уяўных супернікаў і выбіваў з яе тую здраду заўзята. Аж узяўся за справу... Адны кажуць, што чорт, іншыя — анёл ахоўнік, бо зляцеў і зрабіў у хаце парадак.

У вёсцы Бабуркі N-скай гміны няма чаго людзям плёткамі займацца. Праўда перарастае выдумку, бо часам такога і не выдумаеш, што тварыцца на свеце.

— Усе ведалі, што Коля Несцер пачаў біць сваю старую, — кажа Васіль Супрун, званы Вацкам, пенсіянер з хутара Насавое. — Ніякае гэта ні дзіва, у горадзе і вёсцы такое ўпаткаеш, што добрая сям'я пачынае кепска раптам жыць. Ды калі ўжо столькі нянавісці ў хаце назбіраецца, што дыхаць няможна, то людзі развесціся могуць.

— У горадзе бабы адважнейшыя, — дакладае Надзя Гоздзік. — Там бабы больш вучоныя, умеюць усюды дайсці. Мы, старыя, то і думаць не думалі, калі нават было так, што хоць вешайся. Маладая якая можа і пагражала мужу, што пойдзе ад яго ў свет, але, ведаеце, дзеці, гаспадарка... Муж, хоць чорт самы, то на старасць прыціхне. Ды і якія маладыя! Насці вось ужо 60 гадоў, а адна яна з маладзейшых у вёсцы!

— На Колю кепскага слова ніхто не сказаў бы раней. Усе яму зайздросцілі. Добры гаспадар быў, пабудаваўся што го-го, — паказвае пальцам дзед Андрэй Кастэнцік. — такія хлявы, якая хата! Як у месце! Паніска! А піць пачаў не з бяды хіба? Людзі маюць на скібку хлеба, і то жывуць добра, у згодзе. Ну, гляньце, якія палацы.

І праўда, асабняк Несцераў і гаспадарчыя будынкі робяць уражанне: усе з шэра-блакінай цэглы, бункраватыя, асабліва двухпавярховы дом у модным у

сямідзесятыя гады стылі “запалкавых пушачак”, абудаваны яшчэ нейкімі, ужо “нелегальнымі”, здаецца, прыбудоўкамі, па модзе саміх гаспадароў. Пад домам, ад вуліцы, дзе ў іншых сялян дацвітаюць апошнія летнія кветкі — звычайныя, вясковыя — ды выспявае гародніна, у Несцераў — стрыжаная траўка і нізенькія ні то ядлоўчыкі, ні то туі і пару ружавых кусцікаў. Агарод у іх за вялізнай стадолай, цяпер амаль пустою. Зямлю здалі Несцеры “пад панства”. Сыну паставілі вілу пад Беластокам, дачцэ выкупілі “блёк” у Гайнаўцы. Распрадалі амаль усе машыны. Трымаюць карову і пару свінак. Можа, і ад нуды пачаў піць Коля Несцер?

— І раней выпіваў, як кожны чалавек, — кажа баба Олішча, — але за працаю свету не бачыў. Несцеры налягалі на работу, як дурныя, бы хто хацеў ім што вырваць з горла. Такі род іхні здаўна быў, памятаю яго бацьку і дзеда, Касцюка. Нават у святую нядзелю, калі пагода стаіць, то ехалі ў поле ці на луг. Нават Іллю ці Ганну не ўшанавалі, як паганцы, калі рабіць што трэба было. А колькі чалавеку ўсяго трэба будзе, то ж у магілу за сабою не пацягнеш! — бабуля ўсхвалявана стукае кіёчкам аб тратуар. — Каб хоць усё тое на радасць пайшло! Дзеці пабралі тое, што ім трэба, і нават дахаты не заглянуць, толькі Марыська малога летам падкіне, каб маці папільнавала, калі яна едзе ў цёплы край адпачываць.

Захацела была Насця з тае нуды, што рабіць цяпер папраўдзе няма чаго, пайсці на якую працу ў людзі. Стала ў краму. Стаіць, працуе, грошы лічыць, а тут раптам убягае Коля і пачынае яе пры людзях бэсціць, цягаць за кудлы: куды падзела каханка?

Людзям смех, а кабеце бяда. Трэба ж крыху прыхарашыцца, калі ў людзі ідзеш, ды і ёсць за што тую парфуму купіць. Усю касметыку Коля ў печ уваліў, бензінам падліў, каб хутчэй гарэла. Нашто старой бабе ўсе тыя пудры? Завяла кобеля, няйначай.

Колю семдзесят чатыры, а кавалераў во колькі наўкола, усе на Насцю вырачаюцца. Колькі разоў вазілі яе ў гміну “на разлічэнне”! Папахадзіла тады Несцерча ў цёмных акулярах і густых панчохах! Але на паліцыю не падавала. Аж краму зачынілі, прывозіць цяпер прадукты “прывацяж”. Пачала Насця ездзіць у гмінную школу, рабіць кухаркай. Цэлымі днямі дома няма, вяртаецца на школьным аўтобусе. Паездзіла так месяцы тры. Прыехаў Коля на аўтобусе ў мястэчка, забег у гасподу для адвагі. Наведаў школьную кухню. Папабегала Насця па школьных калідорах, перад мужам узброеным у цясак ды апалонік! Вядома, скандал быў на ўсю гміну. Села тады Насця ў хатні арышт, вязаць швэдры, гафтаваць у “рышэлье” абрусы і пасцель для ўсяе вёскі. Ды колькі ўсяго гэтага каму трэба! Звяжа кофту Насця, прымервае перад трумо ў гардэробе, а тут Коля ўбягае з падворка, і раве: “Здзяру з цябе гэту анучу, сука! Для каго так фарсіш?! Куды зноў выбіраешся?!” Сам неяк апусціўся, зусім перастаў дбаць пра сябе, а раней то паголены, чысты нават у хлеў хадзіў.

— Праўда, выглядаў крыху як хворы, але хто ў нас у вёсцы не хворы ў яго гадах! — махае рукой баба Оліцьча. — Работа ўсе сокі з чалавека высмакча, а хто мае час лячыцца! Яшчэ бабы ўзіраюцца, што там дзе якой баліць, адна адной кажуць, што рабіць, калі нямогласць якая нойдзе, да таго ж не п’юць, не кураць. А мужыкі — ледзь трымцяць. Гляньце на нашых кавалераў...

— Папраўдзе і Насці мала бракавала, каб здурэць. Вазьмі вытрымай такое! Невядома, калі на Колю нойдзе дурны настрой. Уцякала да мяне найчасцей, — кажа Косця Паўтаран, кавалер каля 50 гадоў. — Цераз плот ад іх жыву. Меркаваў нас адно да аднаго ўжо здаўна. А мне проста шкада было глядзець, як іх сям’я гіне. Калі б мяне ў той час не было, то што б там натварылася!

Косця, пачуўшы страшны крык Насці, убег на першы паверх Несцеравай вілы. Дзякуючы ягонаму сведчанню не абвінавацілі Настасію Несцер у спробе забіць мужа.

— Коля, як сляпы, размахваў сякерай наўкол сябе, сек, дзе папала, — расказвае Паўтаран, падкрэсліваючы ход гісторыі жэстамі. — Рубануў па дзвярах. Насця, у парванай блузцы, ускудлачаная, з нажом у руцэ, спачатку ўцякла на падстрэшак, пасля другімі сходамі збегла да мяне. Я стаяў як укапаны. Коля ляцеў з сякерай на нас, а я не мог нават крыкнуць. "А, я цяпер усё ведаю і бачу!" — Коля вішчаў пабабску. — "Цяпер-то я вас зарубаю насмерць!" Насця раптам кінулася ў яго бок, з нажом аберуч, і паляцела на яго. Я ззаду быў, думаў, што забіла, бо раптам абое яны пападалі...

У тую секунду на іх галовы скочыў Мурза, стары прыблудны кот.

Мурзу Коля ненавідзеў хіба больш яшчэ, чым Насцю. І вешаў быў яго, і біў чобатам па галаве, і вывозіў, а той усё вяртаўся дахаты. Каціска стараўся сыходзіць гаспадару з дарогі, як і ўсе ў вёсцы, але гаспадыні не кідаў, прымошчваўся каля яе ў хаце, хадзіў, як сабачка, за Насцяй па вёсцы, адводзіў на аўтобусны прыпынак...

— Каб я не бачыў гэтага на ўласныя вочы, не паверыў бы! Мурза ўздыбіўся, зрабіўся рыхтык чорт, заверашчаў і ўчапіўся Колю ў галаву, — Косця аж ускінуў над галавою рукі. — Заднімі лапамі задзергатаў па вачах! Такога віску я не чуў, колькі жыву! Насця самлела, выпусціла нож з рукі. Я ў першую хвіліну не ведаў, хто каго забіў! Насця прабіла Колю руку, ён чарахнуў яе сякерай па вуху, абое ў крыві ляжалі на дыване, а кот стаяў на Колевай галаве і вішчаў, як дзіця. На ватных нагах я пабег да солтыса...

— Штотыдзень езджу да Колі ў псіхушку. Лечаць

яго, але ці вылечаць! — пацірае Насця Несцер загоенае ўжо вуха. — Каб справа была толькі ў вачах! Адно яму Мурза выдзер, на другое ледзь бачыць. Усё жыццё нармальны быў... Цяпер мне кажа: "Ты, Насця, я цябе люблю, чакай мяне, але таго чорта і так павешу!"

Трохколерны Мурза, сыты і лагодны, дрэмле на дыванку ў кухні. "Як жывеш, гаспадар?" — пытаюся ў яго. Адплюшчвае жоўтыя вочы: "Мур-р-р, добр-р-ра, Міра. Парррррадак!"

## Зязюльчыны слёзы

Зноў упалявалі куры зязюлю. Адкуль яны, тыя нялётныя зязюляняты бяруцца на падворках на беластоцкіх Баярах? З аднаго боку, хоць бы — Паўль, з другога Мілер, пасярэдзіне жывуць Паўшукі. Усіх хаты салідныя — як не мураванка, дык драўляная, але з гарышчам, крытыя бляхаю. І агародчыкі ў квецені. На падворку аўтамабіль, які б ні быў, але ездзіць. У хляўчуку як не свінка, дык хоць куры. І тыя куры штораз ловяць на сцежцы малое зязюляня. Хіба ж не зязюля падкідае сваіх ужо вялікіх дзяцей курам на выхаванне? Хоць тое спачатку было зразумела, што зязюльчаня знайшлося на падворку Зязюляў. Дурны жарт, пэўна, Мілера ці Кавальскага. Бо той увішны Міleraў Костак дык не толькі зязюляня дастане з чужога гнязда, але абкрадзе сароку так, што тая нават не застракоча. Ды адкуль узяць зязюляня пасярод Беластока?

Куры абступілі вялікавокае, начупуранае шэрае птушаня. Раскрычалася квактуха. Певень залапатаў крыллем. Ды певень не вельмі цікавіўся гэтым цудам, пабег за маладымі. А куры ўзяліся разглядаць птушку.

Не спадабалася, відаць. Сталі дзяўбці проста ў грудзі. Дабраўшыся да сэрца, выбралі яго па кавалачку ды пабеглі пад куратнік. Трупка не чапаў мурзаты кот Прот. Відаць, спужала яго тая апусцелая сярэдзіна яшчэ цёплае птушкі. А, можа, гідзіўся браць пасля курэй? Не першую зязюлю падабрала з падворка баба Жэня Зязюліха. Злосна праклінаючы свайго трэцяга сына Вінцуся, які зноўку павыносіў усё лепшае з хаты на гарэлку, узяла птушаня ў руку цераз паперыну ды панесла да нужніка.

Жэня Зязюля, выдатная краўчыха калісь, жыла цяпер адна з сынам. Той трэці сын зусім ёй не ўдаўся. Старэйшыя паканчалі студыі, а гэтага выкінулі ў першым класе з сярэдняй. Навучыўся ў жыцці толькі піць ды біцца. Былі калісь славутыя Баяры сваімі "баярамі", ды тыя баяры мелі свой гонар, хоць бандыцкі. Рабавалі не сярод сваіх. А цяпер во павялося!.. Матцы забірае. Пэўна, тыя зязюлі носіць, каб старую трапіла халерыя. Ну, злаўчыўся!

Меў Вінцусь жонку, ды не ўжылася са свякрухай. Бо дзе ж ёй, дачцэ гаўнавоза, да сына краўчыхі "цяжкага адзення" ці не лепшае ва ўсім Беластоку! Ані хаты, ані пасагу, нават тае красы ні крышкі. Што ў той Люсьцы Вінцусь убачыў? А яна ў ім... Ну, хоць харошы, бестыя! У матку ўдаўся: васільковыя вочы, чуб светлы, целам мажны, спрытны! Ухапіўся за тую бязродную п'яўку! Сама падлезла. Калі сучка не дасць, сабака не возьме. Дурная, тады яшчэ можна было легальна пазбыцца дзіцяці. А то нарадзіць уперлася. А куды, хамутка, прэшся! Ну, як жыць з такою, што не ўмее ні зварыць, ні пашыць, ні прыбраць па-людску! Не, не выганяла Жэня Люські з хаты, сама пайшла. І ўнучкі свае, Крысі, Жэня даўно не бачыла.

Скрыпнула брамка. На падворак убегла трохгадовая дзяўчынка, за ёю цягнуўся возік з лялькай. Дзіця ўпэўнена падбегла да Зязюліхі.

— Баба! Дай цукерку!

— Я табе дам, як і тваёй мацеры! — гыркнула бабуля ды піханула нагой калясачку з лялькай.

Енкнула. Зноў ухапілі яе колікі ў правым баку. І ў калене стрэльнуў боль. Каб толькі не ўбачыла тае грымасы Люська! Жэня старалася трымацца проста, ды не ўдалося.

— Пакладзіцеся на ляжанку, — падсунула Люська свякрусе паласаты ляжак, што стаяў пад бэзавым кустом.

— Бабця, табе ножка баліць? — абняла бабуліну нагу Крыся. — Я табе пацалую ў каленка, дык адразу перастане.

На суседнім падворку заверашчала Паўлёва: цяпер яе куры накінуліся на зязюляня.

**Галіна Тычка**

# Жаночы погляд Міры Лукшы

Паводле свайго ўзросту Міра Лукша ( аўтарка паэтычных зборнікаў “Замова” (1993), “Ёсьць” (1994), а таксама празаічных кніг “Дзікі птах верабей” (1992), “Выспа” (1994)) належыць да шумнага пакалення “Тутэйшых”, якое напрыканцы 80-ых гучна абвясціла свой маніфэст аб стварэнні новага мастацтва, кардынальна адрознага ад літаратуры былой, сацрэалістычнай. (Дарэчы, зазначу, творчая дзейнасць Адама Глобуса, С. Адамовіча, А. Сыса, У. Сцяпана на працягу апошніх дзесяцігоддзяў пацвердзіла іхнюю арыентацыю на тэматычнае і стылёвае супроцьстаўленне традыцыйнай альбо так званай вясковай літаратуры старэйшага пакалення.)

Здабыткі і страты постмадэрністычных пошукаў маладых беларускіх літаратараў, аднак, мала закранулі творчасць Міры Лукшы, якая ў сваёй прозе плённа, а і паслядоўна працягвае традыцыі беларускай тыпова вясковай, сялянскай літаратуры. Вызначэнне “сялянскае” — у многіх сёння не абуджае энтузіязму, бо асацыіруецца перш за ўсё з прымітыўна-кансерватыўным узроўнем выяўлення, тэматыкай учарашняга дня і няздольнасцю далучэння да інтэлектуальна-тэхнічных дасягненняў сучаснага свету. Аднак гэта павярхоўна абывацельскае ўспрыманне, разлічанае на масаваспажывецкую свядомасць, якая не ўлічвае складаных сацыяльна-эканамічных і светапоглядавых асноў фарміравання і існавання беларускай нацыянальнай самасвядомасці, генетычна і гістарычна якараз і найбольш цесна і арганічна паяднанай з сялянствам.

Трагедыю разбурэння і нівеліроўкі этнічнай беларускай самасвядомасці, непасрэдна звязаную з руйнаваннем і знікненнем устойлівага свету старой беларускай вёскі, у 70-ыя

гады актыўна распрацоўвалі, бадай, усе беларускія празаікі. Хто не памятае балюча-прарочыя словы А. Адамовіча пра беззваротную пагібель аграмаднага мацерыка (Атлантыда) старой беларускай вёскі, роспачнага закліку пісьменніка ратаваць, пакуль можна, хоць бы ў мастацкім слове рэшткі той велізарнай і унікальнай культуры, якая знікае навекі? Трэба сказаць, што і сапраўды ў тыя часы ратавалі, ці, прынамсі, стараліся ратаваць у меру сваіх сілаў і магчымасцяў. Аднак занадта разгарнуцца ў гэтым высакарадодным памкненні перашкаджалі абмежавальныя слупы сацрэалізму, што няўклюдна вытыркаліся сканструяванымі штучна постацямі "добрых" сакратароў парткамаў, "разумных" старшыняў калгасаў ці "сумленных" радавых камуністаў.

Самае дзіўнае ўсё ж, што са знікненнем так званага "сацрэалістычнага метаду" з беларускай літаратуры амаль сыходзіць і тэма апакаліптычнай пагібелі унікальнага свету вёскі. Што паспрыяла таму: ці то чарнобыльская трагедыя, якая зацьміла ўсе ранейшыя беларускія крыўды і беды, ці то атмасфера большай, у параўнанні з ранейшым часам, разняволенасці ў выбары тэм і сродкаў мастацкага выяўлення, ці то нешта іншае, — цяжка адназначна сказаць. І ў выніку сёння найбольш паслядоўнымі аналітыкамі працэсу размывання беларускага сялянства выступаюць якраз тыя літаратары, які аддзелены межавымі слупамі ад метрапольнай тэрыторыі, і якія даследуюць з'яву на матэрыяле беларускага жыцця напаўапалячанай Беласточчыны.

Гаворка ідзе не толькі пра паслядоўныя творчыя парыванні Сакрата Яновіча, пра яго імкненне асэнсаваць вытокі трагедыі беларускай нацыі, але і пра творчую практыку іншых белавежскіх літаратараў, таго ж Міколы Гайдука, напрыклад, ці прадстаўніцы маладзейшага пакалення М. Лукшы, асноўным тэматычным аб'ектам якіх з'яўляецца вёска.

Адметнасць творчай манеры Міры Лукшы выразна пазначана ў загалоўку яе новай кнігі — "Бабскія гісторыі" Менавіта — "бабскія", гэта значыць тыя, якія апавядаюцца кабетамі і якія выяўляюць спецыфіку народнага жаночага светаўспрымання, менталітэт вясковых бабулек, надзе-

леных мудрасцю перажытага, перажытых бедаў і крыўд. Невялічкія навелы, што складаюць змест кнігі, акурат і паказваюць гэты адметна жаночы, па-мацярынску спагадлівы і міласэрны погляд на боль і праблемы людзей, асуджаных часам і гісторыяй на паступовае выміранне разам з адыходзячым у нябыт светам старой белавежска-пушчанскай рэчаіснасці.

Герояў сваіх апавяданняў пісьменніца бярэ з рэальнага жыцця, чаму ў немалой ступені, відаць, паспрыяла яе журналісцкая практыка, праца ў "Ніве", непасрэдны і пастаянны кантакт з насельнікамі таго звычайна-незвычайнага і таму для многіх ужо экзатычнага свету, свету першароднай еднасці чалавека з зямлёй, з прыродай Белавежскае пушчы, які абумоўлівае іхнія характары, светапогляд і, у многім, іхні лёс.

Паводле свайго жаночага пункту гледжання выбрала М. Лукша і галоўную інтанацыю кнігі — спакойна-разважлівую, даверлівую, па-народнаму мудра-абстрагаваную манеру апавядання пра самыя розныя — драматычныя, смешныя ці па-будзённаму дробязныя — жыццёвыя жарсці, якімі насычана паўсядзённае жыццё яе герояў. Гэта аб'ектывізаванасць дакладна перадае ўстойлівы народны погляд на жыццёвыя каштоўнасці, на прынцыпы традыцыйнай маралі і этыкі, нормы паводзін чалавека ў грамадстве.

"Не трэ было Раману, дзякуй Богу, ніколі па судах цягацца. Не спатрэбілася. І не судзіўся, і як сведка не ставаў, ні ў справах уласных, ні ў чужых. Калі раз трэба было ў суд ехаць на зацвярджэнне тастамента па бяздзетным браце, сваю спадчыну пісьмова пераказаў іншаму сваяку-сіраце: вядома, паперка была пацверджаная, а сам Раман на ўсякі выпадак "захварэў". Бо чаго валачыцца ў Беласток, плаціць грошы за дарогу, час, прызначаны на гаспадарку, траціць. Бачылі вы такое!"

Так пачынаецца апавяданне "Раман", пра сапраўдную непаказную маральнасць і высокую духоўнасць вясковага дзядзькі, які мусіў змяніць свае звычкі і пераадолець нелюбоў да судоў, калі сталася так, што ад яго паказанняў залежыў лёс чалавека.

Гэтак жа натуральна, без залішняй афектацыі і націску

вядзе пісьменніца свой жаноча-народны роспавед і пра трагедыю мінулай вайны, і пра драматызм сённяшняга няскладнага лёсу сваіх суайчыннікаў. Гаворка гэтая распачынаецца заўсёды нечакана і, як прынята ў народным асяроддзі, адразу па сутнасці справы, без дэталізаваных апісанняў прасторы і часу, ці папярэдняй аўтарскай характарыстыкі герояў. Пачаткам яе можа стаць асобная фраза, прамоўленая самім героем, як, напрыклад, у навеле "Марысенько, не ўмірай". "Марысенько, не ўмірай, бо ты мне адна засталася", — просіць стары дзядуля такую ж старэнькую, як і сам, кабету, з якой пазнаёміўся на могілках і хацеў бы пабрацца, ды не дазволілі сваякі. Яго, разбітага паралічом, пакінулі ўсе блізкія, прадбачліва забраўшы перад тым усю нажытую ім маёмасць. Трагедыя жыцця самотных старых, супраць якіх выступае не толькі няўмольны час і абставіны, але найперш найбліжэйшыя, найраднейшыя людзі, што адмаўляюць ім у праве на асабістыя пачуцці, а значыць, і на паўнацэннае чалавечае існаванне, бадай, упершыню ў нашай літаратуры так псіхалагічна пераканальна адлюстравана ў "Бабскіх гісторыях" М. Лукшы.

Выкарыстоўвае пісьменніца і форму маналога, выдатна перадаючы своеасаблівасць і спецыфіку лексікі гераінь, найчасцей старэнькіх вясковых бабулек.

"Колькі мне будзе год? Васьмідзесяты ўжо пайшоў! Я і не думала, што столькі нажывуся. А тут яшчэ жыць далей трэба. Дзяцей уласных у мяне было толькі трое, двое ў жывых засталося, бо дзяўчынка, што перад Стасікам`была, у пяць месяцаў памерла. Маруська ў Беластоку замужам, Стасік во з намі на гаспадарцы. І ягоных, майго чалавека, дзяцей было сваіх сямёра, я на іх прыйшла, хоць страшнавата было. Самы старшы — Ясько; ён хварэе, і яго жонка нядужая", — даверліва расказвае бабуля пра сваю бяду, пра няўдалае жыццё пакінутага на гаспадарцы Стасіка, пра сваю крыўду на лёс. Як жа так сталася, што яна, "пагадаваўшы столькі дзяцей, столькі парабіўшы", чуецца ў старасці самотнай і нешчаслівай ("Вазьмі знайдзі ты тое шчасце")...

Свет герояў М. Лукшы цесна знітаваны з дзвюма прыроднымі субстанцыямі: з традыцыйнай для беларускай

літаратуры — зямлёй, а яшчэ — з Белавежскай пушчай. У свой час І. Мележ у “Палескай хроніцы” яскрава адлюстраваў феномен светаадчування беларуса-палешука, што жыве на дрыгве. М. Лукша, працягваючы досвед В. Карамазава (“Пушча”), М. Кусянкова (“Арляк і зязюля”), даследуе феномен чалавека, што вырас у пушчы. Псіхалагічна дакладна перадае яна адчуванні вясковага беларускага хлопца, вырванага са свайго натуральнага асяроддзя, яго тугу па звыклым жыцці і простых радасцях у паяднанні з натуральнай прыродай і традыцыйна-патрыярхальным побытам:

“Школы ў горадзе не кончыў, плакаў па начах у інтэрнаце і падчас практыкі на фабрыцы, а пілавінкі са станка былі вінаватыя ў тым, што вочы яго чырванелі. Федзікава сэрца трапятала, калі даходзіў пах мокрае мяты на далёкім ветры з-над Нарвы, пах сытага торфу, сітніку і трысця на падрэчках. Хутка без са станцыі ў бок, дзе ў цемнаце, над даляглядам, над якім удзень сінеў зубчаты бераг Белавежскай пушчы, глыбока пабрэхвалі сабакі. Пазнаваў голас сваіх, якія нудна адклікаліся да суседскіх, ці сумна падвывалі на полі, прывязаныя да слупка, пільнуючы жыта ці рэпу ад дзікоў.

Федзікавы рукі патрэбны ў гаспадарцы. Старэйшыя сёстры пайшлі вучыцца, брат у арміі. Дзе тут пхацца ў вялікія паны, хай вучацца больш здольныя ды крутыя. Чаго мучыць сваю душу, скавытаць па начах, як гэты Рэкс пад месяцам на рэпіску.

Прыехаў дахаты пад Вялікдзень і не вярнуўся больш у школу” (“Федзік”).

Праблема сваёй зямлі, уласнай гаспадаркі, што вызначала ў свой час лёсы герояў Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, І. Мележа, і якая ў выніку ўсеагульнай калектывізацыі на Беларусі набывае іншае вымярэнне, у творчасці беластоцкіх літаратараў захавала сваю першапачатковую сутнасць. Эканамічна-гаспадарчая палітыка Польшчы ніколі не адмяняла цалкам прыватнае землеўладанне, таму для сённяшніх насельнікаў Белавежжа зямля застаецца па-ранейшаму непераўзыйдзенай каштоўнасцю. На гэтай зямлі яны працуюць, не шкадуючы сіл, з ранку да вечара, бо не могуць змірыцца з думкай, што

зямля можа пуставаць, можа аказацца непатрэбнай нават іхнім дзецям. Цяжка, ой, як цяжка, героям М. Лукшы, нават страціўшы здароўе, адмовіцца ад уласнага поля, аддаць яго ў арэнду дзяржаве. Перакананне, што зямля — адзіная сапраўдная і найвялікшая ў свеце каштоўнасць, “воля і сіла”, жыве ў іхніх душах да апошняга ўздыху. Адданасць уласнаму кавалку зямлі, жаданне быць яго адзіным гаспадаром, не маглі вытруціць з беларускай душы ні калектывізацыя, ні камасацыя (узбуйненне зямельных надзелаў), ні меліярацыя.

Бяда прыйшла з іншага, нечаканага боку. Здабытая і захаваная з такой цяжкасцю, цаной поту і крыві, свая зямелька аказалася непатрэбнай нашчадкам. Тэндэнцыі развіцця сучаснага свету вылучылі на першы план іншыя чыннікі і каштоўнасці. На працягу дзесяцігоддзяў біліся аднавяскоўцы паміж сабой за паўметра зямлі, за плот, што нібыта стаіць на чужым гародзе.

“Ой, нямала грошай выдалі сваякі, Борка ды Зюня, на суды, даказваючы, хто мае рацыю і за кім сапраўдная праўда.

Самі яны ўжо засталіся са сваім плотам. Абое на пенсіі, здалі дзяржаве свае гаспадаркі. А для чаго так біліся? Каб справядлівасць была, каб сваіх дзяцей не пакрыўдзіць, каб нічога не страціць з бацькоўскае спадчыны, з таго, да чаго вярталіся з далёкага свету. Боркавы дзеці нават у Польшчы не жывуць — дачка ў Францыі, сын у Канадзе, другі сын ад нядаўна ў Нямеччыне, малодшая дачка за венгерца пайшла. Зюнеў сын Коля ў Варшаве інжынерам, падземныя шляхі будуе, яму бацькоўская хата не была і не будзе патрэбна, нават летам не загляне, унучкаў дзеду не прывязе; Зюнева дачка ў Нямеччыне малых немчыкаў няньчыць, сваіх малых у Беластоку мужу на выхаванне пакінуўшы, грошы зарабляе”. (“Як Кастэнцік з Чортам за зямлю біліся”).

Такім чынам, неяк незаўважна ўзнікае ў “Бабскіх гісторыях” глабальная і надзвычай актуальная не толькі для Беларусі ці Польшчы, але і для шмат якіх краін свету праблема эміграцыі. Праблема вымывання інтэлектуальнага патэнцыялу нацыі, разбурэння нацыянальнага генафонду шляхам перацягвання больш прадпрымальных, актыўных прадстаўнікоў у эканамічна больш развітыя

краіны. Беларускі народ на працягу стагоддзяў у выніку неспрыяльных палітыка-эканамічных абставін быў донарам для іншых больш моцных краін свету, аднак добраахвотная эміграцыя ніколі яшчэ не дасягала такіх вялікіх маштабаў, як гэта адбываецца ў апошнія дзесяцігоддзі.

На тэрыторыі Беласточчыны працэс гэты пачаўся раней і больш інтэнсіўна, чым у Рэспубліцы Беларусь. Таму і вынікі яго больш заўважальныя. Ужо сёння ў пушчанскіх вёсках дажываюць свой век самотныя старыя, стаяць пустымі і нікому непатрэбнымі “хаты, як звон”, зямля зарастае палыном і альшэўнікам, а спрадвечныя жыхары гэтых мясцін абжываюць тэрыторыі Канады, Аўстраліі, Францыі ці Нямеччыны.

Трагічны і непрадказальны паводле сваіх наступстваў адыход у нябыт феномена чалавека-гаспадара, феномен вёскі, як асноўнай захавальніцы нацыянальна-адметнай самасвядомасці, што на балючай, мінорнай ноце прагучаў і ў сучаснай польскай літаратуры, у прыватнасці, у рамане О. Такарчук “Правек і іншыя часы”, у кнізе М. Лукшы паказаны надзвычай выразна.

Сюжэтам многіх “Бабскіх гісторый” (некаторыя з іх, як ужо адзначылася, можна назваць былямі) робяцца не толькі лёсы старых, але і тых людзей з маладзейшага пакалення, якія ці то паводле сваіх духоўных схільнасцяў, ці то паводле абставінаў застаюцца на сваёй зямлі. Пісьменніца паказвае, што доля іхняя больш, чым незайздросная. У выніку жыццё іх аказваецца пакалечаным альбо няспраўджаным.

Не схацеўшы ламаць сябе, вяртаецца з горада ў родную вёску на добрую, дагледжаную, бацькоўскую гаспадарку далікатны і душэўны юнак Федзік. Але што чакае яго тут, дзе “Коля п’е, Збышак п’е... Старыя кавалеры, якім жонак тут не знайсці... Поле палыны зарастаюць і чартапалох, аблогі цягнуцца аж за Рабінку” (“Федзік”).

Лёс хлопца прадвызначаны. У глушы і самотнасці з ім станецца тое самае, што сталася з іншымі яго суайчыннікамі: будзе цяжка працаваць і паціху співацца. Не стрымаюць яго ні маральныя ўстоі, ні моцны характар, як не стрымалі яны Моцнага Янака, які перажыў здраду бацькі і смерць мацеры, але, застаўшыся адзін, не змог адолець

нуды.

“З суму вялікага, казалі, з адзіноты, Янак піць пачаў. Спачатку не так многа. Ды і сёння рэдка ўбачыш, каб напіўшыся, як бонак, валокся дахаты, а пад плотам жа яго не ўбачыш паўмёртвага, як шмат з кім бывае. Хутчэй у яго доме спыняцца сасмаглыя сябрукі, кавалеры і нават сямейнікі. Бо жанчыны тут у ваколіцы няма, якая б узяла дзяркач ды паганяла гэтую кампанію! Хоць Янак дужы яшчэ і прыгожы, ды і неблагі з яго чалавек, і гаспадар старанлівы,не знайсці яму гаспадынькі. (...)

Цюцька ды коцік, адзіныя істоты, якія ведаюць, што мроіцца ў глухую ноч іхняму гаспадару, Моцнаму Янаку, ды нічога пра гэта нікому не скажуць” (“Моцны Янак”).

Пустазеллем, палыном і чартапалохам зарастае не толькі колішняя “свая” зямля, бацькоўская спадчына беларускіх гаспадароў, глыбокае карэнне пустазелле бездухоўнасці пускае і ў душах людзей. Нішчацца традыцыйныя нормы маральна-этычнай духоўнасці, людскасці, элементарнай чалавечай прыстойнасці.

У артыкуле З. Пазьняка “Мінула XX стагоддзе...”, змешчаным у “Народнай волі” 12 студзеня 2001 года, прыводзіцца жахлівая статыстыка адносна таго, якіх памераў дасягнула на Беларусі спажыванне алкаголю. Паводле гэтых паказчыкаў, Беларусь апярэдзіла нават традыцыйна п’ючую Расію, дзе спажыванне алкаголю складае 9 літраў на жыхара, на Беларусі ж — больш за 11, у той час, як “навукова і міжнародна прынятая норма алкаголнага парогу, пасля якой пачынаецца дэградацыя этнічнай супольнасці, складае 8 літраў”. Зрэшты, каб уявіць маштабы гэтай нацыянальнай трагедыі, не трэба і статыстыкі, варта сесці ў цягнік мясцовага прызначэння, які курсуе з пагранічных Гародні ці Бярэсця ў Беласток. Здаецца, што чалавек трапляе ў іншасвет, свет пачвараў і нелюдзяў, дзе не існуюць ніякія нормы чалавечай прыстойнасці, людскасці, — усё падпарадкавана жорсткаму праву выжывання за кошт іншых. За кошт тых, хто, спажываючы правезеную кантрабандай атруту, таксама згубіць свой чалавечы воблік, нармальныя чалавечыя інстынкты самазахавання і прадаўжэння роду.

Гартаючы старонкі “Бабскіх гісторый” М. Лукшы, бяду

гэтую бачыш вельмі выразна, і, дзякуючы спецыфіцы мастацкага адлюстравання, неяк па-асабліваму балюча. Пісьменніца ўмее выкарыстаць як быццам выпадковую дэталь, якая скажа нашаму сэрцу больш, чым сухія лічбы статыстыкі. Чаго вартая, напрыклад, запамінальная сцэна наведання гераіняй свайго колішняга знаёмца па студэнцкім інтэрнаце, якому ў восемдзесят другім "дзеўка-студэнтка ў твар наплявала, калі спакойна ішоў па варшаўскай вуліцы, з польскім арлом на шапцы.

— Плюй, дурная, на свайго арла, ён жа не мой," — адказаў тады ёй Яська, але і зараз не хоча ўспамінаць таго часу. Пацёгаўшыся па свеце, змушаны быў вярнуцца ён да бацькоў. І вось зараз "аброслы рудой барадой гаспадар" вядзе госцю "ў свае харомы. За сталом спіць, апёршыся няголенай шчакой на бліскуючу цырату, малады вельмі прыгожы хлопец. Русая доўгая чупрына мокне ў мутнай калюжынцы. Падсоўваюся да яго на столку. Гаспадыня нясе міску з густой цёплай капустай, Яська — бабах! — на стол зялёны буталь. Не, у ім не шампанскае!" ("Яська з-пад бору").

Выкарыстоўвае часам аўтарка і нетрадыцыйны сюжэтны ход, удала яднаючы рэальнасць з міфалагічным светам мінуўшчыны. Так адбываецца ў навеле "Цуд на Семяноўскім возеры", калі да вогнішча, раскладзенага мясцовымі п'яніцамі, прыходзіць русалка. Хлопцы спачатку думалі, "што гэта была якая ўцякачка з-пад Ваўкавыска ці Свіслачы. Ну, бо калі б гэта была турыстка, то мела б з сабою нейкі багаж, так ці не, – рукзак, спальны мяшок, а то нават і сваю палатку, а тая красуня была ў адной сукенцы, і то слабенькай, выцвілай, пашытай па старой модзе", якую ёй, як пазней выявілася, "у дваццэць сёмум дала Прузына з Таніцы". Спатканне гэтае скончылася сумна, русалку пачаставалі салам і кантрабандным спіртам "Раял", і "вана посьле ж чы вадою, чы расою расплыласэ".

"Калі здарыцца вам сустрэць тую істоту, — заканчвае свой расповед пісьменніца, — дайце, беднай, якое адзенне — міні-спаднічку, джынсы, ці нават і фуфайку (толькі не частуйце яе гарэлкай, нават, калі будзе вельмі прасіць!). Файная ж дзеўка, і па-нашаму гаворыць. Можа, з якім

нашым хлопцам застанецца, расой не расплывецца?..”

Зянон Пазьняк у згаданым артыкуле сцвярджае даволі распаўсюджаную ў грамадстве (і слушную) думку, што ўратаваць сённяшні свет, і ў тым ліку наш этнас, здольная толькі вера, хрысціянства, як традыцыйная рэлігія нашых продкаў.

М. Лукша праблему веры не закранае, аднак, здаецца, і ў яе ёсць свой погляд на ратаванне. У пэўным сэнсе нетрадыцыйны, і выказаны ў кнізе апасродкавана. Захавальніцай духоўнай спадчыны, гэтак жа, як і выратавальным фактарам на шляху дэградацыі асобы, у яе выступае жанчына. З сімпатыяй і замілаваннем апісвае яна воблік мужных і працавітых жанчын старэйшага пакалення, што вытрымалі на сваіх плячах цяжар вайны і акупацыі, працавалі за сябе і сваіх схварэлых душой і целам мужоў, гадуючы сваіх і чужых дзяцей (“Ад Бога”, “Пад акупацыяй”, “Ратунак”, “Смерць і Волька” і інш.). Расказваючы пра пакручастыя лёсы сённяшніх падбелавежскіх гаспадароў, неаднаразова падкрэслівае адсутнасць у іхніх старасвецкіх дамах жаночай рукі (“Моцны Янак”, “Ёзік”, “Горкая вада”). Насуперак афіцыйным дэмаграфічным паказчыкам, якія сведчаць, што і ў Польшчы, як у нас у Беларусі, колькасць жанчын перавышае колькасць мужчынаў, яна сцвярджае “Ой не, у нашых вёсках кажуць адваротнае”, і паказвае ў сваіх творах неблагіх вясковых хлопцаў, якім няма дзе знайсці гаспадыньку, якая б навяла парадак не толькі ў іхнім доме, але і ў іхнім бязладным жыцці.

Хто ведае, можа і праўда гэты жаночы погляд Міры Лукшы мае сваю рацыю? Можа, і праўда, што гэта ўсёдаравальная і ахвярная жаночая любоў і міласэрнасць, якія з’яўляюцца найбольш адметнай праявай спрадвечных асноў хрысціянскай маралі, — і ёсць адзіны шлях да ратавання сваёй чалавечай самасці не толькі ў нацыянальна-беларускім, але і ў агульначалавечым маштабе?..

# З м е с т


**1. АД БОГА**

Добрая Маруся **5**
Не мела баба... дзеда **7**
Вазьмі знайдзі ты тое шчасце **11**
Раман і Юля **14**
Пад акупацыяй **20**
Марысенько, не ўмірай **24**
Надзя з Пядзі **27**
Настуля **30**
На сваім **35**
Аўдосіна неба **38**
Ноч у Бельску **39**
Дом Паўліны **43**
Піліп у фасолі **49**
Ратунак **52**
Раман **55**
Марыя Кузьма **57**
Русалчын дом **60**
Старэнькія **68**
Свята **71**
Віктар, Нічыпар і Рэня **73**
Тры вёскі, тры палоскі **75**
Як Кастэнцік з Чортам за зямлю біліся **78**
Смерць і Волька **82**
Вёска **85**
Хата з краю **86**
Адпачывайце, бабо! **88**
Хата **90**
Сасанна **92**

**2. МОЦНЫ ЯНАК**

Яська з-пад бору **96**
Моцны Янак **100**
Ёзік **103**
Машка і Золька **105**
Панас **109**

Горкая вада **110**
На злосць павешуся! **113**
Цуд над Семяноўскім возерам **117**
Федзік **120**

### 3. НАШ ЧАЛАВЕК

Агледзіны **125**
Антон **129**
Як дзве бабе **133**
Блудная дачка **135**
Чалавечыя словы **138**
Найму хату добрым людзям **142**
Да апошняе крыві **146**
На Паторцы **150**
Скарб **154**
Стражнік старое сцежкі **158**
Спосаб на поспех у каханні **162**
Вырадак **166**
Босы Воўк і злодзей цноты **169**
Чорт у хаце **173**
Зязюльчыны слёзы **177**

**Галіна Тычка,** *Жаночы погляд Міры Лукшы* **181**

Хто ведае, можа і праўда гэты жаночы погляд Міры Лукшы мае сваю рацыю? Можа, і праўда, што гэта ўсёдаравальная і ахвярная жаночая любоў і міласэрнасць, якія з'яўляюцца найбольш адметнай праявай спрадвечных асноў хрысціянскай маралі, і ёсць адзіны шлях да ратавання сваёй чалавечай самасці не толькі ў нацыянальна-беларускім, але і ў агульначалавечым маштабе?..

**Галіна Тычка**

Беларускае Літаратурнае Аб'яднанне „Белавежа"

**ISBN 83-85918-30-2**

Міра Лукша • Бабскія гісторыі